Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Інстытут культуры Беларусі

# ЭКСПАЗІЦЫЯ Ў МУЗЕЙНАЙ ПРАСТОРЫ:
## праектны менеджмент

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Музейны сшытак

Мінск • 2012

УДК 069.5 : 005 (082)
ББК 79.17 я 73
Э 41

Укладанне і агульная рэдакцыя
начальнік аддзела навукова-метадычнага забеспячэння
развіцця музейнай дзейнасці ДУА «Інстытут культуры Беларусі»,
кандыдат філалагічных навук *І. Б. Лапцёнак*

Арганізацыйная калегія выдання:
намеснік начальніка ўпраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці
Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь *С. М. Гаўрылава*;
рэктар ДУА «Інстытут культуры Беларусі», кандыдат філалагічных навук *І. І. Крук*;
дырэктар установы «Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы» *А. Р. Ляшковіч*

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук, прафесар,
загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» *М. А. Бяспалая*;
кандыдат культуралогіі, дырэктар навукова-даследчай і асветніцкай установы культуры
«Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік» *Т. А. Джумантаева*

*Выданне падрыхтавана ў рамках*
*Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011—2015 гады*

*Выпуск выдання ажыццёўлены*
*па заказу і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь*

**Экспазіцыя** ў музейнай прасторы : праектны менеджмент (Музейны сшытак) / уклад.,
Э 41 агульн. рэд. І. Б. Лапцёнак. — Мінск : ДУА «Інстытут культуры Беларусі», 2012. — 100 с. : іл.

ISBN 978-985-7045-08-2.

Выданне прысвечана актуальным пытанням метадалогіі праектнай дзейнасці музея, функцыянальнага напаўнення музейнага маркетынгу і практычным аспектам іх увасаблення ў экспазіцыйнай практыцы; у ім разглядаюцца сістэмаўтваральныя асновы тэхналогіі распрацоўкі навуковага праекта на прыкладзе стварэння стацыянарнай экспазіцыі «Шляхі» Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.

Адрасавана спецыялістам у галіне музейнай справы, кіраўнікам і навуковым супрацоўнікам музеяў, выкладчыкам, студэнтам і аспірантам, слухачам курсаў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі па спецыяльнасці «Камунікацыі ў сферы музейнай дзейнасці».

ISBN 978-985-7045-08-2
© Лапцёнак І. Б., укладанне, 2012
© Афармленне. ДУА «Інстытут культуры Беларусі», 2012

# I. Асновы кіравання праектам[1]

## Метадалогія праектнай дзейнасці

Праектнае кіраванне называюць метадалогіяй менеджменту XXI стагоддзя, самым эфектыўным у свеце метадам кіравання зменамі, неад'емным кампанентам інавацыйных тэхналогій. Увядзенне праектнага менеджменту ў дзейнасць музея павінна аказаць станоўчы ўплыў на яго функцыянаванне як арганізацыйнай структуры, спрыяць аптымізацыі выкарыстання рэсурсаў, укараненню крэатыўных падыходаў, ствараць умовы для інвестыцыйнай прыцягальнасці музейных устаноў і прадуктаў іх дзейнасці. Азнаямленне з методыкай планавання, арганізацыйнага забеспячэння, агульнай сістэмай кіравання праектам неабходна таксама для пераасэнсавання музейнага вопыту, атрымання навыкаў каманднай работы, глыбіні аналізу існуючых праблем і выбару аптымальных спосабаў іх вырашэння на тэхналагічна іншым узроўні.

Тэхналогіі кіравання праектамі ўзніклі яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя і актыўна выкарыстоўваюцца больш за 30 год, на працягу якіх быў распрацаваны шэраг методык, прызначаных у дапамогу кіраўнікам праектаў[2]. У арганізацыях замежжа іх прымяненне стала неад'емнай часткай інстытуцыянальнай практыкі. У некаторых краінах метадалогія кіравання праектамі пакладзена ў аснову дзяржаўнай стратэгіі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны[3].

Праектная дзейнасць у сферы культуры — адносна маладая з'ява, якая атрымала распаўсюджанне ў сувязі з неабходнасцю змянення традыцыйнай схемы размеркавання фінансавых сродкаў, прыцягнення альтэрнатыўных крыніц, наладжвання партнёрскіх сувязей паміж дзяржаўнымі і прыватнымі структурамі.

---

[1] *У раздзеле змешчаны пралегамены ў праектны менеджмент — уводзіны, у якіх фармулююцца яго зыходныя паняцці з мэтай папярэдняга азнаямлення з імі. Упершыню пры дапамозе тэрміналагічнага апарату агульнай метадалогіі праектнай дзейнасці на аснове разгляду магчымасцей айчыннай музейнай практыкі робіцца спроба вызначэння статусу праектнага менеджменту ў музейнай дзейнасці (з акцэнтам на экспазіцыйна-выставачнай) — яго спецыфікі, праблемнага поля, актуальных аспектаў методыкі. Матэрыялы ўвайшлі ў змест лекцыйных курсаў, распрацаваных аўтарам у рамках праграм курсаў павышэння кваліфікацыі «Праектаванне і інтэрпрэтацыя музейных экспазіцый» (2011), «Пытанні музейнай камунікацыі» (2012), «Менеджмент і нарматыўна-прававое забеспячэнне дзейнасці музейных устаноў» (2012), аўтарскай праграмы дысцыпліны «Музейны менеджмент» (2011) па спецыяльнасці перападрыхтоўкі «Экскурсійна-масавая работа», зацверджаных Навукова-метадычным саветам ДУА «Інстытут культуры Беларусі»*.

[2] Сярод найбольш вядомых стандартаў у галіне метадалогіі кіравання праектамі — ISO 21500, ANSI PMBoK, P2M; з іх улікам на нацыянальнай глебе ў розных функцыянальных абласцях распрацоўваюцца свае стандарты, методыкі, праграмы і сістэмы кіравання.

[3] *Агранович, В. Б.* Проектный менеджмент в социальной сфере : учеб. пособие / В. Б. Агранович, А. П. Моисеева. — Томск : Изд-во ТПУ, 2008. — С. 28.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аб стварэнні праектаў сёння заяўляюць многія айчынныя музеі. Але іх змест і інструментарый не заўсёды адпавядаюць сэнсаваму напаўненню паняцця «праектная дзейнасць». Кіраванне праектам нярэдка зводзіцца да выканання такіх асобных працэдур, як стварэнне загаду аб рабочай групе і падрыхтоўка праектна-каштарыснай дакументацыі. Пытанні пакрокавай стратэгіі, фарміравання эфектыўнай каманды, кампетэнцый, матывацыі ўдзельнікаў, прыцягнення партнёраў часта застаюцца па-за ўвагай кіраўніка. Разам з тым, на думку экспертаў, «сучасная культурная палітыка — гэта *праектна-інавацыйнае дзеянне*, якое змяняе інстытуцыі, асяроддзе і свядомасць людзей», а перспектыўны праект становіцца надзейным грунтам для «адукацыі і павышэння кваліфікацыі, фарміравання новай генерацыі менеджараў, творцаў, гледачоў, мецэнатаў»[4]. [Тут і далей цытаты падаюцца ў перакладзе аўтара. — *І. Л.*]

Сярод існуючых праблем у сферы кіравання праектам вылучаюцца наступныя: недастатковае веданне базавых паняццяў, этапаў, інструментарыя праектнага менеджменту, адсутнасць рэгламентуючых дакументаў у данай сферы, нераспрацаванасць базы метадалагічнай падтрымкі культурных праектаў, стыхійнасць работы па іх арганізацыі і ўвасабленню, слабое асвятленне ў друку праблемных пытанняў кіраўнічых практык[5].

Інтуітыўнасць пры ажыццяўленні праектавання ў пэўнай ступені звязана і з мнагазначнасцю слова «праект». Даволі часта яго ўжываюць у значэнні «папярэдні тэкст, варыянт, версія» (пасля зацвярджэння ён перастае быць праектам). Распаўсюджана таксама іншае яго азначэнне — «камплект дакументаў, якія выкарыстоўваюцца пры стварэнні прадукту». Нярэдка ўжываецца слова «праект» і ў значэнні «задума (план)».

Нягледзячы на блізкасць вышэйпрыведзеных азначэнняў, ні адно з іх не адлюстроўвае адметнасць праектнай дзейнасці, у якой яно мае сваю спецыфіку. Праект прадугледжвае не выкананне асобных заданняў, а ажыццяўленне праектна-творчага дзеяння. Праектнае кіраванне праз рэалізацыю мэты і вырашэнне канкрэтных задач дазваляе акцэнтаваць увагу на вынік і кіраваць яго дасягненнем, не дазваляючы пераўтварыць развіццё ў працэс дзеля працэсу. І таму ў межах праектнай дзейнасці «праект» уяўляе «сукупнасць дзеянняў па выкананню пэўнай мэты ў рамках абмежаваных рэсурсаў у вызначаны тэрмін, накіраваных на дасягненне канкрэтных вынікаў»[6].

***Спецыфіка праекта*** выяўляецца ў яго ўнікальнасці, комплекснасці, непаўторнасці ўмоў стварэння, канкрэтнасці мэт, фіксаванасці этапаў і іх лагічнай паслядоўнасці, абмежаванасці рэсурсаў і адметнай арганізацыі.

*Унікальнасць* праекта выяўляецца ў спецыфіцы зместу, непаўторнасці формы, выкарыстанні наваций. Праект павінен выходзіць за межы традыцыйнасці, паўсядзённасці, аксіялагічнасці. Нездарма ў перакладзе з лацінскай мовы «projectus» — «кінуты наперад»: праект — стратэгічны рэсурс, скіраваны ў будучыню.

[4] *Зеленцова, Е.* Пермский проект // Музей и регион; отв. ред. А. В. Лебедев; сост. В. Ю. Дукельский. — М., 2011. — С. 75.

[5] *Гл.:* меркаванні дырэктараў у рубрыцы «Актуальнае інтэрв'ю з кіраўніком музея» ў выданні: Музеі Беларусі : Праблемы. Перспектывы. Інавацыі : Экспазіцыйна-выставачная дзейнасць / уклад., пер. з рус. мовы, агульн. рэд. І. Б. Лапцёнак. — Мінск : ДУА «Інстытут культуры Беларусі», 2012. — С. 9—26.

[6] Сярод іншых найбольш ужывальных — вызначэнні Інстытута кіравання праектамі (ЗША), Англійскай асацыяцыі праектных менеджараў (Вялікабрытанія), з «Кодэкса ведаў аб кіраванні праектамі» ў выданні : Агранович, В. Б. Проектный менеджмент в социальной сфере : учеб. пособие / В. Б. Агранович, А. П. Моисеева. — Томск : Изд-во ТПУ, 2008. — С. 13—14.





Праектная дзейнасць музея адрозніваецца сваёй спецыфікай: яе складнікі — яскравая творчая ідэя, крэатыўны патэнцыял, адметнасць камунікацый, музейных сродкаў і вобразаў.

Кожны праект накіраваны на дасягненне пэўнай *мэты*. Важна, каб яна адпавядала яго зместу і канчатковым вынікам. Праектны падыход канцэнтруе намаганні на SMART мэтах: Specific — канкрэтныя, Measurable — вымяральныя, Achievable — дасягальныя, Realistic — рэалістычныя, Time-bound — з вызначаным тэрмінам[7]. Рэалізуецца мэта з дапамогай пэўнай стратэгіі шляхам выканання канкрэтных задач. Яе выбар адбываецца з улікам музейнай місіі і пэўных стратэгічных напрамкаў. Так, стратэгія экспазіцыйнага праекта з'яўляецца часткай стратэгіі навукова-практычнага напрамку «экспазіцыйна-выставачная дзейнасць» музея, адметнасць і перспектывы якога адпавядаюць макрастратэгіі дзейнасці ўстановы і прыярытэтам развіцця функцыянальных абласцей музейнай сферы.

*Комплекснасць* праекта выяўляецца ў яго цэласнасці, уліку ўнутраных і знешніх фактараў, уплываючых на вынікі.

Праект адрозніваецца ад тыпавых арганізацыйных структур дзейнасці ўстановы сваёй *адметнай структурай*, спецыяльна створанай на перыяд яго распрацоўкі і рэалізацыі.

Для ажыццяўлення праекта фарміруецца каманда, у якую ўключаюцца супрацоўнікі з розных аддзелаў арганізацыі, выбранай Заказчыкам для выканання праекта, запрашаюцца на ўмовах дагавораў спецыялісты з іншых устаноў (акрамя мастака, гэта можа быць псіхолаг, маркетолаг, праграміст і інш.). Службовыя абавязкі і функцыянальныя ролі ўдзельнікаў праекта не абавязкова павінны супадаць. Падчас распрацоўкі канцэпцыі экспазіцыі ў аўтарскую групу могуць уваходзіць спецыялісты навукова-фондавага і культурна-адукацыйнага аддзелаў (нягледзячы на тое, што стварэнне экспазіцыі не адносіцца да іх прамых абавязкаў). Супрацоўнікам музея як удзельнікам праекта можа быць даручана таксама работа з прэсай, арганізацыя маркетынгавых даследаванняў, правядзенне прэзентацыйных праграм і іншыя функцыі асобных структур і адзінак, якія адсутнічаюць у штатным раскладзе музея.

Вопыт музейнай работы сведчыць аб тым, што нярэдка крэатыўны патэнцыял членаў праектнай каманды аказваецца шырэй за рамкі кантрактных абавязкаў. Яго выкарыстанне садзейнічае ўкараненню нестандартных падыходаў і нетрадыцыйных рашэнняў, з'яўляецца дадатковым фактарам эфектыўнасці праектнай дзейнасці.

У адпаведнасці з формай траістай абмежаванасці праект распрацоўваецца з улікам *абмежаванняў* кошту, часу і зместу. Абмежаванні заснаваны на фіксацыі пачатку і заканчэння праекта, яго этапаў і фінансавых сродкаў. Усе абмежаванні ўзаемазалежныя: змяненні ў змесце могуць выклікаць змены ў тэрмінах і кошце, сціслыя тэрміны ўплываюць на павелічэнне кошту і змены ў змесце і інш. Для таго, каб стварыць праект у межах вызначаных абмежаванняў, неабходна распрацаваць адпаведную дакументацыю і кіравацца ёю. Пры стварэнні экспазіцыі яны ўлічваюцца ў каляндарным плане (з указаннем дакладных тэрмінаў распрацоўкі і ўвасаблення), плане фінансавання

[7] *Лебедева, Н.* Правила постановки целей / Н. Лебедева // Институт проблем предпринимательства [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://www.ippnou.ru/print/000873/. — Дата доступа : 14.11.2012.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праекта (з пазначэннем крыніц паступлення, артыкулаў бюджэту, тэрмінаў засваення, выдаткаў і даходаў), канцэпцыі (адметнасць зместу).

Як правіла, мэта і абмежаванні праекта ўваходзяць у абавязковы спектр пытанняў, якія фармулююцца і кантралююцца Заказчыкам. Выканаўца рэалізуе праект згодна з зацверджаным планам і нясе адказнасць за карыснасць вынікаў праекта для Заказчыка. Паміж Заказчыкам і Выканаўцам складаецца дагавор аб выкананні праекта. Для ўнутраных праектаў, якія фінансуюцца з розных крыніц, раздзяленне роляў таксама выкарыстоўваецца — найперш для павышэння эфектыўнасці канкрэтных відаў работ і вызначэння зон адказнасці падчас прыёмкі вынікаў праекта.

Паняцце **жыццёвага цыкла праекта** з’яўляецца базавым пры фарміраванні логікі праектнай дзейнасці.

Сярод распаўсюджаных варыянтаў арганізацыйнага падзелу праекта — дзяленне на 4 фазы: ініцыяцыя, планаванне, рэалізацыя і завяршэнне[8].

На фазе ініцыяцыі вызначаюцца ідэя і мэта, пачынаецца распрацоўка канцэпцыі праекта. Фаза планавання дэталізуе, якім чынам будзе адбывацца ўвасабленне палажэнняў канцэпцыі. На фазе рэалізацыі ствараецца прадукт. На фазе завяршэння праводзіцца аналіз яго адпаведнасці вызначаным патрабаванням. У метадалогію праектнай дзейнасці ўключаны таксама кампаненты праекта, якія складаюцца з арганізацыі праекта, кантролю і кіравання зменамі. Іншыя працэдуры (кіраванне камандай, дагаворнымі абавязкамі і інш.) вынесены за рамкі метадалогіі і называюцца інструментарыем менеджара праекта.

У значнай ступені паспяховасць праекта залежыць ад працэсаў, якія адбываюцца на фазе ***ініцыяцыі***. На дадзеным этапе дакументуюцца зыходныя дапушчэнні і абмежаванні, фіксуюцца ідэя, назва праекта, прычыны ініцыяцыі, тэрміны, Заказчык і Выканаўца, куратар і кіраўнік, ствараецца першапачатковае апісанне зместу і рэсурсаў, якія плануецца ўкласці ў праект[9].

Пры падрыхтоўцы любога праекта ствараецца канцэпцыя (ад лац. conceptio — сістэма), якая з’яўляецца асноўным дакументам, на аснове якога прымаецца рашэнне аб стварэнні праекта.

У канцэпцыі знаходзяць адлюстраванне: назва праекта; мэты і задачы; абгрунтаванне карыснасці; асноўныя ўдзельнікі і зацікаўленыя бакі; рэсурсы; тэрміны; рызыкі; крытэрыі прыёмкі; вынікі і іншыя важныя аспекты планавання (кадравы патэнцыял, патрабаванні да кваліфікацыі персаналу, расходныя матэрыялы і інш.).

Канцэпцыя праекта адлюстроўвае палажэнні, у якіх выяўляецца агульнае бачанне спецыфікі праекта, яго тэматыкі, логікі пабудовы, арганізацыйных аспектаў і фінансавання. Больш глыбокі, падрабязны і дэталізаваны разгляд актуальнасці і змястоўнага напаўнення праекта — у навуковай дакументацыі; у адносінах да экспазіцыйнага праекта гэта навуковая канцэпцыя экспазіцыі.

[8] *Гл.:* Логіка і змест працэсаў жыццёвага цыкла праекта згодна схеме амерыканскага Інстытута кіравання праектамі ў выданні : Агранович, В. Б. Проектный менеджмент в социальной сфере : учеб. пособие / В. Б. Агранович, А. П. Моисеева. — Томск : Изд-во ТПУ, 2008. — С. 28.

[9] Проектный менеджмент. Требования к управлению проектом. — М. : Стандартинформ, 2011. — С. 4.

***Планаванне*** праводзіцца, як правіла, падчас распрацоўкі праекта. Аднак па меры яго ажыццяўлення адбываюцца пэўныя змяненні і дапаўненні канцэпцыі, што выклікае неабходнасць у карэкціроўцы плана. У сувязі з гэтым планаванне вядуць на працягу ўсяго тэрміна праекта. Напачатку жыццёвага цыкла распрацоўваецца папярэдні план: у ім у агульных рысах вызначаецца, што неабходна выканаць для таго, каб рэалізаваць праект. Разгорнутае і дэталёвае планаванне праводзяць пасля прыняцця рашэння аб рэалізацыі праекта. Усе змяненні і дапаўненні, якія адбываюцца на працягу жыццёвага цыкла праекта, абавязкова фіксуюцца і ўзгадняюцца: удзельнікі праекта павінны быць тэрмінова азнаёмлены з імі.

План кіравання праектам — дакумент, з якога пачынаецца ажыццяўленне канцэпцыі праекта. У ім адлюстроўваюцца наступныя пазіцыі: этапы рэалізацыі праекта, віды работ і выканаўцы, ключавыя кропкі (вехі), расклад (каляндарны план), бюджэт праекта, закупкі і інш.

На этапе распрацоўкі раскладу рыхтуецца план-графік работ з указанымі часавымі фазамі і асноўнымі мерапрыемствамі.

Падчас планавання бюджэту трэба вызначыць парадак і аб’ём забеспячэння праекта фінансавымі рэсурсамі, структуру артыкулаў бюджэту, планавы кошт рэсурсаў.

Пры фарміраванні плана закупак увага звяртаецца на парадак і аб’ём забеспячэння праекта прадукцыяй і паслугамі іншых арганізацый, фармулююцца патрабаванні да закупаемай прадукцыі, праводзяцца мерапрыемствы па яе выбару і ацэнцы.

Працэс планавання кадравага патэнцыялу прадугледжвае дакументаванне роляў удзельнікаў праекта, іх функцый, паўнамоцтваў, колькаснага і кваліфікацыйнага складу каманды праекта, патрабаванняў да ўмоў працы.

Абмен інфармацыяй таксама павінен быць запланаваны: трэба загадзя выявіць усіх удзельнікаў праекта, зацікаўленых у атрыманні пэўнай інфармацыі, вызначыць працэдуры ўзгаднення і зацвярджэння праектных дакументаў, формы і каналы распаўсюджання інфармацыі.

У кожным пакеце работ павінен быць вызначаны вынік на выхадзе. Работы і ацэнкі праекта ўзгадняюцца з вядучымі ўдзельнікамі каманды, кіраўніцтвам арганізацыі і пры неабходнасці з Заказчыкам (пры заключэнні дагавораў падраду). Члены каманды прымаюць на сябе абавязкі па рэалізацыі праекта, а кіраўніцтва — па забеспячэнню праекта неабходнымі рэсурсамі.

Калі работы не звязаны паміж сабой, то іх можна пачынаць і завяршаць у любы час. Аднак практыка сведчыць, што паміж канкрэтнымі відамі работ часта існуюць пэўныя залежнасці. У выпадку з праектаваннем экспазіцыі спачатку распрацоўваецца навуковая канцэпцыя экспазіцыі, пасля тэматычная структура, потым тэматыка-экспазіцыйны план. Кожны з этапаў праектавання павінен быць абмеркаваны: некаторыя пазіцыі пераглядаюцца. На аснове выпрацаванага і зацверджанага варыянта афармляецца далейшая дакументацыя.

Спецыфіка экспазіцыйнага праекта музея ў тым, што падчас яго ажыццяўлення паміж творчымі відамі работ адсутнічаюць жорсткія межы паўнамоцтваў. Так, падключэнне мастака на стадыі распрацоўкі навуковай канцэпцыі і тэматычнай структуры не перашкаджае, а, наадварот, спрыяе эфектыўнасці вынікаў праекта. Азнаямленне з матэрыяламі

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музейных фондаў, адбор музейных прадметаў для экспанавання, вылучэнне дамінанты ў экспазіцыйным паказе, выбар метадаў і прыёмаў музейнай прэзентацыі праводзіцца не толькі аўтарамі навуковага, але і мастацкага праекта. Мантаж экспазіцыі — таксама супольная праца экспазіцыянераў і мастакоў.

Завяршаецца фаза планавання стварэннем комплекснага дакумента — бізнес-плана праекта. У ім адлюстроўваюцца наступныя пазіцыі: канцэпцыя праекта, ацэнка рынку, аналіз канкурэнтнага асяроддзя, SWOT- і PEST-аналіз, план маркетынгу, фінансавы план, арганізацыйныя рэсурсы і інш.

Пры распрацоўцы праектаў вытворчага блока бізнес-план з'яўляецца вядучым дакументам, які рэгулюе пытанні даходнасці прадпрыемства, яго камерцыйнай выгады і інш. Музей з'яўляецца некамерцыйнай установай, тым не менш, фінансавая прыцягальнасць праекта, пошук пазабюджэтных сродкаў, фандрайзінг, работа са спонсарамі, распрацоўка і прадастаўленне платных паслуг уваходзяць у спектр актуальных аспектаў сучаснай музейнай практыкі. У некаторых замежных установах бізнес-план пастуова становіцца часткай музейнага жыцця.

***Рэалізацыя*** праекта пачынаецца пасля завяршэння планавай дакументацыі. Асноўная задача менеджара на гэтай стадыі — нагляд за ходам ажыццяўлення праекта, аналіз адхіленняў ад плана, выпрацоўка рашэнняў пры ўзнікненні праблем.

На практыцы не заўсёды ўвага кіраўніка скіравана на рэгулярнасць правядзення кантрольных вымярэнняў. Нярэдка кантроль пачынаецца ў час, калі сітуацыя становіцца крытычнай. Не спрыяе паспяховасці праекта маруднасць прыняцця рашэнняў: у выніку каманда губляе вызначаны тэмп, страчвае крэатыўнасць, выходзіць за межы графіка. Усё гэта не можа не ўплываць на якасць канчатковага прадукту.

***На заключнай фазе*** праекта праводзіцца шэраг завяршаючых мерапрыемстваў: адбываецца праверка адпаведнасці працэсаў і прадукту праекта ўстаноўленым патрабаванням, рыхтуецца справаздача, выконваюцца прыёма-здатачныя работы, праводзіцца інвентарызацыя, канчатковыя разлікі, дакументуюцца вынікі, афармляецца архіў праекта, рэалізуецца план матывацыі ўдзельнікаў праектнай каманды.

У выніковай справаздачы адлюстроўваецца наступная інфармацыя: дасягненне мэты і задач праекта, фактычныя тэрміны, выдаткі, праблемы і спосабы іх рашэння, вынікі, прапановы па арганізацыі падобных праектаў у будучым.

Комплексная дакументацыя галоўных аспектаў планавання з улікам рэалізацыі пазначаецца ў картцы праекта (*гл. с. 31—34*). Лаканічная форма дакумента дазваляе ў сціслым выглядзе даць апісанне праекта, якое можа быць выкарыстана пры распрацоўцы новых праектаў, правядзенні аналізу праектнай дзейнасці, далейшай расстаноўцы кадраў і інш.

У ***арганізацыйную структуру*** праекта ўваходзіць размеркаванне роляў і абавязкаў асноўных удзельнікаў праекта[10]. У залежнасці ад маштабу праекта адну і тую ж ролю могуць выконваць некалькі чалавек. Чым менш праект, тым больш роляў прыходзіцца на аднаго выканаўца.

Праектная група складаецца з наступных удзельнікаў:

1. Кіраўнік праекта. Адказвае за дасягненне мэт праекта, ажыццяўляе кіраванне праектам і рэсурсамі.

[10] *Гл.:* падрабязней аб ролевай структуры праекта ў выданні : Проектный менеджмент. Требования к управлению проектом. — М. : Стандартинформ, 2011. — С. 3.

2. Куратар праекта. Займаецца ацэнкай планаў і ходу рэалізацыі праекта, вылучэннем неабходных рэсурсаў.

3. Група па распрацоўцы праекта. Выконвае асноўныя функцыі, звязаныя з праектаваннем. У яе ўваходзяць аўтары экспазіцыйнага праекта, дадатковых праграм, архітэктар праекта (аўтар мастацкага рашэння).

4. Вытворчая група па ажыццяўленню праекта, стварэнню канчатковага прадукту. Займаецца тэхнічнай рэалізацыяй праекта.

Арганізацыйная структура пачынае фарміравацца на стадыі планавання і можа змяняцца ў ходзе распрацоўкі і рэалізацыі праекта. У той жа час, яе нестабільнасць, у прыватнасці, частая змена выканаўцаў, можа стаць праблемай для музея: замена спецыяліста суправаджаецца незапланаваным часам яго ўваходжання ў кантэкст праекта.

Асаблівую складанасць яна набывае пры стварэнні праекта асноўнай экспазіцыі, калі правядзенне даследавання, напрацоўка матэрыялаў праводзяцца аўтарамі працяглы час. З мэтай недапушчэння зрыву тэрмінаў здачы экспазіцыі кіраўнік павінен мець эфектыўны план матывацыі членаў каманды, выразную сістэму размеркавання функцыянальных абавязкаў і паэтапнай справаздачнасці.

Даволі часта кіраўнік праекта асацыіруецца з адміністратарам. На самой справе яго функцыі значна шырэй. Кіраўнік павінен мець як агульнапрафесійныя, так і спецыяльныя веды па праблематыцы праекта, з веданнем справы прадстаўляць і прэзентаваць яго — разумець стратэгію праекта, імкнуцца да дасягнення вызначаных мэт і эфектыўнасці вынікаў, спалучаць кіраўніцтва і лідарства, умець ствараць творчую атмасферу. У функцыянальныя абавязкі кіраўніка ўваходзіць таксама забеспячэнне прадуктыўнасці работы кожнага з членаў каманды і кіраванне эфектыўнасцю працэсу іх узаемадзеяння, паколькі «крэатыўны патэнцыял супрацоўнікаў — гэта сінергетычны эфект чалавечага рэсурсу і арганізацыйна-эканамічнага механізма арганізацыі»[11].

Да ўдзельнікаў праекта прад'яўляюцца наступныя патрабаванні: прафесійная кампетэнтнасць, наяўнасць часу для работы ў праекце, здольнасць працаваць у камандзе. Асноўныя правілы сумеснай дзейнасці: уважліва слухаць калег, выказваць свае меркаванні, прызнаваць пазіцыі іншых, адкрыта абмяркоўваць канфлікты, супольна прымаць рашэнні.

Пры стварэнні каманды важнай з'яўляецца агульная зацікаўленасць у рэалізацыі праекта, зладжанасць і згуртаванасць калектыву: «праектныя менеджары могуць дзейнічаць рашуча і працаваць эфектыўна, але ўсё, што яны робяць, залежыць ад зладжанасці каманды»[12].

Праектны менеджмент заснаваны на прымяненні ўніверсальных тэхналогій, якія могуць выкарыстоўвацца ў розных абласцях музейнай дзейнасці з улікам спецыфікі праектнай работы і функцыянальнага напрамку, да якога яна адносіцца.

[11] *Драгомирецкая, Н. М.* Механизм креативного и проектного менеджмента / Н. М. Драгомирецкая, Е. С. Кандагура // Проблемы управления. — 2009. — № 2 (31). — С. 85—86.

[12] Учение в течение всей жизни в музеях. Европейский опыт / под ред. Кирстен Гиббс, Маргариты Сани, Джейн Томпсон; пер. с англ. Е. Петровой. — Тула : ОАО ИПО «Лев Толстой», 2010. — С. 45.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У ***сістэму экспазіцыйнага праектавання*** акрамя кіравання і маркетынгу ўваходзяць экспазіцыйная работа і адукацыйная дзейнасць.

Напрамак кіравання і маркетынгу вызначае ўсе найбольш значныя пытанні стратэгіі праекта, яго арганізацыі, рэгулявання і кантролю за працэсамі планавання, ажыццяўлення і прасоўвання (*гл. с. 3—8*).

Напрамак адукацыйнай дзейнасці ўключае ў сябе стварэнне спецыяльных праграм у прасторы музейнай экспазіцыі, заснаваных на выкарыстанні яе вобразаў і экспанатаў.

Экспазіцыйная работа будуецца на шырокім спектры дзейнасці — ад распрацоўкі канцэптуальных падыходаў да мантажу экспазіцыі; складаецца з навуковага, мастацкага і тэхнарабочага праектавання.

*Навуковае праектаванне* ўключае ў сябе падрыхтоўку:

1. Навуковай канцэпцыі.

2. Тэматычнай структуры.

3. Тэматыка-экспазіцыйнага плана (ТЭП).

4. Сцэнарыя.

У навуковай канцэпцыі падрабязна раскрываецца ідэя, мэты, задачы, змест экспазіцыі, вызначаецца праблематыка, спецыфіка крыніцазнаўчай базы, даецца абгрунтаванне агульных асаблівасцей тэматычнай структуры, характарыстыка экспазіцыйнай плошчы, вылучаецца адметнасць данай экспазіцыі сярод экспазіцый агульнапрофільных музеяў, фармулююцца патрабаванні да архітэктурна-мастацкага праекта, напрамкі работы па праектаванню, спосабы інфармацыйнага забеспячэння, змяшчаецца бібліяграфія. Навуковая канцэпцыя заснавана на выніках даследаванняў профільнай навукі, самастойных даследаванняў музея, дасягненнях музеязнаўства і музейнай практыкі, аналізе фондаў музея, вывучэнні музейнай аўдыторыі, магчымасцях экспазіцыйнай прасторы і інш.

У пашыранай тэматычнай структуры адзначаюцца раздзелы экспазіцыі, тэмы і падтэмы (з указаннем назваў, разгорнутым зместам і інш.), вылучаюцца вядучыя экспанаты, экспазіцыйныя комплексы (па залах).

У тэматыка-экспазіцыйным плане ў адпаведнасці з паслядоўнасцю, вызначанай у пашыранай тэматычнай структуры, знаходзяць адлюстраванне ў графічным выглядзе звесткі аб характары экспазіцыйных матэрыялаў, іх памерах, месцы захоўвання і шыфрах, паслядоўнасці размяшчэння, вядучымі тэкстамі, канкрэтнымі прапановамі па мастацкім афармленні. У дадатку да ТЭП уключаюцца: дакументацыя па вырабу копій і муляжоў музейных прадметаў і навукова-дапаможных матэрыялаў, па стварэнню навуковых рэканструкцый; анатацыі і этыкетаж.

На аснове дакументацыі навуковага праекта з мэтай павышэння эфектыўнасці музейнай камунікацыі распрацоўваецца сцэнарый, які мадэліруе ўспрыняцце наведвальнікам будучай экспазіцыі. У ім пазначаюцца адметнасць інтэрпрэтацыі тэмы, асноўныя сюжэтныя лініі, галоўныя элементы дынамікі экспазіцыйнага дзеяння, апісваецца функцыянаванне экспазіцыі з улікам магчымых паводзін наведвальнікаў. Пры ўключэнні ў сістэму экспазіцыі электронных комплексаў (мультымедыйных сістэм, аўдыягідаў, інфакіёскаў, музычнага суправаджэння і інш.) на кожны з гэтых элементаў распрацоўваецца асобны сцэнарый.

*Мастацкае праектаванне* складаецца з падрыхтоўкі генеральнага рашэння экспазіцыі (у выглядзе макета, чарцяжоў, з дадаткамі ў форме паясняльных матэрыялаў да мастацкай канцэпцыі), стварэння эскізнага праекта (з планам экспазіцыі, разгорткай экспазіцыйных паверхняў, размяшчэннем экспазіцыйных комплексаў, экспанатаў, абсталявання, аўдыявізуальных і тэхнічных сродкаў, асвятлення).

Падчас *тэхнарабочага праектавання* фіксуецца дакладнае месца кожнага экспаната, тэксту і тэхнічных сродкаў. Тэхнарабочы праект складаецца з мантажных лістоў, распрацовак абсталявання, крапяжу, асвятлення, вентыляцыі, пажарна-ахоўнай сігналізацыі і інш.

Стварэнне музейнай экспазіцыі — складаны працэс, у якім прымаюць удзел навуковыя супрацоўнікі экспазіцыйнага аддзела, мастакі (ці дызайнеры), музейныя педагогі, тэхнічныя службы; могуць быць задзейнічаны даследчыкі навуковых цэнтраў, эксперты з іншых музеяў, сацыёлагі, маркетолагі, псіхолагі, рэжысёры, праграмісты і інш. Практыка паказвае, што эфектыўнасць музейнай экспазіцыі ў значнай ступені залежыць ад зладжанасці работы аўтараў навуковага і мастацкага праектаў, пачынаючы ад стварэння канцэпцыі да ўнясення ўдакладненняў на этапе тэхнарабочага праектавання і мантажу, ажыццяўлення кантролю за ходам работ.

Падчас падрыхтоўкі мастацкага рашэння экспазіцыі ў практыцы замежных музеяў і апошніх праектаў беларускіх музеяў выкарыстоўваецца электроннае мадэляванне, якое дазваляе ўбачыць розныя варыянты яе ўвасаблення ў трохмернай мадэлі — у колеры, прапорцыях і аб'ёме. Электроннае мадэляванне скарачае час на распрацоўку праекта і тым самым садзейнічае паскарэнню тэрмінаў яго здачы, адначасова спрыяючы паляпшэнню якасці.

Нягледзячы на разгалінаваную сістэму дакладна вызначаных падыходаў, прынцыпаў і метадаў праектнай дзейнасці, стварэнне музейнай экспазіцыі з'яўляецца найперш творчым працэсам. Важнае значэнне мае яго змястоўнае напаўненне, канцэптуальнасць, знакава-сімвалічная насычанасць, камунікацыйная адметнасць, структурная цэласнасць, своеасаблівасць мастацкіх сродкаў, спецыфіка выяўлення тэхналагічных магчымасцей, гарманічнасць і эстэтыка.

Праектная дзейнасць дазваляе адносіцца да распрацоўкі музейнага праекта як да шматступеньчатага, структурна пабудаванага працэсу, які здольны апеліраваць да культурнай памяці розных эпох, адметна прэзентаваць нацыянальную спадчыну, ажыццяўляць творчае развіццё і адукацыю асобы музейнымі сродкамі на аснове сучасных ідэй і тэхналогій. Сусветная практыка сведчыць, што з цягам часу «музейнае праектаванне становіцца складаным інтэграваным працэсам, які патрабуе кансалідаваных намаганняў каманды прафесіяналаў, а рэалізацыя музейнага праекта — тэхналагічным ланцужком, які спалучае нетыражыраваны крэатыў з трансферам тэхналогій»[13].

[13] Музейное проектирование : сб. ст. // Российский институт культурологии; отв. ред. А. А. Щербакова; сост. А. В. Лебедев. — М., 2009. — С. 9.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУИР

# Стратэгія выставачнага праекта і маркетынгавыя камунікацыі

Выставачная дзейнасць з'яўляецца адным з асноўных і найбольш прадуктыўных каналаў музейнай камунікацыі і рэалізацыі музейнай палітыкі. Выставы павышаюць даступнасць музейных фондаў, уводзяць у навуковы і агульнакультурны абарот каштоўнасці прыватных збораў, пашыраюць змест і геаграфію музейнай прэзентацыі. Трансляцыя гістарычных і культурных сэнсаў адбываецца праз інтэрпрэтацыю музейных тэкстаў і вобразаў, якія змяняюцца ў залежнасці ад сацыякультурнай сітуацыі і канкрэтных форм камунікацыі. У выніку «музейная выстава пераходзіць межы экспанавання і, арганічна спалучаючы канцэптуальныя ідэі, мастацкія інавацыі, сацыяльна-значныя акцыі, адукацыйныя і забаўляльныя мерапрыемствы, паўстае як сацыякультурны праект»[1].

Стратэгія выставачнага праекта будуецца з дапамогай інструментарыя музейнага маркетынгу, які арыентаваны на:

- вызначэнне сегментаў рынку і ўзаемадзеянне з імі;
- стварэнне разгалінаванай сістэмы музейных камунікацый;
- рост даходаў, звязаных з наведваннем, абслугоўваннем наведвальнікаў, увядзеннем інавацыйных форм і метадаў работы[2].

Маркетынгавае даследаванне гэта аналітычны працэс, у ходзе якога адбываецца збор і абагульненне інфармацыі, выпрацоўка рэкамендацый па развіццю праекта.

Вылучаюць некалькі відаў маркетынгавых даследаванняў:

- па спосабу збору інфармацыі: кабінетныя і палявыя;
- па мэце: пошукавыя, апісальныя, аналітычныя;
- па характару інфармацыі: колькасныя і якасныя.

Падчас збору першаснай інфармацыі прымяняюць розныя метады: назіранне, эксперымент, імітацыя, апытанне.

На сучасным этапе назіраецца значная актывізацыя ў вывучэнні сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва з мэтай прыцягнення больш шырокіх слаёў грамадства. У апошнія гады такія даследаванні ініцыіруюцца буйнейшымі музеямі: да іх адносяцца Музеі Маскоўскага Крамля (2009), Дзяржаўны музей выяўленчага мастацтва імя А. С. Пушкіна (2010), Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь (2011—2012) і інш.

Некаторыя музеі праводзяць шырокія даследаванні музейнай аўдыторыі з удзелам знешніх спецыялістаў. У вядучых музеях замежжа створаны аддзелы маркетынгу. Шэраг некаторых іншых музеяў, у тым ліку і беларускіх, маюць у сваім штаце супрацоўнікаў, адказных за маркетынгавую дзейнасць. Разам з тым, нават і пры адсутнасці ў штаце адпаведнага спецыяліста музеі павінны займацца вывучэннем аўдыторыі: на сённяшні дзень існуюць распрацаваныя методыкі іх арганізацыі на базе канкрэтных устаноў[3].

Пабудова стратэгіі выставачнага маркетынгу праводзіцца паэтапна.

*Этап 1. Фарміраванне агульнай стратэгіі.*

Адбываецца збор, сістэматызацыя і аналіз інфармацыі, звязанай з вывучэннем музейнай аўдыторыі.

*Этап 2. Развіццё функцыянальных напрамкаў стратэгіі.*

Вызначаецца рэкламная стратэгія для кожнай групы музейнай аўдыторыі; праводзіцца пошук стратэгічных партнёраў; распрацоўваюцца эмблема, стыль афармлення паліграфічнай прадукцыі; рыхтуюцца інфармацыйныя і рэкламныя матэрыялы для прэсы.

*Этап 3. Запуск рэкламнай кампаніі*[4].

Распаўсюджваюцца матэрыялы, падрыхтаваныя для СМІ, ажыццяўляецца выраб паліграфічнай і сувенірнай прадукцыі.

*Этап 4. Актыўнае пазіцыянаванне праекта.*

Пры набліжэнні да адкрыцця — этап «агрэсіўнай» рэкламы. Падрыхтоўка прэс-рэлізаў, арганізацыя і правядзенне прэс-канферэнцый і спецмерапрыемстваў (звязаных з іміджмейкінгам), рассылка запрашальных білетаў, флаераў і інш.

*Этап 5. Прасоўванне праекта.*

Падтрымка праекта на працягу перыяду работы выставы: падрыхтоўка спецыяльных рэпартажаў, артыкулаў у СМІ, арганізацыя інтэрв'ю з удзельнікамі, партнёрамі і аўтарамі праекта, стымуляванне работы праекта праз прэзентацыю дадатковых праграм. Пасля завяршэння работы выставы праводзіцца аналіз рэкламнай кампаніі, падводзяцца вынікі.

Дэталёвае вызначэнне мерапрыемстваў музейнага маркетынгу пазначаецца ў маркетынгавым плане, які ўключае апісанне набору інструментаў, якія выкарыстоўваюцца музеем для рашэння маркетынгавых задач. У ім знаходзяць адлюстраванне мэты і задачы выставачнага маркетынгу, даследаванне аўдыторыі, фарміраванне цэнавай палітыкі, ход рэкламнай кампаніі і інш. Пры планаванні за арганізацыйнымі мерапрыемствамі замацоўваецца персанал — асноўны, дадатковы, іншых устаноў, валанцёры.

*Вывучэнне музейнай аўдыторыі* — адзін з першых крокаў, які павінен быць зроблены на пачатковым этапе. Сучасны музейны маркетынг выкарыстоўвае стратэгіі макра- і мікрасегментацыі аўдыторыі і скіраваны на аналіз спажывецкага рынку з мэтай выяўлення запыту і пазіцыянавання паслуг. Аналіз сацыялагічных даследаванняў і статыстычных аглядаў па выставах дапамагаюць стварыць «*профіль наведвальніка*» выставы, які ўплывае на ход далейшай рэкламнай кампаніі.

У адпаведнасці з данымі сацыялагічнага даследавання розных груп насельніцтва[5], наведванне выстаў і экспазіцый застаецца лідзіруючай формай камунікацыі, якой аддае перавагу патэнцыяльны наведвальнік. Традыцыйнай формай выступае групавая экскурсія. Разам з тым, чаканні многіх рэспандэнтаў звязаны з наведваннем выстаў без

[1] *Гл.*: *Коробова, И. В.* Системообразующие основы технологии выставочной деятельности музеев как фактора формирования социально-культурной среды региона : автореф. дис. … канд. пед. наук / И. В. Коробова; Алтайская гос. ак-мия культуры и искусств. — Барнаул, 2006. — С. 3.

[2] *Гл.*: *Лысикова, Н. П.* Имидж музея : социокультурный аспект / Н. П. Лысикова // Музей и его аудитория. Маркетинговая стратегия : сб. тр. творческой лаборатории «Музейнай педагогика» каф. музейного дела; сост. И. М. Коссова; АПРИКТ. — М. : ИКАР, 2006. — Вып. 7. — С. 205.

[3] *Гл.*: *Шубина, О. А.* Маркетинговое исследование своими силами / О. А. Шубина, П. В. Назаров // Справочник руководителя учреждений культуры. — 2012. — № 12. — С. 81—98.

[4] *Гл.*: падрабязней методыку правядзення рэкламнай кампаніі ў выданні : *Синтин, М. В.* Рекламные стратегии в музее / М. В. Синтин // Музей и его аудитория. Маркетинговая стратегия : сб. тр. творческой лаборатории «Музейнай педагогика» каф. музейного дела; сост. И. М. Коссова; АПРИКТ. — М. : ИКАР, 2006. — Вып. 7. — С. 161—163.

[5] Материалы социологического исследования «Изучить потребительские предпочтения различных социально-демографических групп населения Республики Беларусь на рынке культурных продуктов и услуг» / науч. руководитель И. В. Котляров // Институт социологии Национальной академии наук Беларуси, по заказу Министерства культуры Республики Беларусь. — Минск, 2012. *(Даследаванне праводзілася з удзелам аўтара. — І. Л.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звычайнага экскурсійнага суправаджэння, але з інтэрактыўнымі формамі абслугоўвання. Значную частку рэспандэнтаў цікавіць наведванне экспазіцыі, у якой прымяняюцца новыя тэхнічныя сродкі: электронныя комплексы, аўдыягіды, інфакіёскі і інш. Аналіз паказвае, што прыцягальнай формай патэнцыяльны спажывец музейных паслуг лічыць віртуальную экскурсію на музейным сайце (прычым, у некаторых рэгіёнах яна нават больш запатрабаваная, чым у сталіцы). У агульным падліку высокі мастацкі ўзровень афармлення выставы і наяўнасць на ёй унікальных прадметаў занялі самы высокі рэйтынг. Аналіз даных сацыялагічнага апытання мінчан і рэгіёнаў звяртае ўвагу на неабходнасць больш шырокага рэкламна-інфармацыйнага суправаджэння выстаў.

Пошук «свайго» наведвальніка і пабудова адметнай стратэгіі развіцця праекта немагчыма без уліку *канкурэнтнага асяроддзя* — важнейшага фактару, які ўважліва аналізуецца падчас запуску выставачнага праекта; ён мае непасрэдныя адносіны да прыцягнення аўдыторыі. Пласт работы, звязанай з вывучэннем канкурэнтнага асяроддзя, даволі шырокі:

- аналіз колькасных і якасных паказчыкаў рэалізаваных праектаў;
- выяўленне колькасці наведвальнікаў;
- вызначэнне ўзроўню коштаў і выдаткаў;
- профіль наведвальніка;
- адметнасць прэзентацыйнай праграмы;
- наяўнасць дадатковых праграм;
- асаблівасці рэкламнай і PR-кампаніі.

Падчас абагульнення вынікаў і выпрацоўкі стратэгіі неабходна вывучыць асноўныя падыходы канкурэнтаў да працы з грамадскасцю, тэмы «вакол» выставы, якія могуць быць уключаны ў яе інфармацыйнае поле, трэба «знайсці сваю нішу», прапанаваць «тыя прадукты і паслугі, на якія не здольны канкурэнты альбо стаць іх партнёрамі, зацікавіць сваімі магчымасцямі і аб'яднаць намаганні ў барацьбе за кліентаў»[6].

Сёння з мэтай прыцягнення аўдыторыі і пашырэння партнёрскага супрацоўніцтва ў музейнай сферы адбываецца *працэс рэсурснай інтэграцыі*, стварэння новых арганізацыйных структур — музейных холдынгаў, кластараў і інш. Інтэграцыйныя тэхналогіі знаходзяць увасабленне ў фарміраванні дзелавога партнёрства, арыентаванага на стварэнне ўнікальнага пакета паслуг, распрацоўку сумеснага брэнда, фарміраванне адзінай арганізацыйнай пляцоўкі, падрыхтоўку альтэрнатыўных праграм і інш.[7]

Адзін з першых у Беларусі шырокіх міжмузейных праектаў — «Сямейнае падарожжа» (5 музеяў за 5 дзён) быў арганізаваны на базе літаратурных музеяў сталіцы. Мерапрыемствы праекта праходзілі ў экспазіцыйнай прасторы па спецыяльнай праграме. Яны садзейнічалі прыцягненню ў музей сямейнага наведвальніка — катэгорыі, якая не з'яўляецца асноўнай для сучасных музейных устаноў.

Вынікі маніторынгу выставачнай дзейнасці[8] паказалі: больш грунтоўнай выпрацоўкі стратэгіі патрабуе сёння міжнародны партнёрскі праект, больш актыўна трэба працаваць над тэматыкай сумесных выстаў, іх якасцю і прадметным радам, больш увагу ўдзяляць арганізацыі рэкламнай і PR-кампаніі.

[6] *Медведева, Е. Б.* Рыночный опыт зарубежных музеев, как он виден из России / Е. Б. Медведева // Музей и его аудитория. Маркетинговая стратегия : сб. тр. творческой лаборатории «Музейная педагогика» каф. музейного дела; сост. И. М. Коссова; АПРИКТ. — М. : ИКАР, 2006. — Вып. 7. — С. 26.

[7] *Гл.*: *Павлова, Н. Н.* Музейный маркетинг / Н. Н. Павлова // Музей и его аудитория. Маркетинговая стратегия : сб. тр. творческой лаборатории «Музейная педагогика» каф. музейного дела ; сост. И. М. Коссова; АПРИКТ. — М. : ИКАР, 2006. — Вып. 7. — С. 16—23.

[8] Пратакол пасяджэння № 8 ад 26.09.2012 г. калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «Аб стане і перспектывах развіцця дзяржаўных музеяў». — Мінск, 2012. — С. 1—9.





Для правядзення *PR-кампаніі* выставачнага праекта неабходна вызначыць:

- мэты PR-кампаніі;
- сродкі і інструменты PR;
- кантактных асоб;
- комплекс інфармацыйных і выяўленчых матэрыялаў;
- тэрміны правядзення;
- бюджэт.

У функцыі супрацоўнікаў, адказных за работу з прэсай, уваходзяць наступныя абавязкі:

- аналіз СМІ;
- падрыхтоўка прэс- і пост-рэлізаў;
- распрацоўка сістэмы інфармацыйных нагод, яе запуск і кантроль за прадуктыўнасцю;
- размяшчэнне ў СМІ рэкламы, навін, артыкулаў, сюжэтаў і паведамленняў;
- арганізацыя прэс-канферэнцыі;
- кантроль за паведамленнямі ў друку, на радыё і тэлебачанні;
- фарміраванне выніковага дайджэста публікацый;
- арганізацыя PR-акцый і правядзенне іх аналізу.

Сродкі масавай інфармацыі ў значнай ступені фарміруюць брэнд і статус выставы. Таму неабходна ўважліва аднесціся да іх аналізу. Аб'ектам агляду з'яўляюцца друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, радыё, ТБ, інтэрнэт. У якасці крытэрыяў аналізу выкарыстоўваюцца такія паказчыкі, як тыраж, геаграфія, спосаб распаўсюджання, мэтавая аўдыторыя, статус выдання і інш.

Залогам эфектыўнасці работы прэс-службы выступае інтэнсіўная падрыхтоўчая работа. Для таго, каб прыцягнуць найбольшую колькасць прадстаўнікоў СМІ на выставу, неабходна стварыць сістэму інфармацыйных нагод і запрашаць на кожнае мерапрыемства паасобку. Падрыхтоўка прэс-канферэнцыі вымагае распрацоўкі сцэнарыя яе правядзення, прызначэння мадэратара, выступаючых і асоб, адказных за рашэнне арганізацыйных пытанняў.

Важным аспектам пачатковай стадыі з'яўляецца *падрыхтоўка прэс-рэліза*. Ад яго якасці, стылю і інфармацыйнай насычанасці залежыць верагоднасць з'яўлення публікацый, іх характар і аб'ём. Тэкст прэс-рэліза павінен быць дакладным, выразным, распрацаваным з улікам спецыфікі СМІ, актуалізацыяй адной канкрэтнай тэмы. Непажаданым з'яўляецца вялікі аб'ём (больш за 1—2 старонкі) і ўжыванне прафесійнай лексікі. Першы абзац тэксту — акцэнтны, ён вызначае агульны змест і эмацыянальны фон, астатнія толькі дапаўняюць і ўдакладняюць яго[9].

Акрамя прэс-рэлізаў музей рыхтуе наступныя *матэрыялы для СМІ*:

- інфармацыя падзейнага характару — аб адметных кірунках развіцця музея на сучасным этапе, бягучых мерапрыемствах і акцыях;
- артыкулы — аб тэматычнай адметнасці выставы і яе экспанатах;
- медыя-пакет — разнастайныя матэрыялы аб праекце з тэкставымі, фота- ці (або) відэаматэрыяламі.

Сацыяльная каштоўнасць матэрыялаў для СМІ вызначаецца шэрагам крытэрыяў, сярод якіх: актуальнасць тэмы і зместу, незвычайнасць і вастрыня праблематыкі, своечасовасць падачы інфармацыі, персаніфікацыя фактаў і іх блізкасць да паўсядзённага жыцця.

[9] *Гл.*: падрабязней аб афармленні прэс-рэліза і іншых матэрыялаў для прэсы ў выданні : *Шарков, Ф. И.* Выставочный коммуникационный менеджмент (управление выставочными коммуникациями) / Ф. И. Шарков. — М. : Альфа-Пресс, 2006. — С. 36.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Галоўная задача, якая стаіць перад прэс-службай на заключным этапе — *фарміраванне дайджэста публікацый*. Збор і абагульненне матэрыялаў СМІ па выставе — карысная справа як для правільнай ацэнкі рэкламнай кампаніі, так і для аналізу вынікаў выставачнага праекта, яго рэзанансу ў грамадстве.

Да выставы выпускаецца *паліграфічная прадукцыя*. Гэта могуць быць праграма адкрыцця выставы, каталог, буклет, пуцяводнік, матэрыялы дадатковых праграм, сувеніры, запрашальныя і ўваходныя білеты.

Асаблівае значэнне ў музейнай практыцы ўдзяляецца дызайну і паліграфічнаму выкананню каталогаў выстаў. Для міжнароднай выставы каталог павінен быць двух- ці трохмоўным.

У афармленні буклета неабходна адлюстраваць спецыфіку праекта (яго канцэптуальную ідэю, тэматычную скіраванасць альбо мастацкую адметнасць). У дызайне пажадана размяшчэнне элементаў выставачнага брэнда і інш.

*Комплекс маркетынгавых камунікацый* уключае:

1) прамы маркетынг — праз выкарыстанне пошты, тэлефона, факса, электроннай пошты;

2) рэклама на радыё і тэлебачанні;

3) разнастайныя акцыі;

4) публікацыі ў прэсе;

5) асабістыя кантакты.

Згодна з данымі сацыялагічнага апытання[10] найбольш распаўсюджанымі крыніцамі атрымання інфармацыі аб музейных мерапрыемствах, як лічыць большасць рэспандэнтаў, з'яўляюцца СМІ (газеты, радыё, тэлебачанне) і бліжэйшае акружэнне. У той жа час застаецца дастаткова высокім працэнт рэспандэнтаў, якія даведваюцца аб анонсах выстаў з рэкламных постэраў і сеткі інтэрнэт. Прычым, пасіўныя спажыўцы ў мэтах атрымання інфармацыі звяртаюцца найперш да СМІ, у той час як актыўная аўдыторыя — да магчымасцей інтэрнэта, афіш, рэкламных постэраў і інш. Найбольшы эфект у маладзёжным асяроддзі дае «сарафаннае радыё» (на другім месцы ў данай катэгорыі — інтэрнэт). Сярод розных форм, якія арганізуюцца музеем для сумеснага правядзення часу бацькоў з дзецьмі (агляд асноўнай экспазіцыі, удзел у музейна-педагагічным занятку, лекцыі, мерапрыемстве забаўляльнага характару і інш.), большасць рэспандэнтаў выбралі наведванне дзіцячай выставы.

У залежнасці ад этапаў выкарыстоўваюцца сродкі прасоўвання рознай інтэнсіўнасці. На пачатковым этапе найбольш эфектыўным метадам з'яўляецца распаўсюджанне інфармацыі праз прамую рассылку. Бліжэй да адкрыцця выставы інструменты прыцягнення наведвальніка павінны быць больш разнастайнымі і інтэрактыўнымі. Найбольш эфектыўнымі сярод іх лічацца тыя, што ўтрымліваюць механізмы адваротнай сувязі і адпавядаюць індывідуальным запытам наведвальнікаў. Сярод іх: персанальныя запрашэнні, індывідуальная рассылка шляхам выкарыстання інфармацыі адраснай базы даных, сеткавыя кантакты. Да дзейсных сродкаў камунікацыі адносяцца таксама флаеры, тэле- і радыёрэклама, прэс- і пост-рэлізы, прэс-канферэнцыі і інш.

Вынікі сацыялагічных даследаванняў указваюць на эфектыўнасць агрэсіўнай PR-кам-

[10] Материалы социологического исследования «Изучить потребительские предпочтения различных социально-демографических групп населения Республики Беларусь на рынке культурных продуктов и услуг» / науч. руководитель И. В. Котляров // Институт социологии НАН Беларуси, по заказу Министерства культуры Республики Беларусь. — Минск, 2012.





паніі ў сучасных умовах: навязванне ацэнак, стварэнне ажыятажу вакол выставы, яе тэмы, ідэі, цэнтральнай фігуры, выкарыстанне агрэсіўнага слогана і інш.[11]

Неабходна адзначыць, што выставы, якія пазіцыянуюцца праз рэкламны і PR-інструментарый, маюць вялізны спонсарскі патэнцыял.

Арганізацыю работы са спонсарамі неабходна пачынаць з распрацоўкі спонсарскага пакета. Паўнацэнны *спонсарскі пакет* утрымлівае:

- разгорнутую інфармацыю аб выставе і яе дадатковых праграмах (асноўная прэзентацыйная, дадатковыя, спецпраекты);
- інфармацыю аб моцных баках праекта, яго ўнікальнасці і падтрымцы;
- магчымыя выгады для спонсара (абгрунтаванне, чаму праект можа быць цікавы спонсару);
- аб'ём рэкламных паслуг, якія атрымае спонсар дзякуючы свайму ўдзелу;
- інфармацыю аб арганізатарах праекта (з пазначэннем кантактаў).

Сярод асноўных відаў прадстаўніцтва выставы ў інтэрнэце значнае месца займае *музейны сайт* — цэнтральны элемент, праз які можа рэалізавацца стратэгія выставачнай дзейнасці музея[12]. Граматнае і паўнацэннае напаўненне кантэнту сайта дае магчымасць пашырыць стасункі з партнёрамі, наведвальнікамі і СМІ. Сайт павінен даваць уяўленне аб тэматыцы выставы, яе навінах, прэзентацыях, дадатковых мерапрыемствах, змяшчаць фотарэпартажы, спасылкі на публікацыі, утрымліваць інфармацыю аб тэрмінах правядзення, праграме адкрыцця, коштах білетаў і інш. Музейны сайт павінен быць мінімум трохмоўным (на беларускай, рускай і англійскай мовах)[13].

Да эфектыўных *інструментаў PR-кампаніі* выставы адносяцца прэзентацыі і спецыяльныя праекты, якія ствараюць размеркаванае па часе іміджавае поле праекта. Сярод іх:

- прэзентацыя выставы ў перыяд яе падрыхтоўкі;
- размяшчэнне інфармацыі аб правядзенні выставы падчас іншых мерапрыемстваў, у тым ліку праведзеных у іншых установах;
- арганізацыя працяглых па часе інфармацыйных нагод праз удзел у партнёрскіх праектах;
- распрацоўка тэматычных рубрык, спецыяльных рэпартажаў у СМІ;
- выкарыстанне магчымасцей інтэрнэт-суполак (сацыяльныя сеткі, віртуальныя клубы, фота- і відэахостынгі і інш.).

*PR-акцыі*, як эфектыўны сродак прасоўвання выставы, могуць быць арганізаваны падчас прэзентацыйнай праграмы, прэс-канферэнцыі, фестывалю, семінара, мерапрыемстваў у межах дадатковых праграм і інш.

Такім чынам, аналіз комплексу маркетынгавых камунікацый і стратэгій развіцця праекта сведчыць аб тым, што ў сучасных умовах музеі павінны быць мабільнымі і дынамічнымі, імкнуцца не толькі да стварэння высакаякаснага прадукту, але і да яго актыўнага прасоўвання пры дапамозе ўніверсальных і спецыяльных методык і сродкаў.

[11] *Ивченко, В. Н.* Музей в структуре арт-рынка / В. Н. Ивченко // Культура Беларусі : рэаліі сучаснасці : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 12—13 чэрв. 2012 г.); Інстытут культуры Беларусі; рэдкал. : І. І. Крук [і інш.]. — Мінск : ДУА «Інстытут культуры Беларусі», 2012. — С. 366—367.

[12] *Гл.*: падрабязней матэрыялы секцыйнага пасяджэння «Музеі ў інтэрнэт-прасторы» ў выданні : Культурное наследие и информационные технологии на постсоветском пространстве : материалы Междунар. науч.-практ. конф. — Минск : Белпринт, 2011. — С. 74—91; раздзел «Электронная экспазіцыя» ў выданні: Музеі Беларусі : Праблемы. Перспектывы. Інавацыі : Экспазіцыйна-выставачная дзейнасць / уклад., пер. з рус. мовы, агульн. рэд. І. Б. Лапцёнак. — Мінск : ДУА «Інстытут культуры Беларусі», 2012. — С. 189—208; матэрыялы круглага стала «Кіраўнічыя практыкі і маркетынгавыя камунікацыі ў музейнай дзейнасці» ў выданні : Культура Беларусі : рэаліі сучаснасці : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 12—13 чэрвеня 2012). — Мінск : ДУА «Інстытут культуры Беларусі», 2012. — С. 372—393.

[13] У краінах Еўропы сайты многіх музеяў працуюць на 6—8 мовах.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Праектны менеджмент: арганізацыя і кантроль (бібліяграфічны спіс крыніц для дадатковага вывучэння)


1. *Lewis, James P.* Fundamentals of Project management / James P. Lewis. — New York : AMACOM, 1995.
2. *Morrow, Sandra Lynn.* The Art of the Show / Sandra Lynn Morrow. — Second Edition. — Dallas, Texas : IAEM Foundation, 2002. — 636 p.
3. *Nagle, Thomas T.* The Strategy and Tactics of Pricing / Thomas T. Nagle, Reed K Holde. — 2-d Ed. —NY : Prentice Hall, 1995.
4. *Агранович, В. Б.* Проектный менеджмент в социальной сфере : учеб. пособие / В. Б. Агранович, А. П. Моисеева. — Томск : Изд-во ТПУ, 2008. — 160 с.
5. *Александрова, Н.* Выставка — комплексный маркетинг / Н. Александрова // Мир Expo. — 2003. — № 2.
6. *Александрова, Н.* Выставочный менеджмент : метод. пособие / Н. Александрова, Е. Сорокина, И. Филоненко. — Ростов-н/Д. : Экспертное бюро, 2001. — 212 с.
7. *Александрова, Н.* Выставочный менеджмент : стратегии управления и маркетинговые коммуникации / Н. Александрова, И. Филоненко. — М. : РИА «Проэкспо», 2006. — 384 с.
8. *Амунц, Д. М.* Государственно-частное партнерство. Концессионная модель совместного участия государства и частного сектора в реализации финансовоемких проектов в сфере культуры / Д. М. Амунц // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2005. — № 12. — С. 16.
9. *Анализ* управления проектами. Практический курс : учеб. пособие / сост. Н. Н. Гаврилов [и др.]. — М. : Российская экономическая академия, 2000.
10. *Андрейкина, М. С.* Бренд в сфере культуры и искусства / М. С. Андрейкина // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2004. — № 11. — С. 69—74.
11. *Апфельбаум, С. М.* Проектный менеджмент. Состояние и перспективы проектной деятельности в российской культуре / С. М. Апфельбаум // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2004. — № 2. — С. 13—18.
12. *Астафьева, О. Н.* Самоорганизация и управление в культуре : пределы совместимости / О. Н. Астафьева // Синергетика и социальное управление. — М., 1998. — С. 198.
13. *Балакшин, А. С.* Методологические и организационные аспекты современной культурной политики / А. С. Балакшин. — М. : РАГС, 1995. — 122 с.
14. *Безуглова, Т. В.* Новые формы развития учреждения культуры / Т. В. Безуглова // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2004. — № 9. — С. 64—67.
15. *Белозор, Ф. И.* Стратегическое проектирование. Инструмент управления муниципальной библиотекой / Ф. И. Белозор // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2003. — № 4. — С. 21—26.
16. *Бердышев, С. Н.* Организация выставочной деятельности : учеб. пособие / С. Н. Бердышев. — М. : Дашков и К°, 2008.
17. *Вайдман, М.* Сравнительный глоссарий терминов по управлению проектами : в 2 т. / М. Вайдман. — М. : OFFICE, 2007.
18. *Виханский, О. С.* Стратегическое управление : учебник / О. С. Виханский. — 2-е изд. — М., 1998.
19. *Волков, И. М.* Проектный анализ : учебник для вузов / И. М. Волков, М. В. Грачева. — М., 1998. — 423 с.
20. *Воропаев, В. И.* Управление проектами в России : основные понятия : История. Достижения. Перспективы / В. И. Воропаев. — М. : Алане, 1995. — 225 с.
21. *Воропанов, В. В.* Привлечение дополнительных источников финансирования / В. В. Воропанов // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2004. — № 1. — С. 51—55.
22. *Востряков, Л.* Модели культурной политики (кросскультурный анализ) / Л. Востряков // Общество и экономика. — 2004. — № 1. — С. 139—178.
23. *Галуцкий, Г. М.* Управляемость культуры и управляемость культурным процессом / Г. М. Галуцкий. — М. : Мысль, 1999. — 314 с.
24. *Гейзлер, П. С.* Управление проектами : практ. пособие / П. С. Гейзлер, О. В. Завьялова; под. ред. П. С. Гейзлера. — Минск : Книжный Дом «Мисанта», 2005.
25. *Гейзлер, П. С.* Управление проектами : учеб. пособие / П. С. Гейзлер, О. В. Завьялова. — Минск : БГЭУ, 2005.
26. *Голубков, Е. П.* Современные тенденции развития маркетинга / Е. П. Голубков // Маркетинг в России и за рубежом. — 2004. — № 1. — С. 3—18.
27. *Грашина, М.* Основы управления проектами / М. Грашина, В. Дункан. — СПб. : Питер, 2006.
28. *Грей, Клиффорд Ф.* Управление проектами : практ. руководство / Клиффорд Ф. Грей, Э. У. Ларсон. — М. : Дело и Сервис, 2003.
29. *Гусев, Э. Б.* Выставочная деятельность в России и за рубежом : учеб.-метод. пособие / Э. Б. Гусев, В. А. Прокудин, А. Г. Салащенко. — М. : Дашков и К°, 2004. — 516 с.
30. *Демарко, Том.* Человеческий фактор : успешные проекты и команды / Том Демарко, Тимоти Листер. — СПб. : Символ-Плюс, 2005.
31. *Джерелиевская, И. К.* Аргументы в пользу менеджмента организаций / И. К. Джерелиевская // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2003. — № 12. — С. 19—27.
32. *Джерелиевская, И. К.* Инструменты укрепления власти руководителя / И. К. Джерелиевская // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2002. — № 1. — С. 51—55.
33. *Олвуд, Д., Монтгомери, Б.* Выставки : планирование и дизайн / Б. Монтгомери, Д. Олвуд. — Новосибирск : Интербук, 1991.
34. *Дитхелм, Г.* Управление проектами : в 2 т. / Г. Дитхелм. — СПб. : Издательский дом «Бизнес-пресса»; Корпорация «Двадцатый Трест», 2003.
35. *Долгин, А.* Прагматика культуры / А. Долгин. — М. : Фонд научных исследований «Прагматика культуры», 2002. — 168 с.
36. *Драгичевич-Шешич, М.* Культура : Менеджмент, анимация, маркетинг / М. Драгичевич-Шешич, Б. Стойкович. — Новосибирск : Тигра, 2000. — 510 с.
37. *Дридзе, Т. М.* Основы социокультурного проектирования / Т. М. Дридзе, Э. А. Орлова. — М., 1995.
38. *Дункан, Джек У.* Основополагающие идеи в менеджменте : уроки основоположников менеджмента и управленческой практики / Джек У. Дункан. — М. : Дело, 1996. — 271 с.
39. *Дымникова, А. И.* Практика фандрейзинга в учреждениях культуры / А. И. Дымникова // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2004. — № 1. — С. 42—50.
40. *Дюкарев, Р.* Социальный маркетинг для некоммерческих организаций : практ. пособие / Р. Дюкарев, О. Холмз, К. Фокс. — М., 1998.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

41. *Ерасов, Б. С.* Социальная культурология : учеб. пособие / Б. С. Ерасов. — М. : Аспект-Пресс, 2000. — 591 с.
42. *Заренков, В. А.* Управление проектами : учеб. пособие / В. А. Заренков. — 2-е изд. — М. : Изд-во АСВ; СПб.; СПбГАСУ, 2006. — 312 с.
43. *Зуев, С.* Э. Социокультурное проектирование : анализ ситуации, постановка проблемы / С. Э. Зуев // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2003. — № 1. — С. 43—47.
44. *Иванов, В. В.* Основы управления проектами : учеб. пособие / В. В. Иванов, А. В. Бельц. — М., 2000. — 12 с.
45. *Игнатьева, Е. Л.* От менеджмента организаций к менеджменту проектов / Е. Л. Игнатьева // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2002. — № 6.
46. *Игнатьева, Е. Л.* Экономика культуры : учеб. пособие / Е. Л. Игнатьева. — М. : ГИТИС, 2004. — 232 с.
47. *Ильин, В. В.* Руководство качеством проектов. Практический опыт / В. В. Ильин. — М. : Вершина, 2006.
48. *Ионин, Л. Г.* Социология культуры / Л. Г. Ионин. — М. : Логос, 1996. — 278 с.
49. *Исаев, В. В.* Организация работы команды проекта. Психология, стратегия, тактика : учеб. пособие / В. В. Исаев. — СПб. : Издательский дом «Бизнес-пресса», 2006.
50. *Исакова, Н.* Управленческие таланты — в борьбе за место под выставочным солнцем / Н. Исакова // Журнал ТПП РФ «ЭкспоВедомости» [электронный ресурс]. — 2008. — № 1. — Режим доступа : http://www.informexpo.ru/new/view_content.php?id=2176. — Дата доступа : 14.12.2012.
51. *Калякина, А. В.* Маркетинг в музее. Основные этапы разработки и осуществления маркетинговой политики / А. В. Калякина // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2004. — № 2. — С. 60—67.
52. *Калякина, А. В.* Проектные технологии в сфере культуры / А. В. Калякина // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2004. — № 12. — С. 64—68.
53. *Карпухин, О. И.* Менеджмент организационных структур в культурном секторе // Социально-политический журнал. — 1996. — № 6. — С. 165—174.
54. *Карпухин, О. И.* Социокультурный менеджмент как компонент культурной политики государства / О. И. Карпухин // Вопросы культурологии. — 2005. — № 8. — С. 89—92.
55. *Киселева, Т. Г.* Основы социально-культурной деятельности : учеб. пособие / Т. Г. Киселева, Ю. Д. Красильников. — М. : Изд-во МГУКИ, 1995. — 136 с.
56. *Кнорринг, В. И.* Теория, практика и искусство управления : учебник / В. И. Кнорринг. — М. : Норма, 1999. — 527 с.
57. *Кнофель, Г.* Изменения и роль управления проектами в их реализации / Г. Кнофель // Мир управления проектами / Г. Кнофель; под ред. Х. Решке, Х. Шелле. — М. : Алане, 1994. — С. 17—24.
58. *Колесников, А. А.* Управление качеством инновационных проектов : метод. рекоменд. / А. А. Колесников, Т. Г. Колесникова, А. В. Олейник. — М. : Министерство образования Российской Федерации, 2003.
59. *Корпоративный* и проектный менеджмент : толковый англо-русский словарь-справочник / П. Б. Понкратов [и др.]. — М. : ОМЕГА-Л, 2009.
60. *Красильников, Ю. Д.* Методика социально-культурного проектирования / Ю. Д. Красильников. — М., 1993. — 73 с.
61. *Кузицын, Г. М.* Проектирование социально-культурных процессов : учеб. пособие / Г. М. Кузицын. — 2-е изд. — Пермь, 2002. — 160 с.
62. *Лазутина, И. С.* PR-деятельность учреждения культуры / И. С. Лазутина // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2003. — № 12. — С. 61—67.
63. *Лапыгие, Ю.* Управление проектами : от планирования до оценки эффективности : практ. пособие / Ю. Лапыгие. — М. : Омега-Л, 2007.
64. *Лебедев, Е. А.* Технология работы учреждений культуры по связям с общественностью / Е. А. Лебедев // Музей будущего : информационный менеджмент. — М., 1998.
65. *Литвак, Б. Г.* Управленческие решения / Б. Г. Литвак. — М. : ЭКМОС, 1998. — 156 с.
66. *Литвинов, В. В.* Практика современной экспозиции / В. В. Литвинов. — 2-е изд. — М. : РУДИЗАЙН, 2010. — 400 с.
67. *Лорд, Б.* Менеджмент в музейном деле / Б. Лорд, Г. Лорд. — М. : Логос, 2002. — 256 с.
68. *Луков, В. М.* Социальный проект : учеб. пособие / В. М. Луков. — М. : Флинта, 2003. — 240 с.
69. *Мазур, И. И.* Управление проектами. Справочник для профессионалов / И. И. Мазур, В. Д. Шапиро, Н. Г. Ольдерогге. — М. : Высшая школа, 2001. — 875 с.
70. *Мазур, И. И.* Управление проектами : справ. пособие / И. И. Мазур, В. Д. Шапиро. — М. : Экономика, 2001. — 574 с.
71. *Мазур, И. И.* Управление проектами : учеб. пособие / И. И. Мазур, В. Д. Шапиро, Н. Г. Ольдерогге; под. ред. И. И. Мазур. — 2-е изд. — М. : Омега; Л., 2004.
72. *Марков, А. П.* Основы социокультурного проектирования / А. П. Марков, Г. М. Бирженюк. — СПб., 1998. — 290 с.
73. *Михайлов, А. Г.* Использование современных методов управления проектами, маркетинга и менеджмента при создании информационных систем / А. Г. Михайлов // Информ. ресурсы России. — 2000. — № 6. — С. 19—22.
74. *Михеева, Н. А.* Менеджмент в социально-культурной сфере / Н. А. Михеева, Л. Н. Галенская. — СПб., 2000. — 168 с.
75. *Никич, Г. А.* Культурная индустрия : омассовление культуры или окультуривание рынка / Г. А. Никич // Творческие индустрии в России. — М. : Институт культурной политики. — 2004. — Вып. 3. — С. 66—70.
76. *Никишин, Н. А.* Социальное проектирование в музейной сфере / Н. А. Никишин // От краеведения к культурологии : Российскому институту культурологии 70 лет. — М., 2002. — С. 212—220.
77. *Новицкая, С. Н.* Инновационные проекты / С. Н. Новицкая // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2005. — № 3. — С. 58—62.
78. *Орлова, Э. А.* Социальное проектирование в сфере культуры : прорыв к реальности / Э. А. Орлова, Т. Дридзе. — М., 1990.
79. *Основы* профессиональных знаний и национальные требования к компетенции специалистов по управлению проектами / В. П. Безкровный [и др.]; под. ред. В. И. Воропаева. — М. : СОВНЕТ, 2001.
80. *Особенности* управления международными проектами в сфере культуры и искусства // Менеджмент и управление [электронный ресурс]. — Режим доступа : http://www.manageweb.ru/study-533-1.html. — Дата доступа : 14.12.2012.
81. *Переверзев, М. П.* Инновации в образовании : метод. управления проектом / М. П. Переверзев. — Тула, 2001.
82. *Петелин, В. Г.* Выставочный менеджмент : технологии и ноу-хау / В. Г. Петелин. — М. : ИПКИР, 2002.

83. *Петелин, В. Г.* Основы менеджмента выставочной деятельности : учеб. пособие для студентов вузов / В. Г. Петелин. — М. : ЮНИТИ-ДАНА, 2005. — 447 с.
84. *Пилилян, Е. К.* Менеджмент культуры : учеб. пособие / Е. К. Пилилян. — Владивосток : Изд-во ДВГТУ, 2007. — 81 с.
85. *Поздняков, В. В.* Управление проектами : сущность, актуальность и особенности применения в России / В. В. Поздняков // Мир управления проектами. — М. : Алане, 1994. — С. 252—270.
86. *Попов, Ю. И.* Управление проектами / Ю. И. Попов, О. В. Яковенко. — М. : ИНФРА, 2005.
87. *Потапов, С. В.* Как управлять проектом. Поэтапно до полной реализации / С. В. Потапов. — М. : ЭКСМО, 2006.
88. *Рубинштейн, А. Я.* Культура между государством и рынком / А. Я. Рубинштейн, Б. Ю. Сорочкин // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2003. — № 7. — С. 37—45.
89. *Рубинштейн, А. Я.* Культура между государством и рынком / А. Я. Рубинштейн, Б. Ю. Сорочкин // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2003. — № 8. — С. 9—18.
90. *Словарь* актуальных музейных терминов / И. В. Чувилов [и др.]; под ред. Л. С. Глебовой, М. Н. Тимофейчук. — М., 2009.
91. *Тернер, Дж. Родни.* Руководство по проектно-ориентированному управлению / Дж. Родни Тернер. — М. : Издательский дом Гребенникова, 2007.
92. *Тульчинский, Г. Л.* Менеджмент в сфере культуры / Г. Л. Тульчинский. — СПб. : Лань, 2001. — 384 с.
93. *Тульчинский, Г. Л.* Менеджмент в сфере культуры : учеб. пособие / Г. Л. Тульчинский, Е. Л. Шекова. — 4-е изд. — СПб. : Лань; Планета музыки, 2009. — 528 с.
94. *Управление* проектами : зарубежный опыт / под ред. В. Д. Шапиро. — СПб., 1993. — 610 с.
95. *Управление* музеем : практ. руководство / под ред. Патрика Дж. Бойлана. — ИКОМ, 2004. — 232 с.
96. *Уткин, Э.* Проект-менеджмент / Э. Уткин, В. Кравченко. — М. : ТЭИС, 2002.
97. *Федянина, Н. Н.* Информационная служба в музее. Отдел информации как инструмент активизации проектной партнерской деятельности / Н. Н. Федянина // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2004. — № 3. — С. 6—42.
98. *Филоненко, И. К.* Выставки : проблемы, перспективы, рекомендации / И. К. Филоненко // Вестник МТПП (спец. выпуск по выставочной деятельности). — 2001.
99. *Фридман, Сьюзан.* Как показать товар лицом. Выставки и презентации / Сьюзан Фридман. — М. : Консэко, 1994.
100. *Чижиков, В. М.* Введение в социокультурный менеджмент : учеб. пособие / В. М. Чижиков, В. В. Чижиков. — М. : МГУКИ, 2003. — 382 с.
101. *Шапиро, В. Д.* Управление проектами / В. Д. Шапиро. — СПб. : Два-ТрИ, 1996. — 610 с.
102. *Шарков, Ф. И.* Выставочный коммуникационный менеджмент (управление выставочными коммуникациями) / Ф. И. Шарков. — М. : Альфа-Пресс, 2006. — 256 с.
103. *Шишкин, С. В.* Экономика и управление в сфере культуры : поиск новых моделей / С. В. Шишкин. — М. : НИИК, 1992. — 188 с.
104. *Эверитт, Э.* Как управлять культурой : интегрированное культурное планирование / Э. Эверитт // Вопросы культурологии. — 2005. — № 4. — С. 82—87.



# II. Аспекты практычнай рэалізацыі праекта

## Кампаненты праектавання вопыту экспазіцыі для наведвальніка (метадычныя рэкамендацыі)

Музейная практыка сведчыць аб тым, што пры стварэнні экспазіцыі значную ўвагу прыцягваюць актуальныя аспекты развіцця профільнай навукі, пытанні абнаўлення форм музейнай прэзентацыі, увядзення ў навуковы і культурны абарот матэрыялаў музейных фондаў. Разам з тым, арыентацыя на наведвальніка, імкненне да атрымання ім станоўчага вопыту ў музейнай прасторы, з'яўляецца не менш важнай часткай рэалізацыі музейнай стратэгіі. Трымаць у полі зроку інтарэсы, патрэбы, чаканні і запыты наведвальніка неабходна на ўсіх этапах правядзення праектных работ.

Першым крокам падчас праектавання экспазіцыі з'яўляецца фармуліроўка гіпотэзы і вызначэнне галоўнай ідэі праекта — з улікам запытаў грамадства і музейнай місіі.

Пры гэтым адбываецца *пошук адказаў на шматлікія пытанні*. Сярод іх:

- Для каго вы ствараеце экспазіцыю?
- Што вашы наведвальнікі павінны ўбачыць праз сістэму экспазіцыі?
- Якія арганізацыйныя здольнасці каманды праекта дапамогуць прадставіць яго найбольш яскрава, выразна і глыбока?
- Якімі рэсурсамі (фінансы, кадры, час і інш.) вы валодаеце для ажыццяўлення праекта? і інш.

Важным крокам у станаўленні праекта з'яўляецца выбар *назвы*. Яна суправаджае праект на працягу ўсяго яго жыццёвага цыкла. Менавіта з назвы пачынаецца знаёмства з экспазіцыяй і ў наведвальніка. Зыходзячы з практыкі, можна вылучыць наступныя характарыстыкі ўдалай назвы:

- тэматычная празрыстасць;
- адсутнасць перасячэнняў з назвамі іншых праектаў;
- мілагучнасць;
- лёгкасць запамінання;
- лаканічнасць і выразнасць;
- асацыятыўнасць.

При планаванні трэба дакладна вызначыць мэты, задачы і адметнасць праекта ў параўнанні з культурнымі прадуктамі канкурэнтаў.

Неабходна ўсвядоміць, што экспазіцыя ўяўляе з сябе: стратэгічная мэта праекта; фактары, якія прадвызначаюць яго эфектыўнасць; унікальнасць; ход рэалізацыі.

*Спецыфіка праекта* павінна быць зразумелай не толькі аўтарам канцэпцыі, але і камандзе праекта, кіраўніцтву, калектыву музея, апякунскаму савету, СМІ, наведвальнікам, спонсарам і шырокім колам грамадства.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асэнсаванне стратэгіі павінна ўвасабляецца шляхам фарміравання праграмнай заявы праекта: у выглядзе інтэрв'ю, публікацыі, рэкламнага роліка і інш. Гэта паспрыяе прыцягненню ўвагі да праекта тых асоб і арганізацый, чыя дапамога і падтрымка (арганізацыйная, фінансавая, тэхнічная і інш.) можа вам дапамагчы.

Важным элементам фарміравання канцэпцыі праекта з'яўляецца ўсведамленне яго ролі і перспектыў для музея (з мэтай пашырэння тыпалогіі музейнай аўдыторыі, павелічэння прэстыжу музея ў вачах грамадства і інш.).

Перспектывы маюць важнае значэнне не толькі для Заказчыка і Выканаўцы праекта, але і для музея як арганізацыі.

*Паспяховы праект валодае шырокімі магчымасцямі:*

- спрыяе стварэнню пазітыўнага іміджу музея;
- садзейнічае фарміраванню новых партнёрскіх кантактаў і замацаванню існуючых;
- адкрывае шырокія магчымасці для павелічэння музейнай аўдыторыі і прыцягнення новых катэгорый наведвальнікаў;
- спрыяе камплектаванню музейнага фонду;
- садзейнічае ўзнікненню цікаўнасці з боку грамадства да малавядомых і недастаткова вывучаных тэм, адметных артэфактаў;
- павышае навуковы і арганізацыйны патэнцыял установы і інш.

Галоўным арыенцірам праекта з'яўляюцца патрэбы, кола інтарэсаў і чаканні наведвальнікаў, якія выяўляюцца на аснове іх вывучэння.

Вынікі аналізу сацыялагічных даследаванняў указваюць на *неабходнасць пераасэнсавання маркетынгавых стратэгій па прыцягненню наведвальнікаў*: значная колькасць рэспандэнтаў арыентуецца на музей як на месца рэкрэацыі і крыніцу атрымання новых уражанняў. Да найбольш распаўсюджаных прычын матывацыі адносяцца:

- імкненне прыемна і цікава правесці вольны час;
- адпачыць;
- пашырыць агульны кругагляд;
- атрымаць эстэтычнае і эмацыянальнае задавальненне.

Прыцягнуць увагу аўдыторыі і ўтрымаць існуючы інтарэс дазваляе наяўнасць унікальных экспанатаў, высокі ўзровень мастацкага афармлення экспазіцыі, а таксама актуальнасць тэматыкі і інавацыйны (адметны, эксперыментальны) характар яе ўвасаблення.

З мэтай задавальнення інтарэсаў і запытаў аўдыторыі неабходна:

- прымяняць дыферэнцыраваны падыход пры распрацоўцы форм музейнай камунікацыі з улікам сацыяльнага статусу, псіхалагічных, узроставых характарыстык музейнай аўдыторыі, сацыяльна-дэмаграфічных асаблівасцей рэгіёна, у якім знаходзіцца музей;
- імкнуцца да выкарыстання арыгінальных прадметаў музейных фондаў;
- павялічыць колькасць мастацкіх і гістарычных экспазіцый;
- увесці ў планавую распрацоўку праекты дзіцячых экспазіцый, разлічаных на сямейнае наведванне.

Прадумайце, *што спрыяе прыцягненню ўвагі наведвальніка да праекта*, і ўключыце вынікі аналізу ў паэтапную рэалізацыю праекта. Для гэтага:

- вызначце матывацыю наведвання ў адпаведнасці з сегментам аўдыторыі;
- прааналізуйце магчымасці праекта з улікам патрэб і чаканняў наведвальнікаў і прыміце адпаведныя праектныя рашэнні;
- увядзіце ў канцэпцыю праекта метады і прыёмы музейнай прэзентацыі, арыентаваныя на канкрэтную аўдыторыю.

Значным фактарам паспяховасці праекта з'яўляецца даступнасць зместу экспазіцыі для наведвальніка, якая дасягаецца з дапамогай пэўных метадычных прыёмаў.

Выстава павінна:

- даходліва даносіць асноўную ідэю;
- рабіць складаныя рэчы дзякуючы візуальнасці больш даступнымі і зразумелымі;
- даваць наведвальніку дастаткова інфармацыі, але не перагружаць;
- прадстаўляць інфармацыю яскрава і эмацыянальна;
- улічваць асаблівасці візуальнага ўспрыняцця наведвальніка, узровень яго візуальнай граматнасці і культуры;
- даваць магчымасць наведвальнікам самім знаходзіць адказы на пытанні праз разнастайныя кантэксты, задавальняючы індывідуальныя запыты.

Для гэтага неабходна пры праектаванні:

- сканцэнтравацца на асноўнай ідэі;
- канкрэтызаваць змест;
- звяртаць увагу на паслядоўнасць раскрыцця тэматыкі экспазіцыі;
- выкарыстоўваць модульнасць;
- распрацаваць дапаможны матэрыял для наведвальніка (маршрутныя карты, пуцяводнікі і інш.).

Для сучаснага наведвальніка афармленне экспазіцыі, яе мастацкая сістэма, эмацыянальны фон не менш важныя, чым актуальнасць тэматыкі.

Для прыцягнення наведвальніка неабходна *прымяненне спецыяльных метадаў, прыёмаў і сродкаў,* прызначаных для пашырэння камунікацыйнага патэнцыялу экспазіцыі. Сярод іх:

- шматпланавасць падачы экспанатаў;
- вылучэнне дамінанты;
- узаемная дакументацыя музейных прадметаў;
- стварэнне вольнай прасторы вакол знакавых экспанатаў, адметных мемарыяў;
- масіраваны паказ аднатыпных экспанатаў;
- дэманстрацыя музейных прадметаў у абстаноўцы іх бытавання;
- прымяненне прыёмаў і прыстасаванняў, якія дазваляюць убачыць «схаваную» інфармацыю (адваротны бок прадмета, дробны надпіс, клеймы, знакі і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Павышэнню каэфіцыента ўздзеяння экспазіцыі на наведвальніка спрыяюць:

- кантрасны паказ;
- стварэнне асаблівай каларыстычнай гамы;
- выкарыстанне магчымасцей праекцыйнай падсветкі;
- гукавыя эфекты;
- тэатралізацыя;
- анімацыя;
- шырокае прымяненне разнастайных інтэрактыўных элементаў і інш.

Сярод электронных сродкаў асаблівую папулярнасць апошнім часам набываюць інфакіёскі, плазменныя панэлі, святлодынамічныя карты, Multi Touch, «туманны экран» і інш. Аднак падчас увядзення ў прастору экспазіцыі тэхналагічных інавацый неабходна памятаць, што яны закліканы павышаць цікавасць наведвальніка да экспанатаў, а не адцягваць ад іх увагу.

Знакавая сістэма экспазіцыі можа ствараць яскравае ўражанне, але наведвальнік не павінен згубіцца ў семіётыцы незразумелых знакаў і безыменных прадметаў. У сувязі з гэтым важнае значэнне набывае інфармацыйнае суправаджэнне экспазіцыі.

Каб дапамагчы наведвальніку арганічна ўвайсці ў кантэкст экспазіцыі, наблізіцца да разумення асноўнай ідэі і аўтарскай задумы трэба візуалізаваць інфармацыю шляхам стварэння сістэмы тэкстаў, падрыхтоўкі каментарыяў і інш. Неабходна ўлічваць, што іх адсутнасць ці недастатковасць скарачае інфармацыйныя магчымасці экспазіцыі і выклікае ў наведвальніка пачуццё незадаволенасці.

*Сістэма тэкстаў павінна быць дэталёва распрацавана* і адпаведным чынам афармлена згодна з правіламі, вызначэнымі музейнай практыкай. Неабходна ўлічваць, што:

- усе тэксты, уключаныя ў экспазіцыю, павінны ўяўляць адзіную сістэму і займаць падпарадкаванае палажэнне ў адносінах да музейнага прадмета;
- важнае значэнне для наведвальнікаў мае чытальнасць тэкстаў;
- для стварэння турыстычнай прыцягальнасці праекта тэксты павінны быць мінімум двух- ці трохмоўнымі, з выкарыстаннем мовы міжнародных зносін (найчасцей запатрабаваныя з улікам спецыфікі турыстычнага сектара беларуская, руская і англійская мовы);
- навігацыйныя тэксты павінны быць добра бачнымі наведвальніку, дапамагаць яму арыентавацца ў прасторы, даваць уяўленне аб структуры экспазіцыі, накіроўваць увагу і вызначаць маршрут;
- вядучыя тэксты — ёмкія, запамінальныя і інфармацыйна насычаныя;
- пры падрыхтоўцы этыкетажу трэба:
  - вытрымліваць адзіны стыль выканання ў выкладанні зместу і афармленні;
  - улічваць адпаведнасць этыкетак зместу экспазіцыі і профілю музея;
  - размяшчаць дакладную інфармацыю, з улікам навуковай атрыбуцыі;
  - адлюстроўваць неабходную паўнату звестак аб экспанаце, яго паходжанні і бытаванні;
  - выяўляць змест лаканічна.

Распрацоўваюцца тэксты аўтарамі экспазіцыі ў працэсе яе навуковага праектавання, зацвярджаюцца як дадаткі да тэматыка-экспазіцыйнага плана. Усе пытанні іх афармлення і размяшчэння вырашаюцца ў працэсе мастацкага праектавання экспазіцыі сумеснымі намаганнямі мастакоў і экспазіцыянераў.





Сучасныя камп'ютарныя тэхналогіі дазваляюць музеям размяшчаць у экспазіцыі друкаваны этыкетаж у сціслай форме, а поўную інфармацыю аб музейным прадмеце дэманстраваць праз сэнсарныя кіёскі і лічбавыя панэлі. Інфармацыйнае забеспячэнне экспазіцыі можа дапаўняцца таксама шляхам выкарыстання аўдыягідаў, дадаткаў «дапоўненай рэчаіснасці» для мабільных прылад, у тым ліку, сістэм QR-кодаў (з выкарыстаннем праграм на замежных мовах).

Важнае значэнне падчас рэалізацыі праекта мае стварэнне развітай інфраструктуры абслугоўвання. У музеі павінны быць забяспечаны ўмовы для агляду экспазіцыі рознымі катэгорыямі наведвальнікаў, у тым ліку сямейных (у прыватнасці, з маленькімі дзецьмі), сталых людзей, інвалідаў.

Належная ўвага павінна надзяляцца *арганізацыі безбар'ернага асяроддзя, стварэнню ўмоў для пераадолення сацыякультурнай ізаляцыі наведвальнікаў* з абмежаванымі магчымасцямі. Значную ролю ў паспяховасці адпаведнай камунікацыі выконвае не толькі тэхнічнае аснашчэнне музея патрэбнымі прыладамі, наяўнасць спецыяльных праграм экскурсійнага абслугоўвання, але і звычайная неабыякавасць і добразычлівасць з боку музейнага персаналу.

Наведвальніку неабходна забяспечыць:

- добры абзор экспазіцыі;
- эрганоміку і бяспеку;
- месцы для адпачынку;
- магчымасць агляду экспазіцыі (у тым ліку, інвалідамі-калясачнікамі, інвалідамі з дрэнным зрокам і слыхам і інш.);
- удзел у спецыяльных праграмах (у тым ліку, наведвальнікам з праблемамі развіцця);
- магчымасць атрымання (набыцця) паліграфічнай (буклеты, каталогі) і сувенірнай (з сімволікай выставы) прадукцыі.

Вынікі даследавання эфектыўнасці ўспрыняцця экспазіцыі наведвальнікамі дазваляюць музею вызначаць прыярытэты з улікам дынамікі інтарэсаў і запытаў музейнай аўдыторыі, уносіць карэктывы ў далейшую стратэгію дзейнасці па развіццю праекта.

*Даследаванне эфектыўнасці ўспрыняцця* можа адбывацца шляхам вывучэння:

- уяўленняў аўтараў і іншых членаў праектнай групы аб мэтах і галоўных ідэях экспазіцыі, фактарах іх паспяховай рэалізацыі;
- паводзін наведвальнікаў у час агляду экспазіцыі;
- вынікаў агляду экспазіцыі наведвальнікамі.

На этапе завяршэння падрыхтоўкі праекта да адкрыцця праводзіцца ацэначны агляд экспазіцыі спецыяльна створанай камісіяй з удзелам дырэктара, спецыялістаў і знешніх экспертаў, адбываецца абагульненне вынікаў праекта і ацэнка на аснове паказчыкаў вымярэння яго эфектыўнасці.

Пасля адкрыцця экспазіцыі праца па яе ўдасканаленню працягваецца. З улікам развіцця профільных навук, папаўнення фондаў, сістэматычнага вывучэння рэакцыі музейнай аўдыторыі ў праектную дакументацыю ўносяцца змяненні і дапаўненні, якія знаходзяць таксама адлюстраванне ў кантрольным тэксце экскурсіі і сцэнарыях дадатковых праграм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Літаратура


1. *Гаврилова, С. Н.* Музеи Беларуси, современное состояние и перспективы развития / С. Н. Гаврилова // Кіраванне музеем — XXI стагоддзе : матэрыялы Нацыянальнага трэнінгу UNESCO / ICOM па сучаснаму музейнаму менеджменту для музейных спецыялістаў Рэспублікі Беларусь (Мінск, 26—28 мая 2009 г.). — Мінск, 2009. — С. 10—17.
2. *Галкина, Т. В.* Музееведение : основы создания экспозиции : учеб.-метод. пособие / Т. В. Галкина. — Томск : Изд-во ТГПУ, 2004. — 56 с.
3. Исторические экспозиции региональных музеев в постсоциалистический период; отв. ред. И. В. Чувилова. — СПб. : Алетейя, 2009. — 304 с.
4. *Краснова, Е. Л.* Современное экспозиционное пространство музеев Беларуси : коммуникативный аспект : автореф. дис. … канд. культурологии / Е. Л. Краснова; Бел. гос. ун-т культуры и искусств. — Минск, 2012. — 23 с.
5. *Лапцёнак, І. Б.* Трансфармацыя акцэнтаў музейнай палітыкі і праблема ўкаранення прафесійных стандартаў у музейную дзейнасць / І. Б. Лапцёнак // Культура Беларусі : рэаліі сучаснасці : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 12—13 чэрв. 2012 г.); Інстытут культуры Беларусі; рэдкал. : І. І. Крук [і інш.]. — Мінск : ДУА «Інстытут культуры Беларусі», 2012. — С. 374—378.
6. Материалы социологического исследования «Изучить потребительские предпочтения различных социально-демографических групп населения Республики Беларусь на рынке культурных продуктов и услуг» / науч. рук. И. В. Котляров // Институт социологии НАН Беларуси, по заказу Министерства культуры Республики Беларусь. — Минск, 2012.
7. Музей и художник : материалы конф. музейных работников России и выездного семинара Интермузея–2001 (Москва, май—июнь 2001 г.) / ГЦМСИР; отв. ред. Г. К. Ольшевская. — М., 2002. — 119 с.
8. Музейная адукацыя і музейная справа ў Рэспубліцы Беларусь : стан, тэндэнцыі, перспектывы : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф. (Мінск, 24 ліст. 2011 г.) / Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; рэдкал. : М. А. Бяспалая [і інш.]. — Мінск, 2012. — 144 с.
9. Музейное проектирование : сб. ст. / Российский институт культурологии; отв. ред. А. А. Щербакова; сост. А. В. Лебедев. — М., 2009. — 256 с.
10. Пратакол пасяджэння № 8 ад 26.09.2012 г. калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «Аб стане і перспектывах развіцця дзяржаўных музеяў». — Мінск, 2012. — С. 1—9.
11. Словарь музейных терминов : сб. науч. тр.; отв. ред. С. А. Архангелов. — М. : ГЦМСИР, 2010. — 232 с.
12. Тексты в экспозициях музеев исторического профиля : метод. пособие / сост. : Л. И. Арапова, Е. В. Денисова. — М. : ГЦМСИР, 2008. — 47 с.
13. Эффективность музейных экспозиций (выставок) и методика ее измерения : метод. пособие / сост. Г. К. Ольшевская. — М. : ГЦМСИР, 2011. — 20 с.




# Новыя тэхналогіі ў сістэме экспазіцыі: планаванне і ўвасабленне

Сёння выкарыстанне новых інфармацыйных тэхналогій разглядаецца як працяг традыцый інтэрпрэтацыі музейных «інсталяцый», калі наведвальнік не толькі знаёміцца з экспанатамі, але і атрымлівае цікавую для сябе інфармацыю. Такі сучасны ўзровень падачы інфармацыі забяспечвае прадстаўленне большага аб’ёму гіпертэкставай альбо іерархічна арганізаванай інфармацыі, дае магчымасць адначасовай падачы розных тыпаў інфармацыі, паказу музейных прадметаў, якія не выстаўляліся раней.

Дзейнасць любога музея, у тым ліку экспазіцыйная, праз пэўны час патрабуе аналізу і асэнсавання. Папярэдняя экспазіцыя Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы была створана ў 1976 г. і праіснавала больш за 35 гадоў. І хоць за пазначаны час адбылося некалькі мадэрнізацый (у 1995 і 2007 гг.), экспазіцыя фізічна састарэла. Гэта тычылася і ўзроўню абсталявання, і адсутнасці ўвасаблення новых тэхналогій. У выніку было прынята рашэнне аб стварэнні новай экспазіцыі.

Усведамляючы, што музей сам па сабе з’яўляецца даволі кансерватыўным інстытутам, а літаратурны музей кансерватыўны ўдвая, асабліва складаным было пытанне выкарыстання новых інфармацыйных тэхналогій у маналагічнай экспазіцыі, прысвечанай класіку. Мы хваляваліся, як наведвальнік успрыме ўвядзенне мультымедыйных эфектаў, ці не будуць яны перашкаджаць агляду і засваенню матэрыялу. Перажыўшы сумненні, мы адважыліся на эксперымент.

У новай экспазіцыі была пастаўлена фундаментальная задача — скіраваць наведвальніка на інтэлектуальную работу. Для яе вырашэння было прадугледжана стварэнне праекцыйнай музейнай экспазіцыі з дэманстрацыяй відэакліпаў у трохмерным выяўленні (фармаце 3D) у інтэрактыўных зонах і на імправізаванай сцэне, у пірамідальнай шкляной вітрыне для трансляцыі аб’ёмных відарысаў са стварэннем эфекту «аб’ект у сярэдзіне вітрыны» (напрыклад, у тэатральнай зале), інфармацыйных дысплэяў для дэманстрацыі фота- і відэаматэрыялаў у аўтаматычным альбо кіруемым рэжыме з магчымасцю гартання старонак кніг і збрашураваных рукапісаў.

Пачынаецца экспазіцыйны паказ з музейнага інфакіёску, які выконвае шэраг разнастайных функцый — экскурсійную (віртуальныя экскурсіі на аснове сферычных панарам па філіялах музея), экспазіцыйную (архіў былых экспазіцый музея ў розных будынках), дэманстрацыйную (відэаролікі), адваротнай сувязі (кніга водгукаў), сувенірную (фатаграфаванне і выдача «Дыплома наведвальніка»).

Мультымедыйная сістэма прапануе наведвальніку ясныя і яскравыя аповеды па выбраных тэмах, з выкарыстаннем аўдыявізуальнай інфармацыі. Чаргаванне тыпаў інфармацыі адпавядае сучасным тэндэнцыям структурызацыі музейнай прасторы ў адпаведнасці з законамі ўспрыняцця. Для паспяховага выканання сваёй функцыі мультымедыйнае прыстасаванне мае просты карыстальніцкі інтэрфейс, адпаведную форму падачы матэрыялу і зручнае размяшчэнне.

У першай зале, на пачатку экспазіцыйнага паказу, наведвальнікам прапануецца праекцыйная музейная экспазіцыя з дэманстрацыяй у трохмерным выяўленні відэакліпа «Купалле», які мае адметны сэнс у музейнай прасторы.

Іван Луцэвіч нарадзіўся ў містычны час — у купальскую ноч. Малады Луцэвіч узяў псеўданім Янка Купала і, такім чынам, злучыў сябе назаўсёды з адмысловай міфалагічнай сістэмай. Для нас было натуральна прапанаваць наведвальніку мадэляванне экспазіцыйнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прасторы, звязанай з Купаллем. Спецыфіка раскрыцця гэтай тэмы вызначана не столькі музейным прадметам, колькі стратэгіяй яго інтэрпрэтацыі і самастойнага даследавання наведвальнікам. І таму кантэкст у 3D фармаце (гістарычныя падзеі і іх міфалагічны складнік) успрымаецца адэкватна ў рамках музейнай інтэрпрэтацыі.

Мультымедыйнымі сродкамі ў музейным асяроддзі забяспечана рэканструкцыя на розных узроўнях абраду, а разам з ім архаічнага Слова песні, замовы, стаўшага крыніцай натхнення паэта. Функцыянаванне мультымедыйнай культуры ў экспазіцыі забяспечвае адмысловы спосаб мыслення і паводзін наведвальніка, галоўнае адрозненне якога — дзеянні не толькі з прадметна-матэрыяльнымі фарміраваннямі, але і з ідэальна-вобразнымі сутнасцямі, сімвалічнымі формамі, у тым ліку і з міфалагічнай сістэмай. Вакол сімвалічнага вобраза, створанага мультымедыйнымі сродкамі, плануецца ў далейшым распрацоўка інтэрактыўнай адукацыйнай праграмы «У пошуках папараць-кветкі».

Тэхналогіі віртуальнай рэальнасці даюць магчымасць музею арганізаваць высокаэфектыўнае пачуццёвае ўспрыманне, што павышае цікавасць наведвальніка і забяспечвае яго ўключэнне ў экспазіцыю.

Абмежаваная экспазіцыйная прастора не дае магчымасці паказаць усе ўнікальныя матэрыялы, але наяўнасць LCD-панэлей альбо інфармацыйных музейных дысплэяў ва ўсіх залах забяспечвае «пагружэнне» наведвальніка ў экспазіцыйную ідэю кожнага раздзела, дапамагае тлумачыць канцэпцыю.

У першай зале з дапамогай алічбаваных фатаграфій і архіўных дакументаў больш шырока прадстаўлена гісторыя Вязынкі — радзімы паэта, факты жыцця ў маёнтку сям'і Луцэвічаў: фатаграфіі сядзібнага дома, гаспадара Станіслава Замбжыцкага і яго жонкі Алімпіі, якая была таксама хроснай маці старэйшага сына Дамініка і Бянігны Луцэвічаў і брата Янкі Мікалая, які нарадзіўся ў 1881 г. у Вязынцы, як сведчыць запіс у метрычнай кнізе Радашковіцкага касцёла. Адлюстраваны мясціны, дзе працаваў Янка Луцэвіч у 1904—1907 гг.: маёнткі Беліца, Вялікія Бакшты, Сёмкава, Яхімоўшчына.

У другой зале, прысвечанай Віленскаму перыяду жыцця і творчасці Янкі Купалы і Першай сусветнай вайне, LCD-панэль уманціравана ў кніжную шафу змадэляванай інтэр'ернай прасторы Віленскай бібліятэкі «Веды». На экране — нумары газеты «Наша Ніва», віды Вільні пачатку XX ст. З мэтай адлюстравання дзейнасці Янкі Купалы ў час Першай сусветнай вайны быў алічбаваны ўнікальны экспанат, які захоўваецца ў фондах музея, — фотаальбом швагра паэта, Вікенція Станкевіча, пад кіраўніцтвам якога Купала служыў у дарожна-будаўнічым атрадзе Варшаўскай акругі шляхоў зносін. У альбоме захаваліся вельмі цікавыя тагачасныя фатаграфіі, якія яскрава характарызуюць гістарычны кантэкст пачатку XX ст.

Поспех ад выкарыстання мультымедыйных праграм у экспазіцыі залежыць ад разумення пераважнасці і абмежавання мультымедыйных інсталяцый. Канцэпцыя і распрацоўка кантэнту мультымедыйных праграм для наведвальніка разглядалася з узаемадапаўняльных пунктаў гледжання. Для стваральнікаў экспазіцыі было важна, каб мультымедыйная інсталяцыя ўяўляла асобны экспазіцыйны аб'ект, а таксама была функцыянальна-дэкаратыўным элементам. У другой зале яна ідэальна ўпісана ў зону інфармацыйнага (кніжнага — рэальнага і віртуальнага) насычэння экспазіцыйнай прасторы.

У трэцяй зале на дысплэі прадстаўлены ўнікальны экспанат, які немагчыма ў поўнай ступені ацаніць у рэальнай экспазіцыйнай прасторы — рукапісны зборнік Янкі Купалы «Шляхам жыцця» з праўкамі аўтара, старонкі ў электронным выглядзе якога наведвальнік можа пагартаць.

Такім чынам, мультымедыйныя праграмы ў музейнай прасторы дазваляюць наведвальніку атрымаць у значным аб'ёме дадатковыя звесткі (у тым ліку ўнікальнага характару) аб працэсе стварэння Янкам Купалам сваіх паэтычных твораў, асяроддзі паэта, гістарычным кантэксце.



# III. Дакументацыя навуковага праекта

## стацыянарнай экспазіцыі «Шляхі» Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы*

## Картка праекта**

| № | Назвы праектных работ (этапы, мерапрыемствы і інш.) | Змест праектнай дзейнасці, выканаўцы |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| 1. | **Арганізацыйная структура праекта** | |
| | **Праектная каманда:** | |
| | Кіраўнік | *Ляшковіч А. Р.,* дырэктар |
| | Куратар | *Стрыбульская Н. С.,* намеснік дырэктара па навуковай рабоце |
| | *Група па распрацоўцы канцэпцыі праекта:* | |
| | Аўтары навуковай канцэпцыі | *Ляшковіч А. Р.,* дырэктар; |
| | | *Кушаль Г. В.,* загадчык аддзела навукова-экспазіцыйнай і выставачнай работы; |
| | | *Ваданосава Ф. А.,* вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-экспазіцыйнай і выставачнай работы; |
| | | *Плаўская М. І.,* навуковы супрацоўнік аддзела навукова-экспазіцыйнай і выставачнай работы |
| | Аўтары мастацкага рашэння | *Давідовіч А. У.* |
| | Аўтары дадатковых праграм | ТАА *«Digital Device Belarus»* |
| | *Рабочая група па ажыццяўленню праекта:* | |
| | Экспазіцыянеры | *Кушаль Г. В.,* загадчык аддзела навукова-экспазіцыйнай і выставачнай работы; |
| | | *Ваданосава Ф. А.,* вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-экспазіцыйнай і выставачнай работы; |
| | | *Барткова М. М.,* вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-экспазіцыйнай і выставачнай работы |
| | Мастакі (дызайнеры) | *Давідовіч А. У.* |

* Дадзены праект стаў пераможцам рэспубліканскага конкурсу «Музеі Беларусі — трэцяму тысячагоддзю», які праходзіў у рамках Першага нацыянальнага форуму «Музеі Беларусі» (2012 г., намінацыя «Лепшае мастацкае праектаванне экспазіцыі»).

** Форма «Картка праекта» распрацавана аддзелам навукова-метадычнага забеспячэння развіцця музейнай дзейнасці ДУА «Інстытут культуры Беларусі» для выкарыстання музеямі ў практыцы пры планаванні і абагульненні вынікаў праектаў; інфармацыйнае напаўненне карткі праекта ажыццёўлена вучоным сакратаром Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы А. С. Дражынай.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|
| | Супрацоўнікі музейных фондаў | *Саевіч Н. В.,* галоўны захавальнік фондаў;<br>*Сінькевіч С. М.,* вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-фондавай работы;<br>*Краскоўская С. М.,* старшы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-фондавай работы;<br>*Еўменава Л. У.,* старшы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-фондавай работы;<br>*Рашчынскі Дз. А.,* навуковы супрацоўнік аддзела навукова-фондавай работы |
| | Праграмісты (напаўненне кантэнту інфакіёскаў і інш.) | ТАА *«Digital Device Belarus»* |
| | Інжынерна-тэхнічныя службы | *Макутонін У. Я.,* намеснік дырэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце;<br>*Піліпчук А. С.,* вядучы інжынер;<br>*Валошын А. М,* загадчык аддзела матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння |
| | **Эксперты** (у тым ліку рэцэнзенты) | *Васілевіч Г. М.,* дырэктар Дзяржаўнага мемарыяльнага гісторыка-літаратурнага і прыродна-ландшафтнага музея-запаведніка А. С. Пушкіна «Міхайлаўскае», лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расіі, член Прэзідыума Савета па культуры пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі, член Прэзідыума Саюза музеяў Расіі, кандыдат эканамічных навук;<br>*Мушынскі М. В.,* член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар;<br>*Рагойша В. П.*, загадчык кафедры тэорыі літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар;<br>*Бяспалая М. А.,* загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, доктар гістарычных навук, прафесар;<br>*Гужалоўскі А. А.,* прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук;<br>*Азаронак С. І.,* дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны;<br>*Губарэнка В. У.,* дырэктар Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой»; |
| | **Стратэгічныя партнёры** | ТАА *«Digital Device Belarus»* |
| 2. | **Прычыны ініцыяцыі праекта** | Неабходнасць спалучэння класічнай экспазіцыі з сучаснымі інфармацыйнымі і інтэрактыўнымі тэхналогіямі, стварэнне зон «жывой камунікацыі» дзеля забеспячэння камфортнасці наведвальніка і актыўнага суперажывання; пераўтварэнне Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы ў комплексны культурна-адукацыйны і дасугавы цэнтр |
| 3. | **Ідэя праекта** | Стварэнне новай экспазіцыі з улікам апошніх дасягненняў купалазнаўства, музеялогіі і IT-сферы |
| 4. | **Мэта праекта** | Паказ жыцця і творчасці першага народнага паэта Беларусі Янкі Купалы і яго ролі ў гісторыі нацыянальнай літаратуры, культуры, станаўленні беларускай дзяржаўнасці ў нацыянальным, еўрапейскім і сусветным кантэксце |
| 5. | **Унікальнасць праекта** | Выкарыстанне ўнікальных экспанатаў з фондаў музея, пашырэнне экскурсійнага кантэнту праз выкарыстанне IT-тэхналогій, у тым ліку праз віртуальныя туры па купалаўскіх мясцінах, наяўнасць рэкрэацыйнай зоны для дзяцей |





| 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|
| 6. | **Абмежаванні праекта** (час, рэсурсы, змест) | Рэалізацыя праекта разбіта на этапы (адкрыццё 1-й чаргі новай экспазіцыі прымеркавана да 130-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы, 2-й чаргі — да 07.07.2013 г., 3-й чаргі — да 31.12.2013 г.), на распрацоўку і рэалізацыю сродкі фінансавання — рэспубліканскі бюджэт, змест праекта ахоплівае XVII — XXI стст. |
| 7. | **Рызыкі праекта** | Тэхнічны стан будынка, своечасовасць і дастатковасць фінансавання праекта, ступень успрымання наведвальнікам IT-тэхналогій у музейнай экспазіцыі, прысвечанай класіку беларускай літаратуры |
| 8. | **Перадгісторыя праекта** | Стварэнне Літаратурнага музея Янкі Купалы (1944), стацыянарныя экспазіцыі (1960, 1976), мадэрнізацыя стацыянарнай экспазіцыі (1995, 2007), выставачныя праекты «Хлопчык і лётчык», «З сонцам, з сэрцам, з вечнай ласкай…», «Мінск — сталіца, гордасць наша…», «Глянуць будучыне ў вочы…», «Зерне кінутае ў ніву / ўсходзіць ды красуе…» |
| 9. | **Праектныя задачы і метады іх рэалізацыі** | 1. Стварыць лагічна пабудаваную, інфармацыйна насычаную, зразумелую наведвальніку і зручную ў аглядзе экспазіцыю, разлічаную на неаднаразовае наведванне музея людзьмі рознага ўзросту.<br>2. Змяніць канцэптуальныя падыходы да стварэння экспазіцыі з мэтай яе гуманізацыі, набліжэння да чалавека, выкарыстаць інтэрактыўныя прыёмы, экспанаты з мэтай «пагружэння» наведвальніка ў гістарычную сітуацыю.<br>3. Фарміраваць адзіны мастацкі стыль экспазіцыі і музея ў цэлым, што дазволіць, нягледзячы на разнастайнасць падыходаў і рашэнняў, сфарміраваць непаўторны вобраз музея Янкі Купалы.<br>4. Перайсці ад апавядальнага пераказу гістарычных фактаў і падзей да іх гісторыка-культурнага асэнсавання.<br>5. Забяспечыць даступнасць і паўнату ўспрыняцця музейных экспанатаў для самага шырокага кола наведвальнікаў.<br>6. Пашырыць доступ да музейных прадметаў і музейных калекцый.<br>7. Выкарыстоўваць сучасныя мультымедыйныя тэхналогіі з мэтай больш шырокага прадстаўлення інфармацыі.<br>8. Знайсці сучасныя метады стварэння мастацкага вобраза пры захаванні традыцыйных сутнасных падыходаў, характэрных для музея ў яго класічным уяўленні.<br>Пры пабудове новай экспазіцыі выкарыстана сукупнасць метадаў: тэматычны, вобразна-сюжэтны і ансамблевы |
| 10. | **Мэтавыя групы наведвальнікаў** | Для ўсіх узроставых катэгорый |
| 11. | **Інфармацыйнае забеспячэнне праекта** (у структуры экспазіцыі) | Класічныя формы (экспплікацыя, этыкетаж), электронныя сродкі (аўдыя-, відэаінфармацыя, у тым ліку ў трохмерным выяўленні), інфакіёскі з шэрагам функцый — інфармацыйнай, адваротнай сувязі, сувенірнай, дэманстрацыйнай |
| 12. | **Прасоўванне праекта і яго рэкламнае забеспячэнне** (акцыі, музейны сайт і інш.) | Арганізацыя ўрачыстага адкрыцця 1-й чаргі новай экспазіцыі, распрацоўка карпаратыўнага стылю, новага сайта ўстановы, падрыхтоўка сувенірнай прадукцыі ў адпаведнасці з карпаратыўным стылем, інфармацыйная падтрымка на афіцыйным сайце ўстановы і ў СМІ |
| 13. | **Брэнд экспазіцыі** | «Шляхі».<br>Сімвалы: верставыя слупы, папараць уздоўж дарог, графічныя лініі як своеасаблівая часавая шкала, на якой вузельчыкамі пазначаны асноўныя этапы жыцця і творчасці паэта |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|
| 14. | **Прэзентацыйная праграма** | Урачыстая прэзентацыя экспазіцыі: 3 жніўня 2012 г., з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі і Міністэрства інфармацыі, дыпламатычных місій, музеяў, устаноў адукацыі, тэатраў, бібліятэк, навуковых цэнтраў, даследчыкаў творчасці Янкі Купалы, родных паэта, членаў Апякунскага савета Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, журналістаў.<br>**Праграма**<br>17.00 — Прэзентацыя музычных кампазіцый на вершы Янкі Купалы ў выкананні студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі;<br>17.05 — 17.10 Выступленне Міністра культуры Рэспублікі Беларусь П. П. Латушкі;<br>17.10 — 17.15 Выступленне ўнучатай пляменніцы Янкі Купалы Ж. К. Дапкюнас;<br>17.15 — 17.20 Выступленне намесніка старшыні Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, пісьменніка А. І. Бутэвіча;<br>17.20 — 17.25 Дэкламацыя вершаў Янкі Купалы ў выкананні кіраўніка тэатра аднаго акцёра «Зніч» Г. А. Дзягілевай;<br>17.25 — 17.30 Адкрыццё экспазіцыі (пераразанне чырвонай стужкі);<br>17.30 — 17.50 Правядзенне экскурсіі па экспазіцыі, дэманстрацыя 3D-роліка «Купалле», магчымасцей мультымедыйнага абсталявання |
| 15. | **Дадатковыя праграмы праекта** | **У рамках праекта «З Купалам у сэрцы…» арганізаваны і праведзены**<br>• конкурс **«Якім я бачу музей Янкі Купалы»** на лепшы электронны макет (камп'ютарная графіка), лепшы аб'ёмны макет, лепшы эскізны праект экспазіцыі Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы (для вучняў 8—11 класаў);<br>• конкурс **«Мара»** на лепшую аб'ёмную мадэль самалёта, зробленую дзецьмі малодшага школьнага ўзросту (паводле верша Янкі Купалы «Хлопчык і лётчык»);<br>• конкурс **«Чытаем Купалу разам»**, які вызначыў лепшага чытальніка вершаў Янкі Купалы сярод трох узроставых катэгорый (для вучняў малодшага школьнага ўзросту, сярэдніх і старшых класаў) |
| 16. | **Вынікі праекта** | Новая стацыянарная экспазіцыя |
| 17. | **Архіў праекта** | Навуковая канцэпцыя, тэматычная структура, тэматыка-экспазіцыйны план, дызайн-праект, тэхнічная дакументацыя да дызайн-праекта, рэцэнзіі і водгукі, пратаколы пасяджэнняў Навукова-метадычнага савета Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, Рэспубліканскай рады дырэктараў музеяў, Рэспубліканскага навукова-метадычнага савета па пытаннях музейнай справы, палажэнні дадатковых конкурсных праектаў, сцэнарны план адкрыцця экспазіцыі |
| 18. | **Прапановы па тэхналогіі правядзення падобных праектаў у будучым**<br>(запаўняецца пасля завяршэння праекта) | |





# Навуковая канцэпцыя

## Уводзіны

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы — адзін са старэйшых літаратурных музеяў Беларусі, які даследуе, збірае, захоўвае і інтэрпрэтуе спадчыну першага народнага паэта, класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы. Ён генерыруе новыя культурныя веды, заснаваныя на глыбокім усведамленні нацыянальных каранёў і вытокаў. Музей імкнецца быць сапраўдным домам для наведвальнікаў. Пры дапамозе ўнікальных калекцый, разнастайных выставак, адукацыйных праграм і публікацый ён знаёміць з багаццем купалаўскай творчай спадчыны, якая з'яўляецца духоўным стрыжнем і ўвасабленнем лепшых здабыткаў беларускага народа*.

Музей заснаваны 19.05.1944 г. паводле пастановы № 268 СНК БССР і адчынены для наведвання 20.09.1945 г. у адпаведнасці з пастановай № 1139-292 ад 04.08.1945 г. «Аб увекавечанні памяці Янкі Купалы». У 1944 г. месціўся ў Доме прафсаюзаў на плошчы Свабоды, 23, дзе 20 верасня 1945 г. адкрылася першая экспазіцыя, якая знаёміла з жыццём і творчасцю класіка. Да 1962 г. музей уваходзіў у сістэму Акадэміі навук БССР.

З самага пачатку дзейнасць музея скіравана на камплектаванне матэрыялаў і прадметаў музейнага значэння з мэтай фарміравання пастаяннага музейнага збору, стварэння экспазіцый і выставак, правядзення навукова-даследчай работы, звязанай з жыццём і творчасцю класіка беларускай літаратуры. Важна адзначыць, што з першых дзён існавання музея ставілася задача зрабіць яго не толькі месцам захавання памяці паэта, але і рэтранслятарам духоўных каштоўнасцей усяго беларускага народа.

Асноўным напрамкам дзейнасці на этапе станаўлення было фарміраванне калекцый. Аднак арыентацыя на задачы камплектавання не азначала самаізаляцыю музея ад грамадства, хутчэй наадварот, музей развіваўся як адкрытая для знешняга ўзаемадзеяння сістэма. Прадметы музейнага значэння, рукапісы Купалы, дакументы адшукваліся на ўсёй тэрыторыі тагачаснага Савецкага Саюза: у Маскве, Ленінградзе, Вільнюсе, Днепрапятроўску і іншых месцах. Да пошуку далучаліся сваякі паэта, пісьменнікі і грамадскія дзеячы, архіўныя і музейныя работнікі. Усё гэта характарызавала музей Янкі Купалы як установу з выразна акрэсленай арыентацыяй на цесны кантакт з яго сацыяльным акружэннем. Музей вызначаўся імкненнем далучыць да сваёй дзейнасці як мага больш саюзнікаў і партнёраў. У гэтых рысах, закладзеных на пачатку існавання музея, можна бачыць перадумовы

* У 2012 годзе калектыў музея быў узнагароджаны Спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтваў за вялікую працу па захаванні і папулярызацыі літаратурнай спадчыны Янкі Купалы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

яго эвалюцыі. Устаноўка Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы на адкрытасць для шырокага сацыяльнага ўзаемадзеяння — гэта традыцыя, якая фарміравалася на розных этапах музейнай гісторыі, а таксама падтрымліваецца і сёння.

Летам 1949 г. была прынята пастанова Савета Міністраў БССР аб пераводзе музея Янкі Купалы ў асобны будынак па вул. Энгельса, 27, а ў маі 1951 г. тут створана стацыянарная музейная экспазіцыя, якая прадэманстравала матэрыялы, сабраныя падчас Вялікай Айчыннай вайны і ў першыя пасляваенныя гады. Экспазіцыя атрымалася дастаткова схематычнай і ілюстрацыйнай, насіла больш асветніцкі, чым навуковы характар, і адпавядала тагачаснаму ідэалагічнаму ўзроўню. Патрабавалася паказаць тыя творы Янкі Купалы, якія падкрэслівалі б моц і неператможнасць савецкай улады, услаўлялі сацыялістычную рэчаіснасць. Разам з тым, у экспазіцыю ўключаны і дакументальныя матэрыялы, якія ў значнай меры шырока раскрывалі перад наведвальнікам жыццёвы і творчы шлях Янкі Купалы.

Пастановай Савета Міністраў БССР ад 04.08.1945 г. было вырашана ўзвесці для музея Янкі Купалы асобны будынак. Прэзідыум АН БССР сумесна з музеем і прадстаўнікамі архітэктурнага ўпраўлення г. Мінска правялі конкурс на лепшы праект будучага дома-музея, у якім прынялі ўдзел член-карэспандэнт АН БССР А. Т. Воінаў, архітэктары І. І. Валадзько і І. К. Елісееў. Камісія пад кіраўніцтвам Якуба Коласа лепшым вызначыла праект І. І. Валадзько. Аднак толькі ў 1956 г. будаўніцтва яго было ўключана ў генеральны план забудовы г. Мінска. Месца пад музей было выбрана невыпадкова, а менавіта там, дзе да вайны стаяў аднапавярховы драўляны дом паэта. Побач з музеем планавалася ўзвесці альтанку, гараж для машыны і павільён для экспанавання машыны «Шэўрале», якую падараваў паэту ўрад БССР (будаўніцтва апошніх аб’ектаў пасля было забаронена).

9 лістапада 1959 г. музей пераехаў у спецыяльна пабудаваны для яго будынак па вуліцы Янкі Купалы, дзе 18 мая 1960 г. была ўрачыста адкрыта новая экспазіцыя. Яна стваралася пры непасрэдным удзеле У. Ф. Луцэвіч, пісьменнікаў К. Крапівы, М. Лынькова, П. Глебкі, П. Броўкі. Тэматыка-экспазіцыйны план экспазіцыі абмяркоўваўся ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР і ў Інстытуце сусветнай літаратуры імя М. Горкага АН СССР.

Існуючая экспазіцыя Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы створана ў 1976 г. па праекце Э. Агуновіча, вядомага мастака і дызайнера, творчую групу экспазіцыянераў узначальвала Ж. К. Дапкюнас. На пачатку 1990-х гг. экспазіцыя была мадэрнізавана.

Перамены, якія перажывала грамадства, далі магчымасць па-новаму паглядзець на творчую спадчыну Янкі Купалы, а дакладней, гэты час адкрыў шмат невядомага пра літаратурную і грамадскую дзейнасць паэта.

З паступленнем раней невядомых матэрыялаў і дакументаў паўстала пытанне аб стварэнні раздзелаў экспазіцыі, якія адлюстроўвалі б сапраўдную сутнасць творчай спадчыны Купалы. Таму ў 1995 г. навукова-экспазіцыйным аддзелам была распрацавана тэматычная структура новых раздзелаў экспазіцыі, у якую ўвайшлі тэмы, што раскрывалі малавядомыя старонкі дзейнасці песняра ў 20—40 гг. XX ст. (смаленскі перыяд, пабудова дзяржаўнасці Беларусі, гады сталінскіх рэпрэсій).

Трэба адзначыць, што доўгія гады тэма трагічнай смерці паэта замоўчвалася і амаль не была паказана ў экспазіцыі музея. У апошнія дзесяцігоддзі ў друку з’явілася шмат публікацый і даследаванняў пра смерць паэта, пра яго жыццё і творчасць у гады вайны. У 2003 г. па ініцыятыве музея і пры дапамозе Пасольства Рэспублікі Беларусь у г. Маскве ў фонды паступілі фрагменты інтэр’ера пакоя № 414, вестыбюля і хола гасцініцы «Масква», дзе Янка Купала правёў апошнія дні свайго жыцця. Таму да 125-гадовага юбілею паэта і 65-годдзя з дня яго смерці быў створаны новы тэматычны раздзел экспазіцыі «Жыццё і творчасць Янкі Купалы ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Таямніца смерці», які праз экспазіцыйныя комплексы і ўнікальныя экспанаты расказвае аб апошніх дзесяці днях жыцця песняра.

Стацыянарная экспазіцыя Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы адносіцца да тыпу класічных. Да сённяшняга часу яна не страціла сваёй навуковай і мастацкай вартасці, запатрабавана рознымі катэгорыямі наведвальнікаў, але наспела патрэба стварэння новай экспазіцыі з выкарыстаннем сучасных інфармацыйных і інтэрактыўных тэхналогій, зон «жывой камунікацыі», без якіх немагчыма дакрануцца да кантэнту творчасці пісьменніка (тэксту) і дабіцца суперажывання яго наведвальнікамі. Ёсць і іншы бок гэтай праблемы. Па словах Т. Палякова, аўтара экспазіцыі музея У. Маякоўскага ў г. Маскве, якімі геніяльнымі ні былі б музейныя інсталяцыі, наступае непазбежнае стамленне, прадметна-мастацкае асяроддзе здаецца аднабаковым, цяжкім[1]. У кожным сучасным музеі наспявае неабходнасць стварэння спецыяльных рэкрэацыйных паўз у час экспазіцыйнага агляду, якімі і могуць стаць так званыя зоны «жывой камунікацыі».

Задачы, якія сёння стаяць перад музеем, вызначаюцца не толькі станам музейнай навукі, але і ўзроўнем развіцця новых музейных і інфармацыйных тэхналогій, дызайну, запатрабаванняў наведвальнікаў. Рэаліі патрабуюць распрацоўкі новых форм работы з аўдыторыяй. Сусветная практыка паказвае, што сучасны музей усё больш ператвараецца ў комплексны культурна-адукацыйны і дасугавы цэнтр, які павінен забяспечыць задавальненне шырокага спектра інтэлектуальных і духоўных патрэб грамадства. Гэтым музей спрыяе рэалізацыі артыкула 51 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь аб праве кожнага на ўдзел у культурным жыцці.

Пры падрыхтоўцы дадзенай канцэпцыі былі разгледжаны тыя аспекты гістарыяграфіі, без ведання якіх пабудова экспазіцыі як цэласнага твора немагчыма і якія павінны спрыяць абгрунтаванню яе асноўных тэм, структурных элементаў, акрэсліць лініі важнейшых экспазіцыйных сувязей музейных прадметаў. Таму, перш за ўсё, быў вывучаны стан тэарэтычных праблем, як у галіне сучаснага беларускага літаратуразнаўства і купалазнаўства, так і ў галіне музеязнаўства ў цэлым.

Праект з'яўляецца адлюстраваннем скрупулёзнага вывучэння крыніц, навуковых і практычных дасягненняў у галіне музейнай справы Рэспублікі Беларусь і замежных краін, уласнай практыкі і вопыту работы аналагічных музейных структур.

Канцэпцыя ставіць задачу стварэння экспазіцыі, якая найбольш поўна і аб’ектыўна адлюстроўвае жыццё і творчасць першага народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Яна з’яўляецца неад’емнай часткай мадэрнізацыі музея і прадугледжвае далейшы пошук новых падыходаў як у навуковым змесце, так і ў вобразна-мастацкім рашэнні.

[1] *Поляков, Т.* Мифология музейного проектирования, или Как делать музей? / Т. Поляков // Рос. ин-т культурологии. — М., 2003.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



1-я зала. Тэма: «Роднай нівы я мільённая часціна… Вытокі»



Фатаграфія Янкі Купалы
з жонкай У. Луцэвіч. 1916 г.

2-я зала. Рэканструкцыя рабочага месца Янкі Купалы
ў бібліятэцы «Веды» ў Вільні



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



3-я зала. Рэканструкцыя пакоя Янкі Купалы на кватэры Б. Эпімаха-Шыпілы ў Санкт-Пецярбургу



2-я зала. Тэма: «Вольня ў жыцці і творчасці Янкі Купалы»

1-я зала. Тэма: «Пачатак літаратурнага шляху: ад “Северо-Западного края” да “Нашай Нівы”»





Праект помніка.
Янка Купала ў Маскве.
Аўтары: Л. Гумілеўскі і С. Гумілеўскі



1-я зала. Радавод Луцэвічаў герба «Навіна»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



1-я зала. Тэма: «Роднай нівы я мільённая часціна… Вытокі».
Праекцыя відэакліпа «Купалле» ў фармаце 3D

Інтэрфейс многафункцыянальнай прылады. Галоўная старонка




РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

## Асноўныя мэты і задачы экспазіцыі

Апошнія дзесяцігоддзі пры мадэрнізацыі існуючых і стварэнні новых раздзелаў экспазіцыі музея былі перагледжаны некаторыя канцэптуальныя падыходы як у змесце, так і ў спосабах рэалізацыі экспазіцыйных задумак: імкненне даць аб'ектыўнае ўяўленне пра жыццё і творчасць Янкі Купалы, далучэнне матэрыялаў па закрытых тэмах, уключэнне ў навуковы зварот новых, раней недаступных крыніц. Пры адборы экспазіцыйнага матэрыялу перавага аддавалася арыгіналам, экспанатам з высокім узроўнем атрактыўнасці.

Вызначальным прынцыпам навуковай канцэпцыі новай экспазіцыі музея Янкі Купалы з'яўляецца погляд на яе структуру як на комплексную, шматфункцыянальную, навукова-мастацкую. Распрацоўшчык навуковай канцэпцыі экспазіцыі і мастак (дызайнер), які складае яе мастацкую канцэпцыю, з'яўляюцца раўнапраўнымі ўдзельнікамі адзінага працэсу і выступаюць ў дыялогу ўжо з самага пачатку падрыхтоўкі экспазіцыі.

*Асноўнай мэтай экспазіцыі з'яўляецца паказ жыцця і творчасці першага народнага паэта Беларусі Янкі Купалы ва ўзаемасувязі з гістарычным і культурным развіццём краіны і яго ролі ў гісторыі нацыянальнай беларускай літаратуры, культуры, станаўленні беларускай дзяржаўнасці, а таксама ў еўрапейскім кантэксце.*

Улічваючы, што асноўная частка наведвальнікаў прыходзіць у літаратурны музей не проста дзеля атрымання інфармацыі, а па эмацыянальныя перажыванні, аўтары навуковай канцэпцыі мэтанакіравана імкнуцца стварыць арыгінальнае навукова-мастацкае апавяданне, якое мае сваю драматургію з інтрыгай, кульмінацыяй, развязкай, эфектамі здзіўлення і нечаканасці. У той жа час яны імкнуцца дасягнуць максімальна магчымай інфармацыйнай напоўненасці экспазіцыі, здольнай задаволіць рознабаковыя запатрабаванні наведвальнікаў.

Галоўныя задачы, якія неабходна вырашыць у працэсе стварэння экспазіцыі:

1. Змяніць канцэптуальныя падыходы да стварэння экспазіцыі з мэтай яе гуманізацыі, набліжэння да чалавека, выкарыстаць інтэрактыўныя прыёмы, экспанаты з мэтай «пагружэння» наведвальніка ў гістарычную сітуацыю.
2. Перайсці ад апавядальнага пераказу гістарычных фактаў і падзей да іх гісторыка-культурнага асэнсавання.
3. Стварыць лагічна пабудаваную, зразумелую наведвальніку і зручную ў аглядзе экспазіцыю, з узаемазвязанымі раздзеламі.
4. Забяспячыць даступнасць і паўнату ўспрыняцця музейных экспанатаў для самага шырокага кола наведвальнікаў.
5. Стварыць інфармацыйна насычаную, шматузроўневую экспазіцыю, разлічаную на неаднаразовае наведванне музея людзьмі рознага ўзросту.
6. Пашырыць доступ да музейных прадметаў і музейных калекцый.
7. Выкарыстоўваць сучасныя мультымедыйныя тэхналогіі з мэтай большага прадстаўлення інфармацыі.
8. Знайсці сучасныя метады стварэння мастацкага вобраза пры захаванні традыцыйных, сутнасных падыходаў, характэрных для музея ў яго класічным уяўленні.
9. Сфарміраваць адзіны мастацкі стыль экспазіцыі і музея ў цэлым, што дазволіць, нягледзячы на шматлікасць падыходаў і рашэнняў, стварыць непаўторны вобраз музея Янкі Купалы.

Рысамі вышэйназванага стылю стануць адносіны да музея як да храма купалаўскай спадчыны, захаванне лепшых класічных традыцый у афармленні ўсіх інтэр'ераў музея, яго рэкламнай прадукцыі, брэндаў, атмасферы гасціннасці і ўвагі да наведвальніка. Стыль экспазіцыі дыктуе наяўнасць арыгінальных экспанатаў, рарытэтаў, апраўданае ўключэнне тыражаваных матэрыялаў і копій, уважлівыя адносіны да экспаната-рарытэта і магчымасць «пагружэння» ў гістарычнае акружэнне шляхам інтэрактыўных прыёмаў, а таксама фарміраванне пэўнага мастацкага вобраза, непаўторнай адметнасці музейнай прасторы.

Канцэпцыя створана на аснове гісторыка-храналагічнага і праблемнага падыходаў з выкарыстаннем метадалагічнай базы, аснову якой склалі прынцыпы гістарызму і аб'ектыўнасці, гуманізму, мультыдысцыплінарнага падыходу ў адлюстраванні жыцця і творчасці Янкі Купалы. Пры стварэнні канцэпцыі выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя метады (аналізу і сінтэзу), так і спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-сістэмны, гісторыка-параўнальны).

Галоўная ідэя новай экспазіцыі — паказаць Янку Купалу як генія нацыянальнай літаратуры, духоўнага бацьку нацыі, паэта-прарока, паэта-філосафа, які сваёй творчасцю выхоўваў свядомасць беларускага народа і арганічна ўпісваўся ў еўрапейскае культурнае асяроддзе.

Асноўная тэма, якая пройдзе праз усю экспазіцыю — тэма «Шляхі». Шляхі паэта па Беларусі і да Беларусі, па Еўропе і Расіі. Шляхі як імкненне Янкі Купалы ў будучыню, як спасціжэнне жыцця, як філасофскае асэнсаванне вечнай праўды быцця.

Экспазіцыя ахоплівае перыяд з XVII ст. — пачатак гісторыі роду Луцэвічаў — па сённяшні дзень. Дыялог паміж мінулым, сучаснасцю і будучыняй раскрываецца праз жыццё і творчасць паэта.

У новай экспазіцыі ўпершыню будуць раскрыты такія тэмы, як шляхецкае паходжанне Янкі Купалы (праз архіўныя матэрыялы і дакументы), «Янка Купала — першы стваральнік санетаў у сучаснай беларускай паэзіі», «Касмічныя матывы ў паэзіі Янкі Купалы, як «важнейшая грань яго таленту, выяўленне творчай інтуіцыі і глыбіннага душэўнага вопыту»[2], «Мінск — родны горад паэта», «Стан і развіццё беларускага і замежнага купалазнаўства ў канцы XX і першым дзесяцігоддзі XXI ст., у тым ліку ў беларускай эміграцыі».

Будучая экспазіцыя ставіць перад сабой задачу скіраваць наведвальніка на інтэлектуальную работу, каб пасля азнаямлення з экспанатамі ўзнікала патрэба шукаць адказы на пытанні, пастаўленыя ў раздзелах і тэмах. Для дасягнення гэтага мяркуецца ўвядзенне элементаў інтэрактыўнасці і мемарыяльнасці (рэканструкцыя асобных інтэр'ераў), выкарыстанне новых інфармацыйных тэхналогій, а таксама прымяненне ўсіх відаў экспліканый, у тым ліку ўказальнікаў-піктаграм з тэкстамі на замежных мовах.

Пры пабудове новай экспазіцыі будзе выкарыстана сукупнасць такіх экспазіцыйных метадаў, як тэматычны, вобразна-сюжэтны і ансамблевы. Экспазіцыйныя матэрыялы (рукапісы, друкаваныя выданні, дакументы, гістарычныя матэрыялы, рэчы часу, мемарыяльныя рэчы, фотаздымкі, мастацкія творы) пажадана паказаць у большай ступені

[2] *Гніламёдаў, У.* Янка Купала. Новы погляд / У. Гніламёдаў. — Мінск, 1995. — С. 50.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нетрадыцыйна, вобразна-пpасторава, аб'ёмна, што вымагае нестандартнага экспазіцыйнага абсталявання з выкарыстаннем сучасных тэхналогій. Для захавання ўнікальных музейных прадметаў неабходна зрабіць іх якасныя муляжы, макеты, копіі, і ў першую чаргу — пісьмовых крыніц (рукапісаў, фотаздымкаў, дакументаў, часопісаў, газет і інш.).

Прапануем наступную структуру будучай экспазіцыі. Яна будзе складацца з 5-і раздзелаў, якія ўключаюць шэраг тэм і падтэм.

## 1 раздзел. «Роднай нівы я мільённая часціна...» Вытокі

Галоўная ідэя раздзела — карані і шляхі роду Луцэвічаў, як і ў далейшым сцежкі, дарогі і шляхі самога паэта. Час, доля, выбар шляху, сам шлях.

*Асноўныя тэмы раздзела:*

1.1. «Ад вытокаў радаводных (XVII — XIX стст.)»;
1.2. «Нараджэнне будучага паэта. Ясевы «ўніверсітэты»;
1.3. «Пачатак літаратурнага шляху (ад “Северо-Западного края” да “Нашай нівы”)».

Сваё адметнае вырашэнне знойдзе экспазіцыйны вобраз радаводу, у сувязі з чым цэнтральным экспанатам становіцца мастацкая рэканструкцыя «Генеалагічнае дрэва Луцэвічаў».

Уведзеная ў экспазіцыйную прастору канструкцыя часткі зруба хаты як сродак функцыянальна-дэкаратыўнага аздаблення будзе сімвалізаваць цеплыню і шчырасць дома, жылля, бытавых рэчаў — прасторы, дзе жылі родзічы юнага Яся Луцэвіча.

Моцны акцэнт у раскрыцці тэмы ставіцца на стварэнне сімвалічнага вобраза свята «Купалле», бо ў гэты дзень нарадзіўся Ясь Луцэвіч. Найбольш яркія і візуальна значныя сімвалы гэтага свята — Папараць-кветка, Сонца, Кола — знакі сонечнага і жыццёвага колазвароту. Галоўны вобраз павінен з'яднаць стройную сістэму экспазіцыйна-мастацкіх комплексаў. Вакол сімвалічнага арт-аб'екта, які ўвасабляе старажытнае баство і стане цэнтрам экспазіцыйнай прасторы, магчыма фарміраваць шырокую палітру інтэрактыўных адукацыйных праграм пад агульнай назвай «У пошуках папараць-кветкі». Не толькі экспанатамі, але і жывапісна-графічнымі сродкамі неабходна пазначыць асноўныя сімвалы Купалля, з мэтай адказу на пытанне: «Чаму Ясь Луцэвіч узяў сабе менавіта такі псеўданім “Янка Купала”?».

На стыку некалькіх вобразаў паўстане экспазіцыйны твор, суадносны з творчасцю Янкі Купалы і непасрэдна звязаны з паняццем «Вытокі».

Значэнне кожнага комплексу прадметаў, іх інфармацыйная каштоўнасць будзе каментавацца фрагментамі мастацкага тэксту.

Я не паэта, о крый мяне Божа!
Не рвуся я к славе гэткай німала,
Хоць песеньку-думку і высную можа,
Завуся я толькі — Янка Купала.
*(«Я не паэта»)*

Перад мастацкай канцэпцыяй раздзела стаіць задача — увасобіць і сімвалічна падкрэсліць шляхі продкаў паэта, самога песняра, і ў цэлым падаць вобраз Беларусі таго часу праз творчасць паэта, які толькі пачынаў свой жыццёвы і літаратурны шлях.





## 2 раздзел. «Я буду маліцца і сэрцам, і думамі...» Нараджэнне класіка (1908—1928)

Раздзел прысвечаны асэнсаванню Беларусі як незалежнай дзяржавы ў творах паэта, значэнню асобы Янкі Купалы як духоўнага бацькі нацыі. Гэта плануецца прасачыць як па яго творах, так і па варунках яго жыцця.

Ты жыў, ты панаваў у краі родным,
Сцярог ад чужака й законы укладаў;
Звон вечавы сход склікаваў народны,
І сход аб шчасці Бацькаўшчыны дбаў.
*(«Свайму народу»)*

У раздзеле раскрываюцца нацыянальная ідэя і канцэпцыя незалежнасці Беларусі Янкі Купалы (Вільня — Санкт-Пецярбург — Мінск), яго творы — «А хто там ідзе», «Маладая Беларусь», «Паўстань», публіцыстыка 1918—1920 гг., «Перад будучыняй».

*Асноўныя тэмы раздзела:*

2.1. «Вільня ў жыцці і творчасці Янкі Купалы»;
2.2. «Шматграннасць паэтычнага генія Янкі Купалы»;
2.3. «Янка Купала — пачынальнік сучаснай беларускай драматургіі і тэатра».

Вядомы беларускі філосаф і літаратуразнаўца У. Конан адзначаў[3]: «Творчасць Янкі Купалы — няспынны мастацкі кліч, звернуты да беларуса, нацыі, да Сусвету…»

На фоне гісторыі краіны, жыцця нацыянальнай інтэлігенцыі і ўсяго беларускага народа будуецца навуковая і мастацкая канцэпцыі раздзела.

Праблемы дзяржаватворчасці і нацыянальнай ідэі ў паэзіі, драматургіі і публіцыстыцы Янкі Купалы ў апошняе дзесяцігоддзе распрацоўваліся даследчыкамі, агучваліся на Міжнародных канферэнцыях — Купалаўскіх чытаннях. У новай экспазіцыі гэтыя тэмы праз яго творчасць даследуюцца ўпершыню.

Тры гістарычна-аб'ектыўныя фактары — мова, нацыя, дзяржава — складаюць базавую аснову нацыянальнай ідэі. «Нацыя, мова, дзяржаўнасць ляжаць у аснове свабоднага развіцця кожнага этнасу, а таксама фармулявання і ўсведамлення грамадскай думкай Нацыянальнай ідэі. Гэта закон развіцця грамадства кожнай нацыі і народа ў прасторы і часе»[4].

У новай экспазіцыі стаіць задача паказаць, як фарміраваліся вышэйпазначаныя фактары ў творчасці Янкі Купалы, і як сваёй творчасцю паэт-прарок, паэт-філосаф, паэт-грамадзянін выхоўваў самасвядомасць у беларускага народа.

Ты зжылося з намі, бацькаўскае слоўца,
Як бы корань з дрэвам, як бы з небам сонца;
Дзеліш з намі вечна ўсё, што з намі ходзе
У благой і добрай мачысе-прыгодзе…
…Як жыло ты з намі — будзеш вечна жыці,
Грамадой мільёнаў з светам гаманіці…
*(«Роднае слова»)*

[3] *Конан, У.* Дантэ і Янка Купала : матывы раю і пекла // Янка Купала і праблемы беларускага самапазнання : V Міжнародныя Купалаўскія чытанні — навук. канф. (г. Мінск, 7—8 снежня 2000 г.). — Мінск, 2002. — С. 145.
[4] *Слука, А.* Нацыянальная ідэя / А. Слука. — Мінск, 2008. — С. 73.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Экспазіцыйнымі сродкамі паказваецца лёс беларускай мовы — ад часоў Вялікага Княства Літоўскага, Статута ВКЛ, напісанага старажытнай беларускай мовай, праз тэматычныя творы Янкі Купалы — да сённяшняга дня. Гэта старажытныя выданні — сведчанні гістарычнасці беларускай мовы, кнігі і творы Янкі Купалы аб роднай мове і сучасныя дакументы аб дзяржаўнасці беларускай мовы. Прапануецца выкарыстанне мультымедыйных тэхналогій для паказу матэрыялаў па вышэйадзначанай тэме.

Немагчыма ўявіць творчасць паэта без гістарычных падзей таго часу, без рэалій яго жыцця. У экспазіцыі будуць паказаны гарады Вільня, Пецярбург, Мінск, у якіх, у асноўным, жыў Купала, адлюстраваны актыўны ўдзел паэта ў нацыянальным друку, сустрэчы з вядомымі асобамі як ў розных кутках Беларусі, так і па-за яе межамі.

Мультымедыйныя сродкі дазваляць візуальна наведаць кожны з гэтых гарадоў, уявіць Купалу і асяроддзе таго часу.

У экспазіцыйную прастору ўводзіцца рэканструкцыя часткі інтэр’ера віленскай бібліятэкі «Веды», а таксама мультымедыйная бібліятэка (прыжыццёвыя выданні твораў, у тым ліку з аўтографамі паэта).

Прарок Адраджэння, стваральнік канцэпцыі незалежнасці Беларусі, нацыянальнай ідэі — такім павінен паўстаць Янка Купала ў новай экспазіцыі.

Драматычныя калізіі жыцця Янкі Купалы, беларускага народа, нацыянальнай інтэлігенцыі вымагаюць складанага шматпланавага мастацкага вобраза.

Дадзеная тэма ўпершыню распрацоўваецца ў экспазіцыі і арганічна спалучаецца з тэмай узаемаадносін паэта з уладай.

Другая тэма раздзела раскрывае шматграннасць паэтычнага генія Янкі Купалы, пераемнасць традыцый сусветнай літаратуры і актуальнасць яго творчасці ў XXI ст.

Санетарый, рамантычная, філасофская, грамадзянская, пейзажная, інтымная лірыка паэта, яго эпічныя творы. Касмізм, хрысціянскія і язычніцкія матывы ў творчасці Купалы, наследаванне традыцый сусветнай і еўрапейскай літаратуры. «Жалейка» — «Гусляр» — «Шляхам жыцця».

У экспазіцыйнай прасторы застанецца рэканструкцыя часткі інтэр’ера пакоя Янкі Купалы ў Санкт-Пецярбургу.

Упершыню ў новай экспазіцыі разглядаюцца санеты Янкі Купалы як адметная старонка творчага лёсу песняра, аўтара 22 санетаў, пачынальніка санетапісання ў беларускай літаратуры:

І ў даль сягну, дзе толькі можа сягнуць вока,
І скрозь туды, дзе вольнай думкаю дастану…
*(«Сярод магіл»)*

Янка Купала — творца глыбокага лірычнага дару, рамантызму, грамадзянскага пафасу, абагульнена-філасофскага ўспрымання жыцця. Яго творчасць ахапіла існаванне чалавека ў шырокай прасторы і часе ва ўзаемаадносінах са светам і космасам.

Касмізм Янкі Купалы, як «балючае рэагаванне на трагічную алагічнасць жыцця і паэтычная мадэль светапабудовы, якая павінна даць чалавеку схрон і ахову ад зла і безвыходнасці, якія акружаюць яго сярод зямной юдолі»[5]. Еднасць хрысціянства і язычніцтва, іх узаемапранікнёнасць і значнасць у жыцці і творчасці Янкі Купалы паказаны праз Сусвет, агульначалавечыя каштоўнасці, супрацьпастаўленне дабра і зла, праз сваё і чужое, лёсы людзей:

Зямлі і сонцу нізка пакланюся —
Я сын зямлі і сонца, вольны сын!
Як з братам, з ветрам шчыра абымуся —
Я — ветру, а мне вецер друг адзін…
…Душы дам волю, заручуся з песняй —
Душа і песня — свет мой, скарбы ўсе мае…
*(«Вечар»)*

Паэтычнае ўвасабленне ідэі духоўнага адзінства з роднай зямлёй, з Бацькаўшчынай, маленне за лепшую долю яскрава выявілася ў праграмным вершы Янкі Купалы «Мая малітва» (1906, 1912). Дыялог з небам, зямлёй, са сваім народам прайшоў праз усё жыццё і творчасць паэта, — і гэта галоўная накіраванасць новай экспазіцыі музея.

Малюся я небу, зямлі і прастору,
Магутнаму Богу — Ўсясвету малюся,
Ва ўсякай прыгодзе, ва ўсякую пору
За родны загон Беларусі.
*(«Мая малітва», 1912)*

Сувязь Янкі Купалы з сусветнай і еўрапейскай літаратурай плануецца паказаць, перш за ўсё, праз творчасць А. Пушкіна, А. Міцкевіча, Т. Шаўчэнкі, М. Някрасава, М. Лермантава, якіх ён перакладаў і ў якіх вучыўся. Нашчадак традыцый сусветнай літаратуры — рамантычнай паэзіі Ю. Славацкага, мадэрнісцкай драматургіі С. Выспянскага і С. Пшыбышэўскага, творчасці В. Шэкспіра, Дж. Г. Байрана, У. Гётэ, Ф. Шылера, Г. Гауптмана, Г. Ібсена, К. Гамсуна і інш.

«Жалейка» — «Гусляр» — «Шляхам жыцця» (1908—1910—1913). Тэма прысвечана першым тром зборнікам Янкі Купалы, якія былі выдадзены ў Пецярбургу.

Асноваю мастацкага вобраза тэмы «Шматграннасць паэтычнага генія Янкі Купалы» могуць стаць краявіды Беларусі і Акопаў, творчай калыскі паэта, — магутныя дубы, камень-валун, зямля, неба, сонца, зоркі — як сімвалы яго паэзіі. Тэму «Акопы» плануецца эмацыянальна ўзмацніць выкарыстаннем рэліквіі — бронзавага падсвечніка з дома маці ў Акопах.

Плануецца матэрыял размясціць у асобнай зале і дапоўніць панарамай Санкт-Пецярбурга таго часу з захаваннем інтэр’ера пакоя, у якім жыў Янка Купала.

Будуць выкарыстаны інфакіёскі (альбо лічбавыя фотарамкі), каб паказаць рукапісы, фотаздымкі сяброў і паплечнікаў паэта, сучасныя віды Акопаў.

Трэцяя тэма «Янка Купала — пачынальнік сучаснай беларускай драматургіі і тэатра» — адна з самых значных, як у экспазіцыйнай прасторы, так і ў жыцці і творчасці беларускага песняра, у гісторыі нацыянальнага сцэнічнага мастацтва. Янка Купала стаяў ля вытокаў нацыянальнай драматургіі, стварэння і развіцця беларускага тэатра. Літаратуразнаўца П. Васючэнка адзначае: «…Купалаўская драматургія да нядаўняга часу вольна ці міжвольна разглядалася пасля лірыкі, што надавала п’есам Купалы адценне другаснасці. Паміж тым драматургію Купалы трэба разглядаць не пасля, а поруч

[5] *Гніламёдаў,* У. Янка Купала. Новы погляд / У. Гніламёдаў. — Мінск, 1995. — С. 49—50.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з паэзіяй, у кантэксце агульнага паэтавага светапогляду, эстэтыкі. Тэатр Купалы не ў меншай ступені, чым ягоная лірыка, папоўніў скарбніцу еўрапейскай і сусветнай культуры значнымі творамі»[6].

Задача другога раздзела — паказаць ролю Янкі Купалы ў станаўленні і развіцці беларускага тэатра, арыгінальнасць і неўміручасць яго драматычных твораў.

Канцэпцыя гэтай часткі экспазіцыі, яе тэматыка, сэнс заключаны ў выказванні Максіма Гарэцкага, сучасніка Купалы: «Тэатр наш павінен стаць Храмам нашага Адраджэння».

Стварэнне арыгінальнага цэласнага твора эспазіцыйнага мастацтва немагчыма без звароту да такіх постацей і з'яў, як І. Буйніцкі, Беларускі музычна-драматычны гурток у Вільні, навукова-літаратурны гурток беларускіх студэнтаў пры Санкт-Пецярбургскім універсітэце, Першае таварыства драмы і камедыі, стварэнне нацыянальнага тэатра.

Камедыя, драма, сцэнічны жарт, трагічна-смяшлівыя сцэнкі — п'есы Янкі Купалы як адлюстраванне тагачаснага жыцця беларусаў, яго імкненне да духоўнага выхавання народа. Разнастайнасць драматургічнага таленту пісьменніка (1912—1926).

Творы Янкі Купалы (драматычныя паэмы і п'есы) на тэатральнай сцэне ў 2-й палове ХХ — пач. ХХІ ст. (часткова мультымедыйны паказ).

Экспазіцыйны вобраз стане найбольш арганізаваным пры стварэнні ўмоўнай тэатральнай сцэны для прадстаўлення сцэнічных касцюмаў і правядзення камерных мерапрыемстваў.

За гады існавання музея сабрана вялікая колькасць матэрыялаў для ўвасаблення гэтай тэмы і ў экспазіцыйнай прасторы: рукапісы, друкаваныя выданні п'ес, у тым ліку і прыжыццёвыя, фотаздымкі сцэн са спектакляў, эскізы дэкарацый і сцэнічных касцюмаў да тэатральных пастановак, макеты і інш. Частка з іх экспануецца ў экспазіцыях музея і яго філіялах, выкарыстоўвалася ў выстаўках. Упершыню будуць прадстаўлены сцэнічныя касцюмы артыстаў розных пакаленняў і цікавыя, каштоўныя матэрыялы з асабістых архіваў выканаўцаў ролі Паўлінкі — П. Мядзёлкі і Р. Кашэльнікавай, а таксама матэрыялы, якія тычацца новага прачытання купалаўскіх п'ес на сцэнах беларускіх тэатраў.

Характар экспанатаў раздзела патрабуе цікавай, неардынарнай мастацкай канцэпцыі, якая прадугледжвала б сучаснае візуальнае, вобразна-прасторавае вырашэнне, сцэнаграфічны напрамак і дызайн, дзе зала становіцца сцэнаю, а экспанаты — акцёрамі ва ўмоўнай драматургіі экспазіцыйнай прасторы. Уся зала стылізавана пад тэатр, а наведвальнікі музея стануць гледачамі і ўдзельнікамі тэатральных дзей, яны пройдуць доўгімі, падчас складанымі, але цікавымі і яркімі шляхамі развіцця беларускага прафесійнага тэатра, аматарскіх, самадзейных драматычных калектываў і гурткоў. А шлях гэты больш за стагоддзе. І праз тэматычныя комплексы экспазіцыі раздзела, яе сімвалы, вобразы яшчэ раз прачытаем неўміручую спадчыну Янкі Купалы.

У фондах музея маюцца каштоўныя кіна-, фона-, аўдыязапісы спектакляў паводле п'есы Янкі Купалы «Паўлінка» (1952), сучасныя пастаноўкі п'ес «Паўлінка», «Тутэйшыя», «Яна і я», кінафільм «Раскіданае гняздо». Іх выкарыстанне ў экспазіцыі створыць пэўны эмацыянальны і візуальны настрой у наведвальнікаў музея.

[6] *Васючэнка, П.* Драматычная спадчына Янкі Купалы : вопыт сучаснага прачытання / П. Васючэнка. — Мінск, 1994. — С. 16—17.





## 3 раздзел. «Мінск — сталіца, гордасць наша...» Родны горад паэта (1919—1941)

Раздзел прысвечаны мінскаму перыяду жыцця, творчасці і грамадскай дзейнасці народнага паэта са студзеня 1919 г. да чэрвеня 1941 г.

Галоўная ідэя раздзела — актуалізацыя гісторыі і жыцця горада, яго ўплыў на творчасць і дзейнасць Янкі Купалы ў 20—40 гг. ХХ ст. і драматычны лёс нацыянальнага генія ў вызначаны час.

Менавіта з Мінска шляхі паэта ішлі па роднай зямлі і за яе межамі. Шляхі, як імкненне Янкі Купалы ў будучыню, як спасціжэнне жыцця роднай зямлі і свайго народа праз сустрэчы з суайчыннікамі, як філасофскае асэнсаванне жыцця суседніх краін, сяброўаднадумцаў з братніх рэспублік.

Мінск у яго творчасці прысутнічае і як старажытны горад са сваёй гісторыяй, і як горад, які пабачыў у дзяцінстве, і дзе пазней адбываліся палітычныя падзеі 1918—1920 гг., і як індустрыяльны цэнтр Беларусі ў перыяд сацыялістычнага будаўніцтва.

Сустрэчы, жыццё ў «доме пад таполяй» (так называлі ў Мінску дом паэта госці) — усё павінна знайсці месца ў раздзеле, як і драматычныя падзеі, якія чакалі паэта (рэпрэсіі 30-х гг., арышты сяброў, допыты па справе СВБ і інш.). Нягледзячы на гэта, аптымізмам поўняцца радкі яго твораў, прысвечаныя роднаму гораду:

> А сталіца — дзіву дайся! —
> Паўстала з руінаў, —
> Мінск — сталіца, гордасць наша,
> Слава ўсёй краіны…
> *(«Беларусі ардэнаноснай»)*

Творы, дзе ўпамінаецца горад, знакавыя, яны ўвайшлі ў гісторыю беларускай літаратуры. Больш чым 100 рукапісаў твораў і перакладаў Янкі Купалы маюць пазнаку — «Мінск».

Экспазіцыйны вобраз — вобраз тагачаснага горада са старымі пабудовамі і індустрыяльным аблічам 30-х гг. ХХ ст. як кантраст часу і жыцця; выявы горада ў фонавых фотаздымках, рэканструкцыя інтэр'ераў дома паэта. Усё разам — вобразна-сімвалічны экспазіцыйны твор.

*Раздзел падзяляецца на наступныя тэмы:*

3.1. «Янка Купала — народны паэт Беларусі»;
3.2. «"Дом пад таполяй" у Мінску (1927—1941)»;
3.3. «Янка Купала і час сталінскіх рэпрэсій. 1930—1940-я гг. у жыцці і творчасці паэта»;
3.4. «Творы паэта для дзяцей. Вершы з ляўкоўскага цыкла "Хлопчык і лётчык", "Алеся"».

1925 год адзначаны важнай падзеяй у жыцці паэта і краіны. Выйшла Пастанова Савета Народных Камісараў БССР аб прысваенні Янку Купалу звання народнага паэта Беларусі. А ў 1927 г. Янка Купала набыў дом па вул. Кастрычніцкай, які лічыўся ў Мінску своеасаблівым літаратурным салонам, і яго называлі «дом пад таполяй».

За час існавання музея Янкі Купалы сабрана пэўная колькасць рэчаў дарэвалюцыйнага часу і 20—40-х гг. ХХ ст., частка з іх выкарыстана ў створаных інтэр'ерах экспазіцыі



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ў 1976, 1995 і 2005 гг. У новай экспазіцыі плануецца зрабіць больш дакладную рэканструкцыю інтэр'ераў дома паэта, каб дасягнуць большай дакументальнасці. І такім чынам, зрокава і псіхалагічна наблізіць наведвальніка да часу 30—40-х гг. XX ст., да побыту паэта і яго сям'і, паказаць у экспазіцыйным аповедзе не толькі генія, не толькі знанага творцу, але Івана Дамінікавіча — гаспадара дома, простага мінчаніна. Узаемадзеянне паэтычнага тэксту і музейных прадметаў узбагаціць вобраз.

Наступная тэма раскрывае трагедыю краіны і асобы ў 30—40 гг. XX ст. У экспазіцыйнай прасторы будуць прадстаўлены падцэнзурныя творы пісьменніка, творы, прысвечаныя Сталіну, у тым ліку калектыўныя (1930—1941), услаўленне сацыялістычнага ладу жыцця, рэпрэсіі 30-х гадоў.

Мультымедыйныя сродкі дазволяць дэманстраваць кадры кінахронікі таго часу, побач з імі прапануецца агучыць успаміны сучаснікаў паэта, беларускіх пісьменнікаў, архівістаў, даследчыкаў-купалазнаўцаў.

Такім чынам, сучасны наведвальнік пазнаёміцца з гісторыяй нашай краіны, а праз гісторыю народа — з лёсам пэўнай асобы. Суадносіны стылістыкі часу жыцця і творчасці народнага песняра і сучасны падыход да стварэння экспазіцыі, выкарыстанне тэхнічных сродкаў створаць дыялог эпох.

Такія творы паэта для дзяцей, як «Вучыся», «Моладзі», «Сын і маці», «Хлопчык і лётчык», «Алеся», «Сыны», «Наша моладзь» і інш. — услаўленне неадольнай сілы жыцця, абнаўлення і разняволення маладога чалавека.

Прапануецца частку, прысвечаную вершу «Хлопчык і лётчык», зрабіць інтэрактыўнай. Будзе адлюстравана гісторыя стварэння верша і яго ўздзеянне на пакаленне моладзі 30—40-х гг. XX ст. і як вынік — здзяйсненне мары (Ю. Гагарын, 108 хвілін у космасе), дасягненні Беларусі ў авіяцыі і касманаўтыцы (лётчыкі-касманаўты П. Клімук і У. Кавалёнак).

Інтэрактыўная зона для дзяцей малодшага і сярэдняга ўзросту прадугледжвае выкарыстанне лётнай атрыбутыкі 30-х гг. XX ст., паралельны расказ пра гісторыю авіяцыі ў XX і XXI стст. (часткова мультымедыйнымі сродкамі). Плануецца выкарыстанне сучаснай камп'ютарнай тэхнікі, дэманстрацыя на экране фільма ў фармаце 3D.

## 4 раздзел. «Паўстаў народ мой беларускі гераічны...» Паэт і вайна

У новай экспазіцыі народ, чалавек, асоба ў драматычных абставінах вайны будуць паказаны праз творчасць Янкі Купалы і на фоне падзей Вялікай Айчыннай вайны.

Матыў шляхоў пройдзе і ў 4-м раздзеле: шляхі паэта ваеннага часу, перакрыжаванні лёсаў, жыцця і смерці.

*Тэмы раздзела:*

4.1. «Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны»;
4.2. «Шляхамі вайны»;
4.3. «Таямніца смерці паэта».

Плануецца стварыць цэласны візуальны вобраз раздзела: вайна — асоба — творчасць. Ён даволі складаны і вымагае стрыманага колеру і кантрасных акцэнтаў, нестандартных канструкцый экспазіцыйнага абсталявання для паказу пэўных экспанатаў, каб падкрэсліць трагедыю часу, дынаміку падзей.





Сэнсавы стрыжань тэмы — усведамленне Купалам драматызму часу, туга па Радзіме, якая гучыць у вершах і артыкулах, ва ўспамінах сучаснікаў, яго жонкі, іншых сведкаў. Менавіта рукапісамі і надрукаванымі вершамі, артыкуламі, успамінамі, а таксама прадметамі эпохі — меморыямі, рэчамі-знакамі падзей (гільзамі, патронамі, асколкамі снарадаў, рэчамі, якія належалі паэту, лістоўкамі і адозвамі і інш.) атрымліваецца візуалізацыя тэмы і ствараецца экспазіцыйны вобраз. Ён будзе ўздзейнічаць на пачуцці наведвальнікаў і ў дадзеным выпадку стане выхаваўчым матывам любві да Радзімы не ў дэкларатыўным сэнсе, а моцным эмацыянальным узрушэннем.

На шляху Івана Дамінікавіча з Беларусі ў эвакуацыю былі яго прыгожыя любімыя Ляўкі, а потым Масква і Чарнарэцкае лясніцтва з даўнімі знаёмымі — сям'ёй Шыманскіх, Якубам Коласам і яго родзічамі ў Клязьме.

Шлях у эвакуацыю ішоў праз Чувашскую АССР, дзе ў Чэбаксарах Янка Купала з Уладзіславай Францаўнай пражылі амаль два тыдні і дзе адбываліся сустрэчы з мясцовымі пісьменнікамі. Наперадзе — Казань і сціплы пасёлак на другім беразе Волгі — Пячышчы, дзе сям'я дырэктара млынзавода І. Я. Наякшына дала прытулак паэту. Да чэрвеня 1942 г. Іван Дамінікавіч у Пячышчах пісаў вершы, артыкулы, перапісваўся з сябрамі. У кватэры, дзе жыў паэт, у 1975 г. створаны мемарыяльны музей.

У другой тэме пазначаецца і гэта старонка жыцця народнага песняра — пасёлак Пячышчы Татарскай АССР.

Тут таксама выкарыстоўваюцца рарытэтныя матэрыялы, да якіх адносяцца і ўнікальныя дакументальныя фотаздымкі пакояў кватэры паэта, яго рабочага стала, дзе былі напісаны ўсе матэрыялы пячышчанскага перыяду, і артэфакты гэтага часу: скрынка з тытунем, драўляны падсвечнік, коўдра з аўтамашыны, карабок запалак і інш. адлюструюць настрой, абставіны жыцця Івана Дамінікавіча. Хочацца, каб наведвальнік адчуў, што далёка ад Радзімы, у нялёгкім душэўным стане паэт стварае такія вершы, як «Хлопчык і лётчык на вайне», «Зноў будзем шчасце мець і волю» («Лютуе Гітлер»), «На Гітлеразвера», «Дзевяць асінавых колляў», рукапісы якіх захоўваюцца ў музеі.

У творчасці Янкі Купалы гэтага часу асаблівую значнасць мелі вершы «Беларускім партызанам», «Беларускія сыны», публіцыстыка 1941—1942 гг., яе антыфашысцкае, патрыятычнае гучанне.

У экспазіцыйным даследаванні ёсць магчымасць праілюстраваць выказванні даследчыкаў розных пакаленняў, меркаванні аб вершы «Беларускім партызанам». Напрыклад, вядомы пісьменнік-купалазнаўца У. Гніламёдаў сведчыць: «Паводле сваёй паэтыкі ён нагадваў лепшыя ўзоры паэзіі Я. Купалы дакастрычніцкай пары… У вершах Я. Купалы 1941—1942 гг. нібы абудзілася яго маладая сіла, здольнасць увабраць у сваім «я» агульную, усенародную волю і выказаць гэта так, каб пачулі ўсе»[7].

На мове экспанатаў (аўтографы твораў пісьменніка, іх публікацыі ў розных газетах, водгукі ў друку на творчасць паэта франтавікоў, партызан, фотаздымкі ваенных падзей, рэчы часу і інш.) ёсць магчымасць расказаць пра асабістыя адносіны Янкі Купалы да вайны, пра яго ўсведамленне ролі беларускіх сыноў у розных войнах, якія праходзілі па роднай зямлі.

У чэрвені 1942 г., напярэдадні 60-годдзя з дня нараджэння, паэт быў запрошаны ў Маскву, дзе правёў апошнія дзесяць дзён свайго зямнога жыцця. Таямніца яго смерці, а больш дакладна трагічнай гібелі ў гасцініцы «Масква», не раскрыта па сённяшні дзень.

[7] *Гніламёдаў, У.* Янка Купала. Новы погляд / У. Гніламёдаў. — Мінск, 1995. — С. 163.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У новай экспазіцыі будуць прадстаўлены версіі яго смерці ў дакументах, успамінах, друку, рэчавых помніках.

У канцы XX — пачатку XXI стст. тэма смерці Янкі Купалы перастала замоўчвацца. Пра яе пачалі згадваць ва ўспамінах сучаснікі паэта, даследаваць архівісты і вучоныя-купалазнаўцы, выказваючы свае меркаванні на старонках друку. Эпізод яго гібелі з'явіўся ў спектаклі «Сны аб Беларусі», пастаўленым на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы да 125-годдзя з дня нараджэння паэта. Эмацыянальныя, філасофскія вершы аб трагічным лёсе паэта і народа стваралі беларускія паэты.

У. Гніламёдаў у сваім даследаванні[8] нагадвае пра гібель Купалы: «Апошні акт жыццёвай драмы вялікага беларускага нацыянальнага паэта да гэтага часу пакрыты таямніцай. Ёсць небяздоказныя меркаванні, што Купала памёр не сваёй смерцю, што яго ж такі наздагнала няўмольная сталінская "ласка" і сістэма жорстка расправілася з варожым ёй "элементам"».

У экспазіцыйную прастору ўводзіцца асобная зона, насычаная аўтэнтычнымі музейнымі прадметамі — рэканструкцыя часткі інтэр'ера гасцініцы «Масква»: дзверы пакоя № 414, дзе жыў Янка Купала, рама акна з пакоя, вентыляцыйная рашотка, міжпакаёвыя дзверы з люстэркам, шыльда і бра з 4-га паверха, частка паркету і інш.

Сучасныя тэхнічныя сродкі дапамогуць уявіць інтэр'ер тагачаснай гасцініцы, жудасны лесвічны пралёт, вуліцы Масквы 1941—1942 гг. і разбураныя гарады Беларусі, яе краявіды, да якіх у сваіх творах, думках звяртаўся народны пясняр і, напэўна, уяўляў у апошнія хвіліны жыцця. Тут магчыма выкарыстаць і фотаздымкі пісьменнікаў — сучаснікаў Купалы, якія бачылі яго ў апошнія дні жыцця, удзельнічалі ў яго пахаванні, іх успаміны і першыя прысвячэнні памяці паэта.

## 5 раздзел. «Зерне кінутае ў ніву ўсходзіць ды красуе...» Ушанаванне памяці народнага песняра (1942—2012)

Час, як крыніца, ідзе, не марудзе…
Кіне стары дзень жыццём кіраваць,
Новы дзень прыйдзе, і новыя людзі
Будуць пачатую думку снаваць…
*(«Песня мая»)*

Раздзел падзяляецца на пяць тэм, першая — прысвечана гісторыі музея і яго стваральніцы, жонцы Купалы У. Ф. Луцэвіч. Наступныя тэмы распавядаюць пра ўшанаванне памяці Янкі Купалы, выданне яго твораў у 2-й палове XX ст. і 1-м дзесяцігоддзі XXI ст., філасофскае асэнсаванне яго творчасці праз літаратуразнаўчыя даследаванні, тэматыку канферэнцый — Купалаўскіх чытанняў, адлюстраванне вобраза паэта і яго твораў у выяўленчым і музычным мастацтве.

*Тэмы раздзела:*

5.1. «Гісторыя стварэння музея Янкі Купалы (1942—1960)»;
5.2. «Янка Купала — наш сучаснік»;
5.3. «Мастацкая Купаліяна»;
5.4. «Музычная Купаліяна»;
5.5. «Сучаснае жыццё музея ў 2-й палове XX і 1-м дзесяцігоддзі XXI ст.».

[8] *Гніламёдаў, У.* Янка Купала. Новы погляд / У. Гніламёдаў. — Мінск, 1995. — С. 163—164.





Гісторыя стварэння аднаго са старэйшых літаратурных музеяў рэспублікі — музея Янкі Купалы — гэта гісторыя нацыянальнай музейнай справы ў складаны час пасля вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Збор матэрыялаў, пачатак фарміравання музейных калекцый, стварэнне першых экспазіцый — ілюстрацыя развіцця музея і работы яго кіраўніка У. Ф. Луцэвіч у кантэксце пэўнага часу.

Мяркуецца стварыць «Музей у музеі», прысвечаны У. Ф. Луцэвіч — жонцы Янкі Купалы, заснавальніку і першаму дырэктару музея, асобе ў беларускай культуры. Пажадана адлюстраваць гісторыю стварэння музея ў экспанатах і дакументах (часткова ў мультымедыйным паказе) і ажыццявіць рэканструкцыю часткі інтэр'ера кабінета першага дырэктара музея У. Ф. Луцэвіч.

Шырока ў новай экспазіцыі будуць прадстаўлены матэрыялы, якія тычацца стану і развіцця купалазнаўства ў XX і XXI стст.

Купалазнаўства — галіна беларускай літаратурнай навукі, якая займаецца вывучэннем жыцця і творчасці Янкі Купалы, дапамагае адчуць ступень разумення і асэнсавання ролі і месца народнага песняра ў беларускай і сусветнай літаратуры, яго ўклад у розныя галіны нацыянальнага мастацтва і культуры.

Жыццё і творчасць Янкі Купалы ўзбагацілі ўсе жанры беларускай літаратуры, многія галіны грамадскіх навук, асабліва літаратуразнаўства, мовазнаўства, філасофію, эстэтыку. На сённяшні дзень здабыткі купалазнаўства — гэта глыбінны пласт: ад публікацыі першай рэцэнзіі У. Самойлы на зборнік Янкі Купалы «Жалейка» ў 1908 г. да падрыхтоўкі і выдання «Поўнага збору твораў народнага песняра» ў 9 тамах (10 кнігах) у 1995—2003 гг. і каталога «Рукапісная спадчына Янкі Купалы» ў 2 тамах у 2009—2010 гг.

Важнае значэнне для развіцця купалазнаўства маюць Міжнародныя Купалаўскія чытанні (навуковыя канферэнцыі), якія праводзіць Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы сумесна з Міжнародным фондам Янкі Купалы. Матэрыялы па дадзенай тэме (зборнікі Міжнародных Купалаўскіх чытанняў, навуковыя распрацоўкі, шматлікія фотаздымкі гасцей-удзельнікаў канферэнцый — вучоных, даследчыкаў жыцця і творчасці Янкі Купалы, купалазнаўцаў з блізкага і далёкага замежжа, у тым ліку і прадстаўнікоў беларускай эміграцыі ў ЗША, Вялікабрытаніі, Польшчы) могуць быць прадстаўлены і ў якасці арыгінальных экспанатаў, і праз мультымедыйны паказ.

Асобнай старонкай гэтага раздзела ў экспазіцыі музея будзе пададзена рэтраспекцыя выданняў твораў Янкі Купалы на беларускай і замежных мовах. Будуць экспанавацца розныя выданні вершаў, паэм, драматычных і публіцыстычных твораў, юбілейныя, памятныя, сувенірныя выданні ў афармленні беларускіх мастакоў, якія можна падзяліць на два экспазіцыйныя комплексы:

1. Пасмяротныя выданні твораў Янкі Купалы, у тым ліку, калекцыя мініяцюрных выданняў;
2. Кнігі з творамі Янкі Купалы, выдадзеныя ў XX — XXI стст., перш за ўсё, — рарытэтныя выданні.

Творчасць Янкі Купалы злучае ўсе краіны і кантыненты. Асабліва яго імя шануецца ва ўсіх славянскіх краінах. Больш за ўсё перакладаліся творы Янкі Купалы на рускую і ўкраінскую мовы. У фондах музея маецца значная колькасць яго твораў у перакладзе на гэтыя мовы, у тым ліку і прыжыццёвыя выданні з аўтографамі. Асобныя зборнікі яго паэзіі былі выдадзены на балгарскай, сербскай, славенскай і іншых паўднёваславянскіх



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мовах. Творы песняра перакладаліся, выходзілі асобнымі зборнікамі, уключаліся ў анталогіі беларускай паэзіі ў Польшчы, Францыі, Англіі. Зборнік «Жалейка» і паэма «Бандароўна» перакладзены на кітайскую мову. 9 вершаў Янкі Купалы перакладзены на мову хіндзі. Кнігі вершаў і паэм, выбранныя творы перакладзены на італьянскую, іспанскую, латышскую, літоўскую, эстонскую, армянскую, таджыкскую, казахскую, грузінскую, малдаўскую, татарскую і іншыя мовы. На многіх выданнях на замежных мовах маюцца аўтографы перакладчыкаў і выдаўцоў.

Прапануецца паказ матэрыялаў у мультымедыйным варыянце і ў экспазіцыйным абсталяванні (накшталт кніжнай шафы).

*Акцэнтамі стануць выданні:*

- Янка Купала «А хто там ідзе» (пераклад на 82-е мовы свету), 1983 г.;
- Янка Купала «Санеты» (на 8 моў), 2002 г.;
- «Зніч любові» (пераклад вершаў Янкі Купалы на польскую мову У. Мархеля), 2002 г.;
- «Like water, Like fire» (пераклад на англійскую мову В. Рыч), 1982 г.;
- «Папараць-кветка» (на іспанскую мову), 1982 г.;
- паэма Янкі Купалы «Яна і я» (на польскую мову), 1982 г.;
- І. Навуменка «Беларускія паэты — Я. Купала, Я. Колас» (на французскую мову), 1982 г.;
- «Жалейка» (на кітайскую мову), 1982 г.;
- п’еса «Тутэйшыя» (на французскую мову), 2007 г.

Новая экспазіцыя музея ўпершыню прапаноўвае разгляд пытання аб развіцці купалазнаўства ў замежжы, у тым ліку і сярод беларускай эміграцыі.

Уключэнне такой падтэмы ў новую экспазіцыю грунтуецца на меркаванні даследчыка У. Сакалоўскага: «…прысутнасць беларускай эміграцыі спрычынілася ў значнай ступені для рэальнага ўспрыняцця нацыянальных і агульначалавечых матываў у творчасці Янкі Купалы, што паўплывала на інтэрпрэтацыю яго творчасці ў заходніх даследаваннях, энцыклапедычных выданнях і на ўсю заходнюю славістыку»[9].

Матэрыялы па дадзенай падтэме (друкаваныя выданні — кнігі, часопісы, газеты, навуковыя распрацоўкі, асобныя манаграфіі, успаміны) могуць быць выкарыстаны як у самой экспазіцыі, так і праз мультымедыйныя прэзентацыі. Упершыню ў экспазіцыі музея будуць экспанавацца рукапісы твораў Янкі Купалы, перададзеныя ў музей з Беларускага інстытута навукі і мастацтва (г. Нью-Ёрк) і Беларускай бібліятэкі і музея імя Ф. Скарыны (г. Лондан).

«Мастацкая Купаліяна» шматпланавая, рознабаковая і налічвае больш за 1000 адзінак асноўнага фонду, якія складаюць панараму нацыянальнага мастацтва розных пакаленняў і розных напрамкаў. Работы вядомых беларускіх мастакоў, майстроў дэкаратыўна-прыкладнога і народнага мастацтва набліжаюць да нас асобу паэта, адлюстроўваюць сюжэты яго твораў, знаёмяць з іх героямі. Дамінанта тэмы — прыжыццёвыя партрэты Янкі Купалы. Таксама будуць прадстаўлены прадметы калекцыі «Фалерыстыка» і «Нумізматыка», якія налічваюць звыш за 250 адзінак з іканаграфіяй Янкі Купалы.

9 *Сакалоўскі, У.* Прысутнасць творчасці Янкі Купалы ў нямецкамоўным свеце / У. Сакалоўскі // Мастацкі свет Янкі Купалы : класічна-анталагічнае і непаўторна-індывідуальнае : VIII Міжнародныя Купалаўскія чытанні (г. Мінск, 26—27 чэрвеня 2007 г.). — Мінск, 2009. — С. 130.





Творчасць Янкі Купалы пастаянна прыцягвае ўвагу кампазітараў, музыкантаў, выканаўцаў, якія інтэрпрэтуюць творы песняра ў розных музычных формах і жанрах. На словы паэта напісана больш за 200 музычных твораў, сярод якіх песні, рамансы, кантаты, араторыі, сімфоніі і інш.

Будуць выкарыстаны ноты, тэксты, партытуры, зборнікі музычных твораў, кампакт-дыскі, грампласцінкі, аудыя- і відэакасеты, афішы, праграмы, эскізы сцэнічных касцюмаў ансамбля «Песняры», шматлікія фотаздымкі і інш. Адным з цікавых экспанатаў стане прыз з горнага крышталю спеваку Віктару Вуячычу за выкананне песні «Спадчына» (на верш Янкі Купалы) на Міжнародным фестывалі ў Японіі (1973). Пажадана выкарыстанне аўдыясістэм для індывідуальнага праслухоўвання музычных твораў на словы народнага паэта, а таксама мультымедыйных сродкаў, што дапаможа адаптавацца наведвальнікам у культурнай прасторы музея.

Дадзеная канцэпцыя — вынік першага этапу праектавання новай экспазіцыі Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы. Яе задача — прааналізаваць сітуацыю, вызначыць асноўныя праблемы і акрэсліць у першым набліжэнні контуры будучай экспазіцыі. У адпаведнасці з канцэпцыяй, пашыранай тэматычнай структурай экспазіцыі і тэматыка-экспазіцыйным планам будзе распрацавана архітэктурна-мастацкая канцэпцыя з увасабленнем экспазіцыйных вобразаў і вызначаны падыходы да вырашэння абазначаных праблем. Такі ўзгоднены паэтапны рух у двух плоскасцях — у змястоўнай і архітэктурна-мастацкай — з’яўляецца нормай сучаснай тэхналогіі музейнага праектавання. За гэтым павінны ісці больш канкрэтныя і дэтальныя прапрацоўкі, а за імі — стварэнне экспазіцыі.

## Бібліяграфія


1. *Васючэнка, П.* Драматычная спадчына Янкі Купалы : вопыт сучаснага прачытання / П. Васючэнка. — Мінск : Навука і тэхніка, 1994. — 172 с.
2. *Гніламёдаў, У.* Янка Купала : новы погляд : дапам. для настаўніка / У. Гніламёдаў. — Мінск : Народная асвета, 1995. — 176 с.
3. *Гніламёдаў, У. В.* Янка Купала : жыццё і творчасць / У. В. Гніламёдаў. — Мінск : Беларуская навука, 2002. — 237 с.
4. *Горохова, Е.* В поисках современного лица / Е. Горохова // Мир музея. — 2005. — № 8. — С. 2—7.
5. *Конан, У.* Дантэ і Янка Купала : матывы раю і пекла / У. Конан // Янка Купала і праблемы беларускага самапазнання : V Міжнародныя Купалаўскія чытанні — навук. канф. (г. Мінск, 7—8 снежня 2000 г.) / укл. А. Бурбоўская; рэдкал. : Ж. Дапкюнас, В. Рагойша (рэд.), І. Багдановіч. — Мінск, 2002. — С. 140—155.
6. *Купала, Я.* Жыве Беларусь : вершы, артыкулы / Я. Купала; укл., прадм. і камент. В. Рагойшы. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1993. — 477 с.
7. *Купала, Янка.* Поўны збор твораў : у 9 т. (10 кн.) / Янка Купала. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1995—2003.
8. *Купала* і Колас, вы нас гадавалі : дакументы і матэрыялы : у 2 кн. — Кн. 1: 1909—1939 / Дэпартамент па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, Федэральнае архіўнае агенцтва Расіі, Расійскі дзяржаўны архіў літаратуры і мастацтва; укл. В. Дз. Селяменеў,




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В. У. Скалабан; рэдкал. : М. І. Мушынскі (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. — 317 с.
9. *Научная* концепция развития Хабаровского краевого музея им. Н. И. Гродекова (2010—2019 гг.). — Хабаровск : Хабаровский краевой музей им. Н. И. Гродекова, 2010.
10. *Опыт* музейного проектирования : науч. концепция, сценарий : экспресс-информация // Российская государственная библиотека; НИО Информкультура. — М., 1992. — Вып. 1—2. — 36 с.
11. *Поляков, Т.* Мифология музейного проектирования, или Как делать музей? / Т. Поляков; Академия переподготовки работников искусства, культуры и туризма, Российский институт культурологии. — М. : РИК, 2003. — 454 с.
12. *Пуцявінамі* Янкі Купалы : дакументы і матэрыялы / укл. Г. В. Кісялёва; рэд. В. В. Барысенка, М. І. Мушынскі. — Мінск : Навука і тэхніка, 1981. — 312 с.
13. *Рагойша, В.* Майстэрства Янкі Купалы — санетапісца / В. Рагойша // Янка Купала і еўрапейскі літаратурны працэс : VI Міжнародныя Купалаўскія чытанні — навук. канф. (г. Мінск, 4—5 ліпеня 2002 г.) / укл. А. Бурбоўская; рэдкал. : В. Рагойша (рэд.), І. Багдановіч, Ж. Дапкюнас. — Мінск, 2003. — С. 149—153.
14. *Рязанцева, Л. М.* Секреты успеха проектной деятельности / Л. М. Рязанцева // Справочник руководителя учреждения культуры. — 2009. — № 3. — С. 36—48; № 4. — С. 46—59.
15. *Сакалоўскі, У.* Прысутнасць творчасці Янкі Купалы ў нямецкамоўным свеце / У. Сакалоўскі // Мастацкі свет Янкі Купалы : класічна-анталагічнае і непаўторна-індывідуальнае : VIII Міжнародныя Купалаўскія чытанні — навук. канф. (г. Мінск, 26—27 чэрвеня 2007 г.) / рэдкал. : В. П. Рагойша (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск, 2009. — С. 127—131.
16. *Сачанка, Б.* Сняцца сны аб Беларусі… : літ.-крыт. артыкулы, інтэрв'ю / Б. Сачанка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. — 332 с.
17. *Слука, А.* Нацыянальная ідэя / А. Г. Слука. — Мінск : Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, 2008. — 362 с.
18. *Янка Купала* : энцыкл. даведнік / Беларуская савецкая энцыклапедыя; рэдкал. : І. П. Шамякін (гал. рэд.), Н. С. Гілевіч, М. М. Грынчык [і інш.]. — Мінск : БелСЭ, 1986. — 727 с.
19. *Беларускі* і беларусаведны друк на Захадзе = Belarusian and belarus-related publishing in the West : асоб. выд. : бібліяграфія / скл. Зора і Вітаўт Кіпелі; [рэд. Л. Юрэвіч; уступ. арт. Э. Казінца]. — Нью-Йорк : Беларускі інстытут навукі і мастацтва; М., 2003. — 582, [2] с. — (Bibliographic series; № 6).
20. *Бібліяграфія* беларускага друку на Захадзе = Belarusian Publishing in the West : a bibliography : часопісы, газеты / Беларускі інстытут навукі і мастацтва; апрац. В. Кіпель, З. Кіпель. — Нью-Йорк, [2004?]. — 150 с. — (New York Public Library Slavic, Baltic, and Eurasia resource series).





# Пашыраная тэматычная структура

Галоўная ідэя новай экспазіцыі — паказаць Янку Купалу як генія нацыянальнай літаратуры, паэта-прарока, паэта-філосафа, які сваёй творчасцю выхоўваў свядомасць беларускага народа і арганічна ўпісваўся ў еўрапейскае культурнае асяроддзе.

Тэма «Шляхі» — скразная тэма, якая пройдзе праз усю экспазіцыю. Шляхі як гісторыя сям'і Луцэвічаў і спрадвечнае жыццё тагачаснага беларуса, як асэнсаванне будучым паэтам сваёй гістарычнай місіі, імкненне Янкі Купалы ў будучыню, спасціжэнне жыцця народа і філасофскае разуменне вечных ісцін быцця.

Экспазіцыя ахоплівае перыяд з XVII ст. (першыя звесткі пра род Луцэвічаў) па сённяшні дзень, складаецца з 5-і раздзелаў, яна размешчана ў 8-і залах.

Паэтычныя радкі Янкі Купалы, вызначаныя ў тэматычнай структуры, будуць размеркаваны як вядучыя тэксты ў пэўных раздзелах экспазіцыі.

## Раздзел 1. «Роднай нівы я мільённая часціна...» Вытокі

Галоўная ідэя раздзела — карані і шляхі роду Луцэвічаў, як і ў далейшым сцежкі, дарогі і шляхі самога паэта. Раздзел прадугледжвае наступныя тэмы: «Ад вытокаў радаводных», «Нараджэнне будучага паэта. Ясевы "ўніверсітэты"», «Пачатак літаратурнага шляху (ад "Северо-Западного края" да "Нашай нівы")».

### 1.1. «Ад вытокаў радаводных ( XVII — XIX стст.)».

Радавод Луцэвічаў бярэ пачатак ад Станіслава (XVII ст.), які па вотчыным праве валодаў маёнткам Кукялёўшчына з вёскамі Слабодка і Цярпілаўка з сялянамі ў Мінскім ваяводстве, якія па спадчыне перайшлі ва ўладанне яго сыноў, а потым унукаў.

- Комплекс матэрыялаў прысвечаны гісторыі роду Луцэвічаў, іх зямель, разгляду шляхецкага паходжання, судовым справам, залічэнню Луцэвічаў у «Сямейныя спісы Мінскай мяшчанскай управы»: герб шляхецкага роду «Навіна» (рэканструкцыя), дакументы з архіўнага фонду Мінскай дваранскай дэпутацкай зборні і з архіўнага фонду Мінскай мяшчанскай управы, пашпарт Янкі Купалы, які ён атрымаў у 1907 г. як мешчанін горада Мінска, карціна Ф. Рушчыц «Зямля», жывапіс (копія) і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- Аўтабіяграфічныя матывы ў творчасці Янкі Купалы (п'еса «Раскіданае гняздо» (1913), паэма «За што» (1908), драматычная паэма «На папасе» (1913).

1.2. «Нараджэнне будучага паэта. Ясевы "ўніверсітэты"».

- Комплекс матэрыялаў пра нараджэнне будучага паэта: сям'я бацькоў Янкі — бацька (малюнак Я. Рamanoўскага), маці, сёстры, Янка ў 6-гадовым узросце, сваякі паэта па лініі маці (фатаграфіі), метрычныя запісы з кнігі Радашковіцкага касцёла аб нараджэнні і хрышчэнні Мікалая (1881) і Івана (1882) Луцэвічаў, верш Янкі Купалы «Над калыскай» (1919), макет хаты ў Вязынцы, з аўтабіяграфічных лістоў Янкі Купалы, карціны М. Купавы «Вязынка», Л. Рана «Хата арандатара», графіка.
- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны святу Купалле, у гонар якога паэт узяў псеўданім: сімвалы свята, сонечнага і жыццёвага колазвароту (Папараць-кветка, Сонца і Кола), вершы Янкі Купалы «У Купальскую ноч», «Заклятая кветка», цымбалы, дэкаратыўныя купальскія вянкі, сонца, птушкі і інш., купальскія песні, абрады, карціна Э. Агуновіча «Ясь слухае казкі», графіка.
- Комплекс матэрыялаў пра пераезды і шляхі сям'і Луцэвічаў па беларускай зямлі: фатаграфіі мясцін, дзе Луцэвічы арандавалі зямлю, успаміны сясцёр паэта, з аўтабіяграфічных лістоў Янкі Купалы, яго вершы «Крыжы» (1908), «Зоркі» (1911) — аўтабіяграфічныя матывы ў творчасці песняра, карціны П. Драчова «Пераезды сям'і Луцэвічаў», графіка Л. Рана «Вёска Селішчы», графіка, фотапанарама Мінска канца XIX ст. і інш.
- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны вучобе Яся Луцэвіча — Сенніца, Бяларучы: фатаграфіі мясцін, першай настаўніцы ў Сенніцкай пачатковай школе А. В. Сонцавай, загадчыка Бяларуцкага вучылішча М. Ф. Турчановіча; экспанат-рарытэт — грыфельная дошчачка канца XIX ст., вершы Янкі Купалы «Вучыся» (1907), «У вучылішча» (1906—1912), друкаваныя выданні канца XIX ст., якія чытаў будучы паэт, карціны А. Волкава «Янка вучыць сваіх сясцёр грамаце», «Ясь Луцэвіч і Янка Аўлачымскі ідуць у школу», графіка.
- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны колу чытання Яся Луцэвіча. Друкаваныя выданні рускіх і замежных пісьменнікаў. Партрэты беларускіх пісьменнікаў-дэмакратаў, папярэднікаў будучага паэта і іх творы. Знаёмства з З. Чаховічам, паплечнікам К. Каліноўскага (іх фатаграфіі, газета «Мужыцкая праўда»), скульптура А. Рыбкіна «Янка чытае кнігу».
- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны асяроддзю будучага паэта, прадстаўнікі якога заахвочвалі пісаць на беларускай мове: журналіст У. Самойла, класік беларускай літаратуры, празаік Ядвігін Ш., культурны дзеяч А. Бурбіс (фатаграфіі, іх творы, аўтабіяграфічныя лісты Янкі Купалы, фатаграфія Янкі Купалы з аўтографам У. Самойлу (1908), верш-прысвячэнне У. Самойлу «З песень беззямельнага», верш У. Самойлы «Янку Купалу. У адказ на віншаванні з Новым 1907 годам»).





- Комплекс матэрыялаў пра працу Янкі Купалы на броварах: Сёмкава, Яхімоўшчына, Дольны Сноў (рукапісы і друкаваныя тэксты твораў Янкі Купалы, напісаныя ў гэтых мясцінах, фатаграфіі мясцін). Карціна Я. Рамаnoўскага «Янка Купала чытае свае вершы рабочым на бровары», графіка.

1.3. «Пачатак літаратурнага шляху
(ад "Северо-Западного края" да "Нашай нівы")».

Я не паэта, о крый мяне Божа!
Не рвуся я к славе гэткай німала,
Хоць песеньку-думку і высную можа,
Завуся я толькі — Янка Купала.
*(«Я не паэта»)*

- Комплекс матэрыялаў пра польскамоўную творчасць Янкі Луцэвіча: рукапіс польскамоўнага верша «Кабеце», машынапісны сшытак польскіх вершаў Янкі Купалы з аўтарскімі праўкамі, іх публікацыі ў польскамоўным часопісе «Зярно» (1903), пераклады вершаў на беларускую мову.
- Комплекс матэрыялаў пра першы верш Янкі Купалы на беларускай мове: фатаграфія Янкі Купалы (1904), рукапіс верша «Мая доля» (1904), напісанага лацінкай, першая публікацыя верша ў часопісе «Полымя» (1930).
- Комплекс матэрыялаў пра першае выступленне паэта ў перыядычным друку на беларускай мове: рукапіс верша «Мужык» (1905), мінская газета «Северо-Западный край» з публікацыяй верша, падпісаная псеўданімам «Я. Купала».
- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны ранім паэмам Янкі Купалы: «Зімою» (1906), «Нікому» (1906), «Калека» (1907), «Адплата кахання» (1905—1907), якія напісаны на мясцовым матэрыяле ў час работы на броварах (рукапісы, першыя публікацыі, ілюстрацыі да паэм).

Аўдыявізуальнае афармленне залы: гукі прыроды, мелодыя жалейкі, купальскія песні, песня на верш Янкі Купалы «Як на свет радзіўся Янка…».

Экспазіцыйныя комплексы першага раздзела мяркуецца размясціць у 1-й зале.

## Раздзел 2. «Я буду маліцца і сэрцам, і думамі...» Нараджэнне класіка (1908—1928)

Ты жыў, ты панаваў у краі родным,
Сцярог ад чужака й законы укладаў;
Звон вечавы сход склікаваў народны,
І сход аб шчасці Бацькаўшчыны дбаў.
*(«Свайму народу»)*

Раздзел прысвечаны жыццю і творчасці Янкі Купалы ў Вільні і Пецярбургу, нараджэнню Янкі Купалы як класіка беларускай літаратуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паэтычнае ўвасабленне ідэі духоўнага адзінства з роднай зямлёй, маленне за лепшую долю яскрава выявіліся ў праграмным вершы песняра «Мая малітва» (1906, 1912).

Дыялог Янкі Купалы з небам, з зямлёй, зварот да свайго народа прайшоў праз усё жыццё і творчасць паэта, — і гэта галоўны напрамак раздзела новай экспазіцыі музея.

Малюся я небу, зямлі і прастору,
Магутнаму Богу — Ўсясвету малюся,
Ва ўсякай прыгодзе, ва ўсякую пору
За родны загон Беларусі.

*(«Мая малітва»)*

Прадугледжваецца падзяліць раздзел на тэмы, якія будуць падзелены на падтэмы.

Тэма *«Вольня ў жыцці і творчасці Янкі Купалы»*.

*Падтэмы: «Янка Купала — супрацоўнік у 1908—1909 гг. і рэдактар у 1914—1915 гг. першай беларускай газеты "Наша ніва"»; «Знаёмства Янкі Купалы з будучай жонкай Уладзіславай Станкевіч у Вільні (1908)».*

Тэма *«Шматграннасць паэтычнага генія Янкі Купалы»*.

*Падтэмы: «Янка Купала — першы стваральнік санетаў у беларускай літаратуры»; «"Жалейка" — энцыклапедыя сялянскага жыцця, першы паэтычны зборнік Янкі Купалы (1908)»; «"Гусляр" — другі паэтычны зборнік Янкі Купалы (1910)»; «"Шляхам жыцця" (1913) — трэці паэтычны зборнік Янкі Купалы — выдатная з'ява ў гісторыі беларускай літаратуры XX ст.»; «Асяроддзе беларускага паэта ў Санкт-Пецярбургу (1909—1913)»; «Акопы — творчая калыска паэта (1911—1926)»; «Вершы Янкі Купалы, прысвечаныя роднай мове».*

Тэма «*Янка Купала — пачынальнік сучаснай беларускай драматургіі і тэатра*».

*Падтэмы: «Нараджэнне Купалы як драматурга. Драматычныя паэмы»; «Камедыя "Паўлінка" (1912) — жамчужына беларускага мастацтва»; «"Прымакі" — п'еса-жарт у 1-м акце»; «Драма "Раскіданае гняздо" (1913)»; «Трагікамедыя Янкі Купалы "Тутэйшыя" (1922) — адлюстраванне тагачаснага жыцця беларусаў»; «Новае сцэнічнае жыццё твораў Янкі Купалы ў XXI ст.»; «Купалу прысвячаецца».*

Экспазіцыйныя комплексы па тэме «Вільня ў жыцці і творчасці Янкі Купалы» мяркуецца размясціць у 2-й зале, па тэме «Шматграннасць паэтычнага генія Янкі Купалы» — у 3-й зале, па тэме «Янка Купала — стваральнік беларускай драматургіі і тэатра» — у 4-й зале.

2.1. «Вільня ў жыцці і творчасці Янкі Купалы».

2.1.1. *«Янка Купала — супрацоўнік (1908—1909) і рэдактар-выдавец (1914—1915) першай беларускай газеты "Наша ніва"».*

- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны рабоце Янкі Купалы ў газеце «Наша Ніва» (1908—1909) і асяроддзю паэта: А. Уласаў, браты І. і А. Луцкевічы, В. Ластоўскі, С. Палуян, Ядвігін Ш., творчыя стасункі з будучымі класікамі беларускай літаратуры — М. Багдановічам, Цёткай, Якубам Коласам і інш., іх творы на старонках газеты (1906—1909). Сустрэча ў Вільні з рускімі паэтамі срэбранага веку В. Брусавым і К. Бальмонтам.
- Комплекс матэрыялаў: фатаграфіі, публікацыі ў газеце, выданні, пераклады вершаў Янкі Купалы В. Брусавым на рускую мову, кнігі з аўтографамі; першая публікацыя Янкі Купалы на старонках газеты «Наша Ніва» — верш «Касцу» (1907).
- Комплекс матэрыялаў пра работу Янкі Купалы ў бібліятэцы «Веды» («Знание») Даніловіча: кнігі з пячаткамі бібліятэкі.

Мемарыяльная частка. Рэканструкцыя кутка бібліятэкі: рабочы стол, пісьмовыя прылады, кніжныя паліцы, фатаграфіі і малюнкі з вывамі Вільні пачатку XX ст.

- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны дзейнасці паэта ў якасці рэдактара. Цыкл вершаў Янкі Купалы «Песні вайны», старонкі газеты з белымі плямамі (цэнзура), газета «Наша ніва» (1914—1915). Карціна П. Сергіевіча «Званар», жывапіс.

2.1.2. *«Знаёмства Янкі Купалы з будучай жонкай Уладзіславай Станкевіч у Вільні (1908)».*

Гэй ты, дзяўчына, кветка-лілея,
Вольная птушка сумнай зямліцы!

*(«Гэй ты, дзяўчына, кветка-лілея»)*

- Комплекс матэрыялаў пра сям'ю Станкевічаў: фатаграфіі родных У. Станкевіч, Уладзіславы — у дзяцінстве і юнацтве, дакументы аб яе нараджэнні і рабоце ў дзіцячым прытулку ў Вільні.
- Комплекс матэрыялаў пра сустрэчу з Янкам Купалам у Маскве, вянчанне У. Станкевіч з І. Лучэвічам у касцёле Св. Пятра і Паўла (студзень 1916 г.), вучобу ва ўніверсітэце Шаняўскага: фатаграфіі, выданне ўніверсітэта, дакументы.
- Комплекс матэрыялаў пра стасункі Янкі Купалы з братам У. Станкевіч — Вінцэнтам, пад яго кіраўніцтвам паэт служыў у дарожна-будаўнічым атрадзе (1916—1917): фатаграфіі, панарама мясцін, па якіх праязджаў атрад: Мінск — Полацк — Смаленск, асабістыя рэчы і падарункі Янкі Купалы і Уладзіславы Францаўны Вінцэнту Станкевічу, дакументы.

Мультымедыйны паказ выданняў Янкі Купалы з яго аўтографамі (1910—1914).

Экспазіцыйныя комплексы па тэме «Вільня ў жыцці і творчасці Янкі Купалы» мяркуецца размясціць у 2-й зале.

2.2. «Шматграннасць паэтычнага генія Янкі Купалы».

Галоўная ідэя тэмы — паказаць Янку Купалу як майстра глыбокага паэтычнага дару, рамантызму, грамадзянскага пафасу, творчасць якога ахапіла існаванне чалавека ў шырокай прасторы і часе, ва ўзаемаадносінах са светам і космасам.





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Зямлі і сонцу нізка пакланюся —
Я сын зямлі і сонца вольны сын!
Як з братам, з ветрам шчыра абымуся —
Я — ветру, а мне вецер друг адзін.
<…>
Душы дам волю, заручуся з песняй —
Душа і песня — свет мой, скарбы ўсе мае…
*(«Вечар»)*

2.2.1. *«Янка Купала — першы стваральнік санетаў у беларускай літаратуры».*

І ў даль сягну, дзе толькі можа сягнуць вока
І скрозь туды, дзе вольнай думкаю дастану.
*(«Сярод магіл»)*

- Комплекс матэрыялаў: фатаграфіі, рукапісы, публікацыі ў перыядычным друку і друкаваных выданнях пачатку XX ст., кніга Янкі Купалы «Санеты» перакладзеная на 8 моў (2002).

2.2.2. *«“Жалейка” — энцыклапедыя сялянскага жыцця, першы паэтычны зборнік Янкі Купалы (1908)».*

Фатаграфія Янкі Купалы (1908). Першае выданне зборніка (1908), факсімільнае выданне (1982).

- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны вершу «А хто там ідзе» (першая публікацыя ў зборніку «Жалейка»): рукапіс верша, лістоўка з тэкстам і нотамі верша, музыка Л. Рагоўскага, водгук на верш Янкі Купалы рускага пісьменніка Максіма Горкага, яго пераклад верша на рускую мову і публікацыя ў часопісе «Современный мир», водгукі на верш «А хто там ідзе» на пачатку XX ст. у польскім, чэшскім і інш. друку, фатаграфіі, літаратурна-мастацкае выданне «Янка Купала “А хто там ідзе”» — на 83-х мовах свету (1982), якое выдадзена да 100-годдзя народнага песняра. Карціна Я. Раманоўскага «Ілюстрацыя да верша “А хто там ідзе”», графіка.
- Комплекс матэрыялаў аб забароне зборніка «Жалейка» (1908): дакументы аб забароне; выказванні пра выхад зборніка ў тагачасным друку.

2.2.3. *«“Гусляр” — другі паэтычны зборнік Янкі Купалы (1910)».*

Выхад зборніка — значная падзея для справы Адраджэння.

- Комплекс матэрыялаў: фатаграфія Янкі Купалы (1910), выданне кнігі лацінкай з-за цэнзуры, вершы, якія ўвайшлі ў зборнік, факсімільнае выданне зборніка (2010).

2.2.4. *«“Шляхам жыцця” (1913) — трэці паэтычны зборнік Янкі Купалы — выдатная з’ява ў гісторыі беларускай літаратуры XX ст.».*

Кніга прысвечана пецярбургскаму доктару А. Ярэмічу, на сродкі якога выйшаў адзін з лепшых зборнікаў Купалы.





- Фатаграфіі Янкі Купалы (1913), А. Ярэміча. Выданні зборніка «Шляхам жыцця» ў 1913, 1927, 1935 гадах.
- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны грамадзянскай, філасофскай, пейзажнай, інтымнай лірыцы паэта, еднасці хрысціянства і язычніцтва ў яго паэзіі: рукапісы вершаў і публікацыі.

Млечны Шлях, што нябесны дзядзінец
Засцілае, я б зняў на зямлю
І масціў бы ім новы гасцінец
Цераз родную ніву сваю.

Сонца ўзяўшы агністае ў рукі,
Што гарыць над бязмерам палёў,
Я па Млечным тым Шляху без мукі
Чалавека да шчасця бы вёў.
*(«Песняй толькі»)*

- Комплекс матэрыялаў пра сувязь творчасці Янкі Купалы з традыцыямі класікаў славянскіх літаратур (А. Пушкін, Т. Шаўчэнка, А. Міцкевіч, М. Някрасаў, М. Лермантаў і інш.) і наследаванне традыцый сусветнай і еўрапейскай літаратуры (С. Выспянскі, С. Пшыбышэўскі, В. Шэкспір, І. Гётэ, Ф. Шылер, Г. Гаўптман, Г. Ібсен і інш.): пераклады Янкі Купалы твораў класікаў славянскіх літаратур, іх першыя публікацыі, друкаваныя выданні.
- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны вобразу Маладой Беларусі ў творчасці Янкі Купалы: публікацыя верша «Маладая Беларусь» (1909) у зборніку «Спадчына» (1919), у альманаху «Маладая Беларусь» (СПб., 1912—1913), рукапіс верша «Маладая Беларусь» 1912 г. (верш быў вылучаны ў 1994 г. на тэкст Дзяржаўнага гімна Беларусі), яго першая публікацыя ў зборніку «Шляхам жыцця» (1913).
- Комплекс матэрыялаў пра паэму Янкі Купалы «Курган» (1910) — класічны ўзор нацыянальнай героіка-рамантычнай паэмы, шэдэўр паэта і ўсёй новай беларускай літаратуры, сімвал вечнасці (паэма прысвечана сябру Янкі Купалы С. Палуяну, беларускаму літаратуразнаўцу): фатаграфія С. Палуяна, рукапіс паэмы, асобныя яе выданні, тагачасныя рэцэнзіі і выказванні пра яе, пераклады на іншыя мовы.

Мультымедыйны паказ рукапіснага зборніка Янкі Купалы «Шляхам жыцця» (1913).

2.2.5. *«Асяроддзе беларускага паэта ў Санкт-Пецярбургу (1909—1913)».*

- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны прафесару Б. Эпімах-Шыпілу — значнай асобе ў беларускай культуры, жыцці і творчасці Янкі Купалы, рэдактару трох першых зборнікаў паэта, якія выйшлі ў Пецярбургу.

Фотапанарама Пецярбурга пачатку XX ст. (афармленне тэмы), фатаграфіі Янкі Купалы ў кватэры Б. Эпімаха-Шыпілы, доме, дзе жыў паэт, Б. Эпімаха-Шыпілы, рукапісныя сшыткі прафесара з творамі беларускага паэта.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мемарыяльная частка: рэканструкцыя часткі інтэр’ера пакоя Янкі Купалы ў кватэры Б. Эпімаха-Шыпілы.

- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны стварэнню і дзейнасці выдавецкай суполкі «Загляне сонца і ў наша аконца», у якім выйшлі першыя зборнікі Янкі Купалы. Прафесар Б. Эпімах-Шыпіла быў адзін са стваральнікаў суполкі, прымаў актыўны ўдзел у яе дзейнасці. Матэрыялы: выданні суполкі, успаміны сучаснікаў (тэксты).
- Комплекс матэрыялаў пра Беларускі навукова-літаратурны гурток студэнтаў пры Пецярбургскім універсітэце (збіраліся на кватэры прафесара Б. Эпімаха-Шыпілы): фатаграфія Янкі Купалы з беларускімі студэнтамі (1910), дакументы, выданні гуртка.
- Комплекс матэрыялаў пра вучобу Янкі Купалы на агульнаадукацыйных курсах Чарняева: фатаграфія Янкі Купалы (1911), фатаграфія А. Чарняева — заснавальніка курсаў, фатаграфія будынку, дзе размяшчаліся курсы, расклад заняткаў, спісы выкладчыкаў.
- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны паэту Апалону Карынфскаму, прадстаўніку срэбранага веку рускай паэзіі ХХ ст., перакладчыку твораў Янкі Купалы на рускую мову (16 вершаў): рукапісы перакладаў А. Карынфскага вершаў беларускага паэта, выданні кніг А. Карынфскага, фатаграфіі і асабістыя рэчы рускага паэта.

2.2.6. *«Акопы — творчая калыска паэта (1911—1926)».*

Неба, сонца, месяц, зоры,
Людзі, пушча, ўся зямля,
Ўсё да сэрца штось гавора,
Ўсюды бачу моц жыцця…
*(«Грайце песні»)*

- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны творчасці беларускага паэта ў фальварку Акопы на Лагойшчыне (тут напісана больш за 80 вершаў, 5 паэм і 4 п’есы): краявіды Лагойшчыны, у тым ліку Акопаў (мастацкае афармленне); экспанат-рарытэт — падсвечнік пачатку ХХ ст. з хаты маці паэта ў Акопах.

Рукапісы і выданні паэм, якія напісаў Янка Купала ў Акопах, — рамантычныя паэмы «Бандароўна» (1913), «Магіла льва» (1913), «Яна і я» (1913), «Урывак з паэмы» (1910), «Гарыслава» (1912), рукапісы шматлікіх вершаў.

Ілюстрацыі беларускіх мастакоў да твораў акопскага перыяду. Графіка.

Рэканструкцыя фальварка Акопы М. Купавы, графіка.

2.2.7. *«Вершы Янкі Купалы, прысвечаныя роднай мове».*

Ты зжылося з намі, бацькаўскае слоўца,
Як бы корань з дрэвам, як бы з небам сонца;
Дзеліш з намі вечна ўсё, што з намі ходзе
У благой і добрай мачысе-прыгодзе.
<…>
Як жыло ты з намі — будзеш вечна жыці,
Грамадой мільёнаў з светам гаманіці…
(«Роднае слова»)

- Комплекс матэрыялаў: статут ВКЛ (факсімільнае выданне), сучасныя дакументы аб дзяржаўнасці беларускай мовы, публікацыі вершаў Янкі Купалы «Роднае слова» ў прыжыццёвых выданнях, выказванні класікаў беларускай літаратуры аб значэнні мовы (тэксты).

Аўдыявізуальнае афармленне тэмы «Шматграннасць паэтычнага генія Янкі Купалы»: ўрыўкі з паэм і вершаў народнага песняра ў выкананні беларускіх артыстаў, песні на вершы Янкі Купалы.

Экспазіцыйныя комплексы па тэме мяркуецца размясціць у 3-й зале.

2.3. «Янка Купала — пачынальнік сучаснай беларускай драматургіі і тэатра».

Галоўная ідэя тэмы — роля Янкі Купалы ў станаўленні і развіцці беларускага тэатра, неўміручасць яго драматычных твораў.

2.3.1. *«Нараджэнне Купалы як драматурга. Драматычныя паэмы».*

- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны тэатральнай трупе Ігната Буйніцкага (1907—1913), заснавальніка беларускага прафесійнага тэатра, арганізатара першай беларускай трупы: фатаграфіі, афішы, верш Янкі Купалы, прысвечаны Ігнату Буйніцкаму (тэкст).
- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны драматычным паэмам Янкі Купалы «Адвечная песня» (1908), «Сон на кургане» (1910), «На папасе» (1913): рукапісы, фатаграфіі сучасных пастановак, выданні розных гадоў, ілюстрацыі беларускіх мастакоў (графіка).

2.3.2. *«Камедыя “Паўлінка” (1912) — жамчужына беларускага мастацтва».*

- Комплекс матэрыялаў па гісторыі стварэння п’есы: накід празаічнага твора Янкі Купалы «А вербы шумелі…», рукапіс п’есы, першае выданне, тагачасныя водгукі на п’есу.
- Комплекс матэрыялаў пра прэм’еры п’есы «Паўлінка» ў Вільні, Пецярбургу, Радашковічах (1913): фатаграфіі пастаноўкі ў Пецярбургу, фатаграфіі артыстаў, сцэн са спектакляў, праграмы, афішы, успаміны.
- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны першым выканаўцам ролі Паўлінкі — П. Мядзёлцы (Пецярбург, 1913); Р. Кашэльнікавай (Томск, Мінск, 1943—1961): фатаграфіі, дакументы, афішы, запрашальныя білеты, асабістыя рэчы.

Макеты да пастаноўкі п’есы ў 1943 і 1992 гг., эскізы сцэнічных касцюмаў мастака А. Марыкса 20—40-х гг. ХХ ст., сцэнічныя касцюмы выканаўцаў ролі Паўлінкі з сучаснай пастаноўкі п’есы на сцэне тэатра імя Янкі Купалы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2.3.3. *«“Прымакі” — п’еса-жарт у 1-м акце».*

- Комплекс матэрыялаў: рукапіс п’есы, першая публікацыя ў часопісе «Рунь» (1920), фатаграфіі пастаноўкі 1936 г. і сучасных пастановак, праграмы, афішы, выданні п’есы розных гадоў.

2.3.4. *«Драма “Раскіданае гняздо” (1913)».*

- Комплекс матэрыялаў: выказванне Янкі Купалы пра значэнне для яго драмы, яе аўтабіяграфічнасць, рукапіс, першае выданне (1919), фатаграфіі пастановак п’есы ў розныя гады (Тэатр імя Якуба Коласа (1951), Тэатр імя Янкі Купалы (1972); Рускі тэатр імя Максіма Горкага (1997), самадзейныя і аматарскія калектывы).

Мастацкія творы: эскізы сцэнічных касцюмаў беларускіх мастакоў розных пакаленняў: А. Марыкса (1920-я гг.), Н. Гурло (1990-я гг.), эскізы дэкарацый і макетаў А. Марыкса (1920-я — 1940-я гг.), Б. Герлавана (1972).

2.3.5. *«Трагікамедыя Янкі Купалы “Тутэйшыя” (1922) — адлюстраванне тагачаснага жыцця беларусаў».*

Тэма «Тутэйшых» як рэалій тагачаснага мінскага жыцця пераходзіць часткова ў 5-ю экспазіцыйную залу «Мінскія адрасы Янкі Купалы».

- Комплекс матэрыялаў: першая публікацыя ў часопісе «Полымя» (1924), матэрыялы яе забароны, фатаграфія рэжысёра М. Папова, які ў 1926 г. паставіў п’есу на сцэне БДТ-І, тагачасныя водгукі на твор, сведчанне аўтара п’есы пра «Тутэйшых» на допыце ў следчага ў 1930 г., сучасныя пастаноўкі п’есы, узнагароджанне рэжысёра М. Пінігіна і выканаўцаў роляў у спектаклі Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь, рэцэнзіі на спектаклі, інтэрвью з выканаўцамі роляў, фатаграфіі сцэн спектакля.

*Неабходна стварэнне ўмоўнай тэатральнай сцэны для размяшчэння сцэнічных касцюмаў і правядзення камерных мерапрыемстваў.*

Выкарыстанне мультымедыйных сродкаў для паказу сцэнічнага ўвасаблення п’ес Янкі Купалы на розных тэатральных пляцоўках у Беларусі і па-за яе межамі.

2.3.6. *«Новае сцэнічнае жыццё твораў Янкі Купалы ў XXI ст.».*

- Комплекс матэрыялаў: фатаграфіі сучасных пастановак, праграмы, афішы, буклеты.

2.3.7. *«Купалу прысвячаецца».*

- Комплекс матэрыялаў, фатаграфіі, праграмы, афішы тэатральных пастановак, прысвечаных жыццю і творчасці Янкі Купалы.

Экспазіцыйныя комплексы па тэме «Янка Купала — стваральнік беларускай драматургіі і тэатра (1908—1941)» маркуецца размясціць у 4-й зале.





## Раздзел 3. «“Мінск — сталіца, гордасць наша...” Родны горад паэта (1919—1941)»

А сталіца — дзіву дайся! —
Паўстала з руінаў, —
Мінск — сталіца, гордасць наша,
Слава ўсёй краіны...
*(«Беларусі ардэнаноснай»)*

Раздзел прысвечаны мінскаму перыяду жыцця, творчасці і грамадскай дзейнасці народнага паэта са студзеня 1919 да чэрвеня 1941 г., асэнсаванню Янкам Купалам ідэі незалежнасці роднай краіны, яго сустрэчам і паездкам па Беларусі і за яе межы.

Галоўная ідэя раздзела — актуалізацыя гісторыі і жыцця горада, на гэтым фоне паказ жыцця пісьменніка і яго асяроддзя ў 20—40-я гг. ХХ ст.

Прадугледжваецца падзяліць раздзел на тэмы, якія будуць падзелены на падтэмы.

Тэма *«Янка Купала — народны паэт Беларусі».*

*Падтэмы: «Пераезд паэта са Смаленска ў Мінск (1919)»; «Стварэнне БССР. Паэтычная канцэпцыя Янкі Купалы незалежнасці Беларусі. Публіцыстыка. 1919—1920»; «Мінскія адрасы паэта (1919—1926)».*

Тэма *«“Дом пад таполяй” у Мінску (1927—1941)».*

*Падтэмы: «Творчыя сустрэчы Янкі Купалы»; «Грамадская дзейнасць народнага паэта».*

Тэма *«Янка Купала і час сталінскіх рэпрэсій. 1930—1940-я гг. у жыцці і творчасці народнага паэта».*

*Падтэмы: «Справа міфічнай арганізацыі “Саюз вызвалення Беларусі” (СВБ) у дачыненні да беларускай інтэлігенцыі»; «Узнагароджанне Янкі Купалы ордэнам Леніна».*

Тэма *«Творы паэта для дзяцей. Вершы з ляўкоўскага цыкла — “Хлопчык і лётчык”, “Алеся”».*

*У тэме прадугледжана інтэрактыўная зона для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту.*

### 3.1. «Янка Купала — народны паэт Беларусі».

- Комплекс матэрыялаў: фатаграфія Янкі Купалы 1925 г., Пастанова Савета Народных Камісараў БССР аб прысваенні Янку Купалу звання народнага паэта Беларусі, рукапіс верша Янкі Купалы «Шляхам гадоў», дакументы і матэрыялы з перыядычнага друку (віншаванні) і інш.

3.1.1. *«Пераезд паэта са Смаленска ў Мінск (1919)».*

- Комплекс матэрыялаў пра смаленскі перыяд жыцця і творчасці паэта: работа паэта ў Смаленску, сяброўства з братамі Гарэцкімі, пачатак работы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

над перакладам «Слова аб палку Ігаравым» (1918), запрашэнне на працу ў Мінск (фатаграфіі, дакументы, выданні, успаміны).

Карціна А. Кашкурэвіча «Янка Купала ў Смаленску», графіка.

3.1.2. *«Стварэнне БССР. Паэтычная канцэпцыя дзяржаўнай незалежнасці Беларусі. Публіцыстыка (1919—1920)».*

- Комплекс матэрыялаў: верш Янкі Купалы «Паўстань» (1919) — паэтычная канцэпцыя незалежнасці Беларусі (рукапіс, публікацыя ў газеце «Звон»); публіцыстычныя артыкулы (рукапісы, машынапіс, публікацыі ў газеце «Беларусь», часопісе «Рунь»); дакументы пра службу паэта ў «Вестках», бібліятэкарам у «Беларускай хатцы», матэрыялы пра выхад зборніка «Спадчына» (1922).

Манументальны роспіс Л. Асецкага «Кастрычніцкія дні на Беларусі».

3.1.3. *«Мінскія адрасы паэта (1919—1926)»*

- Комплекс матэрыялаў пра Мінск 1920-х гг.: фатаграфіі вуліц Юр’еўскай, Кашаровай, Захар’еўскай, Правіянцкай, дзе з 1919 па 1926 г. жыў паэт з сям’ёй, сустракаўся з паплечнікамі, мінчанамі і інш., адлюстраванне жыцця горада ў гэты час на старонках тагачаснага друку і ў п’есе «Тутэйшыя» (выданне п’есы, паштоўкі з выявамі Мінска, фатаграфіі 1920-х гг. вуліц, плошчаў, рынкаў Мінска).

Прыжыццёвыя партрэты Янкі Купалы Д. Полазава (1921), жывапіс Я. Кругера (1923).

3.2. «“Дом пад таполяй” у Мінску (1927—1941)».

Янка Купала набыў дом па вул. Кастрычніцкай (Храшчэнскай, Садова-Узбярэжнай — назва вуліцы мянялася) разам са сваёй сястрой Л. Раманоўскай. Дом лічыўся ў Мінску своеасаблівым літаратурным салонам, яго называлі «дом пад таполяй» (ля ўваходу сядзібы паэта расла старая таполя, яна была як альтанка, пра што захавалася шмат успамінаў сучаснікаў паэта).

- Комплекс матэрыялаў: дакументы куплі-продажу дома, яго фатаграфія, фатаграфіі беларускіх і ўкраінскіх пісьменнікаў каля Купалавага дома і інш.; макет дома па вул. Кастрычніцкай.

Мемарыяльная частка. Рэканструкцыя гасцёўні Янкі Купалы ў доме па вул. Кастрычніцкай (мяркуецца размясціць у 7-й зале — унесці некаторыя дапаўненні: адзенне паэта і яго асабістыя рэчы перанесці з 8-й залы ў гасцёўню).

Мемарыяльная частка. Рэканструкцыя рабочага кабінета Янкі Купалы ў доме па вул. Кастрычніцкай (мяркуецца размясціць у 8-й зале).

3.2.1. *«Творчыя сустрэчы Янкі Купалы».*

- Комплекс матэрыялаў пра асяроддзе паэта, літаратурныя аб’яднанні 20-х — пачатку 30-х гг. XX ст.: «Маладняк», «Узвышша», «Полымя»; святкаванні юбілеяў Янкі Купалы, яго сустрэчы з маладымі паэтамі, паплечнікамі, пісьменнікамі з братніх краін (матэрыялы тагачаснага друку, фатаграфіі, віншаванні, перапіска, выданні твораў Янкі Купалы, беларускіх пісьменнікаў, аўтографы паэта на кнігах маладым пісьменнікам і інш.), творчасць гэтага часу, апошні прыезд у Акопы, дзе напісаны верш «Ёсць жа яшчэ ў мяне сілы …» (1926), паездкі пісьменніка па Беларусі і за яе межы, сустрэчы з калгаснікамі, рабочымі, моладдзю, як вынік — паэма Янкі Купалы «Над ракою Арэсай» і інш. (фатаграфіі, тагачасны друк).

Шляхі нам далёка, адкрыта
Ляглі ва ўсе свету староны…
*(«Шляхі»)*

3.2.2. *«Грамадская дзейнасць народнага паэта».*

- Комплекс матэрыялаў пра ўдзел паэта ў стварэнні Інбелкульта, БДУ, іншых навучальных і грамадскіх устаноў (1921—1925): дакументы, фатаграфіі, выданні, у тым ліку і альманах Інбелкульта «Адраджэнне».
- Комплекс матэрыялаў пра абранне Янкі Купалы правадзейным членам Акадэміі навук БССР і УССР (1928, 1929), выступленні пісьменніка, яго дзейнасць: фатаграфіі, выданні, дакументы.
- Комплекс матэрыялаў, якія прысвечаны стварэнню Саюза савецкіх пісьменнікаў і пісьменнікаў БССР (1934), правядзенню Пленума Саюза савецкіх пісьменнікаў у Мінску (1936) і ўдзелу ў гэтым пасяджэнні Янкі Купалы: матэрыялы тагачаснага беларускага і саюзнага друку, фатаграфіі, выступленні, дакументы.

Карціна І. Ахрэмчыка «Партрэт Янкі Купалы» (1945), жывапіс.

3.3. «Янка Купала і час сталінскіх рэпрэсій. 1930—1940-я гг. у жыцці і творчасці народнага паэта».

Асобная драматычная старонка жыцця паэта — рэпрэсіі 1930-х гг. Янка Купала маральна зламаны, ён вымушаны ўхваляць уладу, сацыялістычны лад жыцця, Сталіна і яго ўрад.

Трагічная тэма ўвасоблена ў яго творах, якія сам паэт, аб гэтым было напісана ў даносах на яго, называў «дрындушкамі» — «Табе, правадыр», «Нашаму дэпутату», «Мала іх павесіць», «Аб Сталіне-сейбіту», «Дзякую партыі Леніна-Сталіна» і інш.

3.3.1. *«Справа міфічнай арганізацыі “Саюз вызвалення Беларусі” (СВБ) у дачыненні да беларускай інтэлігенцыі».*

- Комплекс матэрыялаў: паказанні Янкі Купалы на допытах у следчага па справе СВБ, ліст паэта да старшыні ЦВК БССР і СССР А. Чарвякова перад спробай самагубства, матэрыялы тагачаснага друку, так званы «пакаянны» ліст Купалы, змешчаны ў газеце «Звязда» (1930), архіўныя матэрыялы: даносы на Янку Купалу і беларускіх пісьменнікаў (1930, 1937), ліст П. Панамарэнкі да Сталіна (1938), тагачасны друк пра працэсы над «ворагамі народа», успаміны сучаснікаў і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3.3.2. *«Узнагароджанне Янкі Купалы ордэнам Леніна».*

- Комплекс матэрыялаў: фатаграфіі, дакументы, ордэн Леніна, вершы Янкі Купалы і калектыўныя творы, прысвечаныя Сталіну, наданне зборніку «Ад сэрца» Сталінскай прэміі I ступені (дыплом, кніга).

3.4. «Творы паэта для дзяцей. Вершы з ляўкоўскага цыкла “Хлопчык і лётчык”, “Алеся”».

- Комплекс матэрыялаў: вершы «Вучыся» (1907), «Моладзі» (1914), «Сын і маці» (1921), «Бай» (1921), «Дзіцячае» (1932), «Сыны» (1935), «Наша моладзь» (1938), сустрэчы паэта з піянерамі, моладдзю ў Ляўках, Мінску, Каўнасе: рукапісы, фатаграфіі, публікацыі ў друку, прыжыццёвыя выданні Янкі Купалы з творамі для дзяцей і сучасныя выданні, ілюстрацыі да вершаў беларускіх мастакоў (графіка).
- Комплекс матэрыялаў, які прысвечаны вершам з ляўкоўскага цыкла «Хлопчык і лётчык», «Алеся», і гісторыі іх напісання ў 1935 г. на дачы ў Ляўках (Аршанскі раён, Віцебская вобласць), іх уздзеянню на моладзь. Верш «Хлопчык і лётчык на вайне»: рукапісы, публікацыі, выданні кніг у 1930-я гг. на беларускай і іншых мовах, тагачасны друк пра аэраклубы, фатаграфіі з друку, аўтограф музею маці першага ў свеце касманаўта Юрыя Гагарына на кнізе «Хлопчык і лётчык. Алеся»; фатаграфіі, аўтографы музею беларускіх касманаўтаў В. Кавалёнка і П. Клімука на выданні вершаў Янкі Купалы, сучасныя выданні вершаў Янкі Купалы для дзяцей.

Ілюстрацыі да вершаў «Хлопчык і лётчык», «Алеся» беларускіх мастакоў А. Волкава, Б. Заборава, А. Лось, У. і М. Басалыгаў, графіка.

Інтэрактыўная зона для дзяцей малодшага і сярэдняга ўзросту — выкарыстанне атрыбутыкі 30-х гг. XX ст., параўнальны аповед пра гісторыю і сучаснасць авіяцыі ў XXI ст. (паказ часткова мультымедыйнымі сродкамі).

Экспазіцыйныя комплексы раздзела «Мінск — сталіца, гордасць наша…» мяркуецца размясціць у 5—6 залах, часткова ў 7-й зале.

## Раздзел 4. «Паўстаў народ мой беларускі гераічны…» Паэт і вайна

Галоўная ідэя раздзела — адлюстраваць уздзеянне вершаў і артыкулаў Янкі Купалы часоў Вялікай Айчыннай вайны на патрыятычныя пачуцці народа, паказаць сам народ, асобу ў драматычных абставінах вайны праз творчасць беларускага песняра. Тэма шляхоў пройдзе і ў гэтым раздзеле — шляхі паэта ваеннага часу, перакрыжаванні лёсаў, жыцця і смерці.

Паўстаў народ мой беларускі гераічны,
Дзяды, унукі, ўнучкі — усе паўсталі…
<…>
Паўстаў народ, як і ў мінулых ён стагоддзях,
За волю, за зямлю, супроць сатрапаў азвярэлых,
Шчаслівых перамог, свабодны мой народзе!
Шчаслівай долі на загонах тваіх родных, спелых!
*(«Паўстаў народ мой беларускі гераічны»)*

Прадугледжваецца падзяліць раздзел на тэмы, якія будуць падзелены на падтэмы.
Тэма *«Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны»*.
Тэма *«Шляхамі вайны»*.

*Падтэмы: «Верш “Беларускім партызанам” (1941) — гімн народных мсціўцаў. Адносіны Янкі Купалы да ваенных падзей праз творы 1914, 1919, 1941—1942 гг.»; «Публіцыстыка ваеннага часу. Праблема аўтарства артыкулаў»; «Жыццё паэта ў Пячышчах (Татарская АССР). Грамадская дзейнасць у час вайны 1941—1942».*

Тэма *«Таямніца смерці паэта»*.

*Падтэмы: «Апошнія дзесяць дзён жыцця Янкі Купалы ў Маскве»; «Трагічная гібель паэта ў гасцініцы “Масква”»; «Пахаванне Янкі Купалы ў Маскве. Ушанаванне яго памяці (1942—1944)».*

4.1. «Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны».

Паездка Янкі Купалы ў Чэхаславакію, прадчуванне паэтам фашысцкай навалы (1935), удзел у I з’ездзе пісьменнікаў Латвійскай ССР (Рыга), паездка ў Каўнас, вяртанне ў Мінск: фатаграфіі, публіцыстычныя артыкулы Янкі Купалы, матэрыялы з тагачаснага перыядычнага друку.

4.2. «Шляхамі вайны».

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Шлях паэта ў эвакуацыю: Ляўкі, Масква, Чэбаксары, Пячышчы, Казань, Масква (1941—1942): фатаграфіі, публіцыстычныя артыкулы, рукапісы вершаў, перапіска Янкі Купалы, успаміны аб гэтым перыядзе розных асоб, асабістыя рэчы Янкі Купалы.

4.2.1. *«Верш “Беларускім партызанам” — гімн народных мсціўцаў. Адносіны Янкі Купалы да ваенных падзей праз творы 1914, 1919, 1941—1942 гг.».*

- Комплекс матэрыялаў пра верш «Беларускім партызанам» (1941) — гімн народных мсціўцаў. Гісторыя напісання і друку, параўнанне з вершам «Беларускія сыны» (1919), адносіны Янкі Купалы да ваенных падзей праз творы 1914, 1919, 1941—1942 гг.: рукапісы, лістоўкі, публікацыі ў тагачасным друку, выданні; артэфакты часу (гільзы, асколкі снарадаў).

4.2.2. *«Публіцыстыка ваеннага часу. Праблема аўтарства артыкулаў».*

- Комплекс матэрыялаў: публікацыі ў газетах 1941—1944 гг., машынапіс артыкулаў з подпісам пісьменніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4.2.3. *«Жыццё паэта ў Пячышчах (Татарская АССР). Грамадская дзейнасць у час вайны (1941—1942)».*

- Комплекс матэрыялаў: фатаграфіі, перапіска, асабістыя рэчы паэта, выступленні Янкі Купалы на радыёмітынгу, на сесіі Акадэміі навук (публікацыі), успаміны сучаснікаў пра сустрэчы з Іванам Дамінікавічам.

4.3. «Таямніца смерці паэта».

Сучасныя тэхнічныя сродкі дапамогуць уявіць інтэр'ер тагачаснай гасцініцы, жудасны лесвічны пралёт, вуліцы г. Масквы 1941—1942 гг., разбураныя гарады Беларусі, яе краявіды, да якіх у творах, думках звяртаўся народны пясняр і, напэўна, уяўляў у апошнія хвіліны жыцця.

4.3.1. *«Апошнія дзесяць дзён жыцця Янкі Купалы ў Маскве».*

- Комплекс матэрыялаў: дакументы, перапіска, фатаграфіі, асабістыя рэчы пісьменніка.

4.3.2. *«Трагічная гібель паэта ў гасцініцы "Масква"».*

- Комплекс матэрыялаў: дакументы, успаміны сучаснікаў.
- Рэканструкцыя часткі інтэр'ера гасцініцы: дзверы пакоя № 414, рама акна з пакоя, вентыляцыйная рашотка, міжпакаёвыя дзверы з люстэркам, шыльда і бра з 4 паверха, частка паркету і інш.

4.3.3. *«Пахаванне Янкі Купалы ў Маскве. Ушанаванне яго памяці».*

- Комплекс матэрыялаў: фатаграфіі, выданне зборнікаў «Памяці Янкі Купалы», першыя прысвячэнні паэтаў-сучаснікаў Янкі Купалы, публікацыі ў тагачасным перыядычным друку, успаміны розных асоб.

## Раздзел 5. «Зерне, кінутае ў ніву, ўсходзіць ды красуе...» Ушанаванне памяці народнага песняра (1942—2012)

Прадугледжваецца падзяліць раздзел на тэмы, якія будуць падзелены на падтэмы.

Тэма *«Гісторыя стварэння музея Янкі Купалы (1942—1960)».*

*Падтэма «У. Ф. Луцэвіч як стваральнік і першы дырэктар музея».*

Тэма *«Янка Купала — наш сучаснік».*

*Падтэмы: «Стан і развіццё купалазнаўства ў XX і XXI стст. (у тым ліку ў замежжы і сярод беларускай эміграцыі)»; «Рэтраспекцыя выданняў твораў Янкі Купалы на беларускай і замежных мовах (1943—2010)»;*

Тэма *«Мастацкая Купаліяна».*

Тэма *«Музычная Купаліяна».*

Тэма *«Сучаснае жыццё музея ў другой палове XX ст. і першым дзесяцігоддзі XXI ст.».*



5.1. «Гісторыя стварэння музея Янкі Купалы (1942—1960)».

Прапануецца стварыць своеасаблівы «музей у музеі».

- Комплекс матэрыялаў: рэчы з дома Янкі Купалы, знойдзеныя на папялішчы «дома пад таполяй» — кубачак і сподачкі, часткі вазы, срэбраная падстаўка пад пісьмовы прыбор; кісет Янкі Купалы са жменяй роднай зямлі і інш., накід М. Гурло «Папялішча дома Янкі Купалы» (1945), графіка.
- Комплекс матэрыялаў: дакументы пра пачатак стварэння музея, пра стварэнне камісіі па ўшанаванню памяці паэта, прызначэнне жонкі паэта сакратаром камісіі (1942—1943), а потым — дырэктарам (1944).

5.1.1. *«У. Ф. Луцэвіч як стваральнік і першы дырэктар музея».*

- Комплекс матэрыялаў пра яе дзейнасць: пошук рукапісаў паэта, выданняў яго твораў, заказ мастацкіх работ, збор успамінаў (дакументы, успаміны, фатаграфіі). Першыя экспанаты. Размяшчэнне музея ў будынку на плошчы Свабоды, вул. Энгельса і, нарэшце, пераезд у спецыяльна пабудаваны будынак для музея амаль на месцы дома паэта па вул. Янкі Купалы, 4 (фатаграфіі, дакументы).

Фатаграфіі першых экспазіцый музея з яго наведвальнікамі, У. Луцэвіч з гасцямі музея (1950—1960) і інш.

Экспазіцыйныя комплексы па тэме «Гісторыя стварэння музея Янкі Купалы (1942—1960)» мяркуецца размясціць у 7-й зале.

5.2. «Янка Купала — наш сучаснік».

> Час, як крыніца, ідзе, не марудзе…
> Кіне стары дзень жыццём кіраваць,
> Новы дзень прыйдзе, і новыя людзі
> Будуць пачатую думку снаваць
>
> *(«Песня мая»)*

5.2.1. *«Стан і развіццё купалазнаўства ў XX і XXI стст. (у тым ліку ў замежжы і беларускай эміграцы)».*

- Комплекс матэрыялаў: здабыткі купалазнаўства — ад першай рэцэнзіі журналіста У. Самойлы на зборнік «Жалейка» (1908) да «Поўнага збору твораў» у 9 тамах (10 кнігах) (1995—2003), каталога «Рукапісная спадчына Янкі Купалы» ў 2-х тамах (2010), зборніка архіўных матэрыялаў «Купала і Колас, вы нас гадавалі» (2010), выданні шматлікіх навуковых даследаванняў, матэрыялаў міжнародных Купалаўскіх чытанняў і інш.

5.2.2. *«Рэтраспекцыя выданняў твораў Янкі Купалы на беларускай і замежных мовах (1943—2010)».*

- Комплекс матэрыялаў: юбілейныя, памятныя, сувенірныя, мініяцюрныя выданні, у тым ліку рарытэтныя, у афармленні беларускіх мастакоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Многія выданні на замежных мовах маюць аўтографы перакладчыкаў і выдаўцоў.

Частку матэрыялаў неабходна размясціць у канструкцыях, якія нагадваюць сучасную кніжную шафу, іншыя паказаць мультымедыйнымі сродкамі.

### 5.3. «Мастацкая Купаліяна».

Калекцыя «Мастацкай купаліяны» музея налічвае больш за 1000 адзінак асноўнага фонду.

Дамінантай экспазіцыі стануць прыжыццёвыя партрэты Янкі Купалы (1921—1941). Таксама будуць прадстаўлены партрэты, жанравыя палотны, ілюстрацыі да твораў Янкі Купалы і па матывах яго творчасці, творы дэкаратыўна-прыкладнога і народнага мастацтва, матэрыялы калекцый «Фалерыстыка», «Нумізматыка», сувенірная прадукцыя музея.

Прапануецца паказ калекцый мультымедыйнымі сродкамі.

### 5.4. «Музычная Купаліяна».

На словы песняра напісана больш за 200 музычных твораў, сярод якіх песні, рамансы, кантаты, араторыі, сімфоніі і інш.

- Комплекс матэрыялаў: ноты з тэкстамі песень на вершы Купалы, партытуры, зборнікі музычных твораў, кампакт-дыскі, грампласцінкі, аўдыя- і відэакасеты, афішы, праграмы, эскізы сцэнічных касцюмаў ансамбля «Песняры» і фатаграфіі іх выступленняў, прыз беларускаму спеваку Віктару Вуячычу за выкананне песні «Спадчына» ў Токіа (Японія) і інш.

Пажадана выкарыстанне мультымедыйных сродкаў і аўдыясістэм для індывідуальнага праслухоўвання музычных твораў на словы Янкі Купалы і прагляду відэа- і фотаматэрыялаў.

Экспазіцыйныя комплексы па тэме «Янка Купала — наш сучаснік» мяркуецца размясціць у 8-й зале.

### 5.5. «Сучаснае жыццё музея ў другой палове XX ст. — першым дзесяцігоддзі XXI ст.».

Паказ дзейнасці музея мультымедыйнымі сродкамі: прэзентацыі выставак, святы паэзіі каля помніка паэту, пачэсныя госці музея, мерапрыемствы, экскурсіі і новыя формы работы для розных катэгорый наведвальнікаў. Філіялы музея: Вязынка, Яхімоўшчына, Акопы, Ляўкі (краявіды, экспазіцыі і інш.).

Прапануецца частку інфармацыі па вышэйазначанай тэматыцы змясціць у інфакіёску вестыбюля музея.





## Тэматыка-экспазіцыйны план*

| № п/п | Тэматычная структура | Экспазіцыйныя тэксты | Пералік матэрыялаў | Характар матэрыялаў | Месцазнаходжанне матэрыялаў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.** | **1. «Роднай нівы я мільённая часціна…» Вытокі** | | | | | |
| 1.1. | **Ад вытокаў радаводных (XVII — XIX стст.)** | Шлях мой не сцелецца сонцам і кветкамі,<br>Гладкай, павабнай не лёг раўнінай, —<br>Паміж няўдалымі ўецца палеткамі,<br>Уецца зімой і вясной. | Герб шляхецкі «Навіна» | рэканструкцыя | ДЛМЯнК НД 1028<br>А. Крукоўскі. «Срэбраная страла ў чырвоным полі». (Мінск. 2011 г.) | |
| | | | Запіс аб ужыванні Луцэвічамі герба «Навіна» | копія | НГАРБ ф. 319, спр.1869 | |
| | | | Свидетельство от Игуменского уездного дворянства Онуфрию Луцевичу | муляж | НГАРБ ф. 319, в. 2, спр. 1862 | |
| | | | Метрыка Д. А. Луцэвіча, бацькі Янкі Купалы | муляж | НГАРБ ф. 319, спр. 1869 | |
| | | | Схема радаводнага дрэва Луцэвічаў. 1868 г. | муляж | ДЛМЯнК НД 2391 | |
| | | | Указ Его Императорского Величества (о лишении Луцевичей надела земли). 1864 г. | муляж | НГАРБ ф. 330, в. 1, спр. 33 | |
| | | | З «Сямейных спісаў Мінскай мяшчанскай управы» за 1883 г. | муляж | ДЛМЯнК НД 2392 | |
| | | | Пашпарт І. Д. Луцэвіча (Янкі Купалы). 1907 г. | муляж | ДЛМЯнК КП 22653 | |
| | | | Рушчыц Ф. Зямля. Жывапіс | копія | ДЛМЯнК КП 7158 | |
| | | | Карта тагачаснай Мінскай губерні з пазначэннем мясцін, дзе арандавалі зямлю Луцэвічы да нараджэння Янкі | муляж | ДЛМЯнК КП 7043 | |

* Па прычыне вялікага аб'ёму тэматыка-экспазіцыйны план падаецца часткова; у выданне ўключаны тэмы і раздзелы, якія вылучаюцца наватарскім падыходам да асэнсавання праблематыкі і яе адметнай прэзентацыі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| № п/п | Тэматычная структура | Экспазіцыйныя тэксты | Пералік матэрыялаў | Характар матэрыялаў | Месцазнаходжанне матэрыялаў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Музейныя прадметы, якія выкарыстаны ў электронным выглядзе ў маніторы 1-й залы па тэме 1.1 «Ад вытокаў радаводных (XVII — XIX стст.)»*** | | | | | | |
| | | | Прывілеі князя Радзівіла на зямлю. 1692 г. | муляж | НГАРБ<br>ф. 319, спр. 1869 | |
| | | | Кніга. Янка Купала. «Раскіданае гняздо». 1919 г. | | арыгінал | |
| | | Чалавек з зямлёй зрастаецца,<br>як дрэва, ссячы дрэўца — засохне,<br>адбяры ў чалавека зямлю — згіне… | Кніга. Янка Купала. «За што?». 1930 г. | | арыгінал | |
| | | | Аўтограф. З аўтабіяграфічнага ліста Янкі Купалы да Л. Клейнбарта. 23.11.1927 г. | копія | ДЛМЯнК<br>КП 8450 | |
| 1.2. | **Нараджэнне будучага паэта. Ясевы «ўніверсітэты»** | Як на свет радзіўся Янка,<br>Як заплакаў многа-мала, —<br>Пела маці над калыскай,<br>А зязюлька кукавала… | Метрычны запіс з кнігі Вілейскага дэканата рымска-каталіцкай прыходскай царквы аб нараджэнні (25.06.1882 г.) і хрышчэнні (12.07.1882 г.) І. Луцэвіча | муляж | ДЛМЯнК<br>НД 7926 | |
| | | | Аўтограф. З аўтабіяграфічнага ліста Янкі Купалы да Л. Клейнбарта. 23.11.1927 г. | муляж | ДЛМЯнК<br>КП 8450 | |
| | | | Метрычны запіс з кнігі Радашковіцкага касцёла аб нараджэнні (04.05.1881 г.) і хрышчэнні (21.05.1881 г.) у сям'і Луцэвічаў сына Мікалая | муляж | НГРБ у Гродне ф. 915, в. 2, а.з. 25 | |
| | | | Фатаграфія. Касцёл у Радашковічах | копія | ДЛМЯнК<br>КП 2080/2 | |
| | | | Фатаграфія. Б. І. Луцэвіч (маці паэта) | копія | ДЛМЯнК<br>НД 9615 | |
| | | | Раманоўскі Я. Партрэт Д. І. Луцэвіча (бацькі паэта). Афорт | арыгінал | ДЛМЯнК<br>КП 22783 | |
| | | | Фатаграфія. Ясь у 6-гадовым узросце. 1888 г. | копія | ДЛМЯнК<br>НД 9609 | |
| | | | Фатаграфія. Г. Д. Луцэвіч (сястра паэта) | копія | ДЛМЯнК<br>НД 9607 | |

* Музейныя прадметы, якія выкарыстаны ў электронным выглядзе, выдзелены ў табліцы шэрым фонам.





| № п/п | Тэматычная структура | Экспазіцыйныя тэксты | Пералік матэрыялаў | Характар матэрыялаў | Месцазнаходжанне матэрыялаў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|---|
